WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

1 ЧЭРВЕНЯ 2010 г.
АЎТОРАК
№ 104
(26712)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Са святам, маладыя грамадзяне Беларусі!

Дарагія юныя сябры!

Сёння кожнага з вас напэўна перапаўняе радасны, вясёлы настрой. Вось нарэшце прыйшло лета і пачынаюцца канікулы, поўныя прыгодаў, дзіўных адкрыццяў і незабыўных сустрэч.

Але 1 чэрвеня знамянальнае не толькі гэтым. Сёння мы адзначаем юбілейны, шасцідзясяты, Міжнародны дзень абароны дзяцей. Нягледзячы на тое, што свята прысвечана дзецям, яго з радасцю сустракаюць людзі розных пакаленняў. Бо ў душы любога дарослага чалавека жыве дзіця, і мы на працягу ўсяго жыцця даражым каштоўнымі ўспамінамі дзяцінства як чыстай крыніцай радасці і натхнення.

Французскі пісьменнік Антуан дэ Сент-Экзюперы аднойчы сказаў: «Я выйшаў з дзяцінства, як з краіны». І няхай Краіна Дзяцінства не пазначаная на карце — кожны з нас стварае яе ў сваім сэрцы. Дык давайце разам працаваць над тым, каб у ёй панавалі толькі законы справядлівасці, праўды і дабрыні.

Мы, дарослыя, і дзяржава ў цэлым стараемся зрабіць усё, каб з самых першых хвілін свайго з'яўлення на свет вы раслі ў атмасферы клопату і любові, каб жыццё маленькіх грамадзян было мірным, спакойным і абароненым ад бед і нягодаў, каб кожнае дзіця магло раскрыць свае таленты і рэалізаваць мары.

Але вельмі шмат залежыць і ад вас самі. Гэта ў казцы ўсе жаданні здзяйсняюцца па ўзмаху чароўнай палачкі. А ў жыцці галоўны чарадзей — праца. Каб казка стала быллю, трэба старанна вучыцца, расці сумленнымі, смелымі, дужымі, паважаць старэйшых і без стомы рабіць добрыя справы. І самае галоўнае: любіць і берагчы нашу цудоўную Беларусь, ганарыцца сваім народам і яго гісторыяй.

Не бойцеся быць першапраходцамі ў любой справе. Не адступайце перад цяжкасцямі. Смела імкніцеся і стварайце, будзьце прыкладам заўсёды і ва ўсім.

Здароўя, шчасця, поспехаў, моцы духу і ўдачы вам, дарагія дзеці.

Са святам, маладыя грамадзяне Беларусі!

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

Працяг тэмы на 3-й стар.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

СА «ЗВЯЗДОЙ» — ПА ЖЫЦЦІ!

ПАЧАЛАСЯ ПАДПІСКА НА III КВАРТАЛ І II ПАЎГОДДЗЕ 2010 г.

Падпіска праз РУП «Белпошта» (кошт у рублях)

Індэкс	*месяц*	*III квартал*	*паўгоддзе*
63850 (індывідуальны)	12400	37200	74400
63145 (інд. для ветэранаў вайны, пенсіянераў)	11600	34800	69600
63858 (ведамасны)	19900	59700	119400
63239 (ведамасны, для ўстаноў міністэрстваў аховы здароўя, адукацыі і культуры)	18000	54000	108000

Заставайцеся з намі!

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

УЛАДЫКА ФІЛАРЭТ ЗАСТАЕЦЦА ДЗЕЮЧЫМ ЭКЗАРХАМ БЕЛАРУСІ

Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт (Вахрамееў), Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі прадоўжыць кіраванне Беларускім экзархатам Рускай праваслаўнай царквы (Беларускай праваслаўнай царквой). Такое рашэнне ўчора было прынята на пасяджэнні Свяшчэннага сінода РПЦ у Маскве на чале з Патрыярхам Маскоўскім і ўсяе Русі Кірылам, паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў Беларускім экзархаце.

Уладыка Філарэт, якому нядаўна споўнілася 75 гадоў, згодна з патрабаваннем статута Рускай праваслаўнай царквы падаў на імя Патрыярха прашэнне аб магчымасці сыходжання на спачынак у сувязі з дасягненнем гэтага ўзросту (як і прадугледжана артыкулам статута). Па правілах РПЦ Патрыярх, параіўшыся з Сінодам, можа або задаволіць прашэнне, або пакінуць архірэя дзеючым.

ФАЛЬШЫВЫЯ ГРОШЫ СА... ЗВАЛКІ

Двое падазроных, якія разлічваліся ў крамах падробнымі купюрамі, заявілі праваахоўнікам, што знайшлі фальшывыя грошы на звалцы бытавых адходаў у Дзяржынскім раёне.

Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў аддзяленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Мінаблвыканкама, напачатку ў міліцыю звярнулася касір Дзяржынскага райпа, якая пры пераразліку грашовай выручкі, што паступіла з крамы ў вёсцы Мігдалавічы, выявіла чатыры несапраўдныя купюры па 20 тысяч рублёў. А крыху пазней у міліцыю звярнулася загадчыца адной з дзяржынскіх крамаў, якая распаўсюдзіла фальшывыя купюры па 20 тысяч рублёў. Падчас расследавання гэтых фактаў аператыўнікі ўстанавілі, што злачынства ўчынілі двое жыхароў Дзяржынска, адзін з якіх раней быў судзімы за крадзеж. У ходзе асабістага вобыску апошняга было знойдзена і канфіскавана 5 падробных купюр вартасцю 20 тысяч рублёў, а па месцы жыхарства ён добраахвотна выдаў яшчэ 24 аналагічныя купюры. У другога затрыманага па месцы жыхарства канфіскавана 146 купюр вартасцю 20 тысяч рублёў і 5 лістоў фармату А4 з адлюстраваннем на кожным пярэднім і адваротным баку 4 купюр вартасцю 10 тысяч рублёў. Між іншым, акрамя вышэйзгаданых разлікаў за тавары фальшыўкамі, выяўлена дадаткова яшчэ 8 фактаў збыту купюр вартасцю 20 тысяч рублёў на аб'ектах рознічнага гандлю і грамадскага харчавання ў Дзяржынску і раёне. Што датычыцца падазроных, то, паводле іх слоў, яны знайшлі купюры на звалцы цвёрдых бытавых адходаў і ведалі, што грошы падробныя. Па гэтай справе вядзецца далейшае следства.

Ігар ГРЫШЫН.

НЕЛЬГА ЗАГАРАЦЬ НА ПАДАКОННІКУ

Звалiўшыся з чацвёртага паверха, загінула 54-гадовая мінчанка, якая загарала на падаконніку. Трагедыя адбылася раніцай 20 мая.

«Мінск-Навіны».

ПРЫЕХАЎ НА ЗАПРАЎКУ, АЛЕ НЕ ПА ПАЛІВА

Больш за сто грамаў асабліва небяспечнага псіхатропнага рэчыва супрацоўнікі дзяржбяспекі не дазволілі рэалізаваць 27-гадоваму жыхару Астраўца, паведамляе прэс-службa УКДБ па Гродзенскай вобласці.

У поле зроку аператыўнікаў гэты малады чалавек, які актыўна адшукваў магчымасці па рэалізацыі буйной партыі псіхатропнага рэчыва, трапіў каля месяца таму. «Амфетамін» і «метамфетамін» быў дастаўлены на тэрыторыю Беларусі з Літвы і ацэнены прадаўцом у S1600. Перспектыва — пазбаўленне волі ад васьмі да трынаццаці гадоў.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Навіны Беларусі і замежжа ў рэжыме on-line на сайце «Звязды» — www.zviazda.by

БУДЗЕ ГАРАЧА І ДАЖДЖЛІВА

На большай частцы тэрыторыі Беларусі чакаюцца кароткачасовыя дажджы і навальніцы, месцамі ліўні, магчымы град. Пры навальніцах шквалістае ўзмацненне ветру да 15—20 метраў за секунду. 2 і 3 чэрвеня дзённая тэмпература будзе дасягаць 22—28 градусаў, ва ўсходніх рэгіёнах месцамі да 30. Толькі на паўднёвым захадзе Брэсцкай і Гродзенскай абласцей дзённая тэмпература не перасягне 18—21. У пятніцу тэмпература будзе вагацца ад 15 градусаў цяпла ў заходніх раёнах да плюс 28 на ўсходзе краіны.

БЕЛТА.

УЗБРОЕНЫ НАПАД НА БАНК У МІНСКУ

СЯРОД белага дня рабаўнік увайшоў у аддзяленне банка «Масква—Мінск» і «паціхаму» яго абчысціў. Бандыта спрабавалі перахапіць па ўсім горадзе... Падрабязнасці ў рэпартажы спецыяльнага карэспандэнта «Звязды» Яўгена ВАЛОШЫНА.

Эксперты-крыміналісты шукаюць «зачэпкі» на месцы здарэння.

Нечаканае для спакойнай Беларусі абрабаванне здарылася ў панядзелак прыкладна а першай гадзіне дня.

У момант, калі артыкул рыхтаваўся да друку, пра гэты дзёрзкі напад на банк не было ніякай інфармацыі. Прэс-служба міліцыі не адказвала на тэлефанаванні. Але горад быў літаральна ачэплены машынамі ДАІ, міліцыянерамі ў форме і супрацоўнікамі органаў у штацкім. «Звяздзе» пра гэта здарэнне паведаміў высокапастаўлены супрацоўнік мінскага банка, папрасіўшы на яго не спасылацца:

— Узброены напад на банк «Масква—Мінск»! — узрушана паведаміў інфарматар. — Чатырнаццаць гадоў працую ў сталіцы, а такога не прыгадаю.

Для спакойнай Беларусі такое дзёрзкае абрабаванне — па-сапраўднаму надзвычайнае здарэнне. Думаў, толькі ў галівудскіх кінастужках такое пабачу. І раптам такое ў спакойным Мінску!

СТАР. 3

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ЗША ПРЫЗНАЛІ РАЗЛІЎ НАФТЫ КАТАСТРОФАЙ

Улады ЗША афіцыйна прызналі разліў нафты ў Мексіканскім заліве самай буйной экалагічнай катастрофай у гісторыі краіны, заявіла памочнік прэзідэнта Барака Абамы па пытаннях энергетыкі і змены клімату Кэрал Браўнер.

Між тым уцечка нафты ў Мексіканскім заліве можа працягвацца да жніўня. У нядзелю дырэктар па вытворчасці і тэхналогіях кампаніі нафтавай кампаніі BP (British Petroleum) Дуг Сатлз заявіў, што аперацыя па заліве цяжкай тэхналагічнай вадкасці ў аварыйную свідравіну BP у Мексіканскім заліве з мэтай прадухілення наступнай уцечкі сыравіны не прывяла да пажаданага выніку. Кампанія прыняла рашэнне рабіць яшчэ адну спробу. Як перадаюць СМІ, па ацэнках урада, штодня ў мора выцякае ад 12 да 19 тысяч барэляў нафты (ад 1,9 да 3 мільёнаў літраў). На ліквідацыю аварыі кампанія BP ужо выдаткавала каля 760 мільёнаў долараў.

ІЗРАІЛЬ РАЗГРАМІЎ «ФЛАТЫЛІЮ МІРУ»

Вайскоўцы Ізраіля атакавалі караван з суднаў міжнароднай «флатыліі міру», якія везлі ў сектар Газа праваабаронцаў і сотні тон гуманітарных грузаў. У выніку абстрэлу і захопу прынамсі 19 чалавек загінула, яшчэ дзясяткі атрымалі раненні.

Паводле звестак тэлеканалаў, ізраільскія вайскоўцы наблізіліся да флатыліі на маторных лодках і верталётах і настойліва парэкамендавалі павярнуць назад. Калі на іх заклікі не адбылося ніякай рэакцыі, яны абстралялі караблі з аўтаматаў. Пасля гэтага ўзброеныя людзі ўзялі на абардаж адно з суднаў. У выніку 19 чалавек загінула, яшчэ каля 50 былі параненыя. «Войска абароны Ізраіля выконвае распараджэнне ўрада аб забароне несанкцыянаванага доступу ў гэтую зону», — паведаміў прадстаўнік ізраільскай вайсковай прэс-службы.

У Турцыі, грамадзяне якой апынуліся сярод загінулых, прайшлі масавыя акцыі пратэсту, а турэцкае МЗС паведаміла пра намер адклікаць свайго пасла з Ізраіля. Гэты напад на «флатылію міру» рэзка асудзілі ўлады краін Еўропы і Блізкага Усходу, і яны выклікалі для падрабязных тлумачэнняў паслоў Ізраіля. Усяго ў склад «флатыліі свабоды» ўваходзіць шэсць суднаў. Караблі везлі ў сектар Газа каля 600 праваабаронцаў і 10 тысяч тон гуманітарных грузаў і будматэрыялаў, каб спыніць эканамічную блакаду анклава. Ізраіль раней забараніў каравану набліжацца да сектара, заявіўшы, што вайскоўцы адканваіруюць судны ў свой порт, а ўдзельнікаў экспедыцыі дэпартуюць на радзіму.

КАРАЛЕВА ПАТРАБУЕ МІЛЬЁНЫ ФУНТАЎ НА ВЫДАТКІ

Каралева Вялікабрытаніі Елізавета II патрабуе з дзяржаўнай казны дадатковых сродкаў для належнага выканання сваіх грамадскіх абавязкаў. На гэтыя мэты каралева запрасіла сем мільёнаў фунтаў стэрлінгаў у дадатак да тых васьмі, якія ўжо выдаткоўвае бюджэт.

Настойваючы на неабходнасці каралеўскага дадатку, прадстаўнік Букінгемскага палаца растлумачыў, што так званы Цывільны ліст — сума, якую вылучае парламент Вялікабрытаніі на ўтрыманне каралеўскага двара, а таксама каралевы Елізаветы II і яе мужа, герцага Эдынбургскага Філіпа, — не мянялася на працягу апошніх 20 гадоў. Сем мільёнаў фунтаў — не такія ўжо і вялікія грошы ў маштабах Вялікабрытаніі, аднак запрос каралевы ўжо выклікаў абурэнне ў шырокай грамадскасці.

ТЭРАРЫСТЫ ПАГРАЖАЮЦЬ ЧЭМПІЯНАТУ СВЕТУ

Паўднёвая Афрыка можа стаць ахвярай тэрарыстычнага нападу падчас чэмпіянату свету па футболе, які пройдзе там гэтым летам, адзначаюць прадстаўнікі спецслужбаў ЗША.

Спецыяльную ўвагу тэрарыстаў можа прыцягнуць матч зборных ЗША і Англіі, які адбудзецца 12 чэрвеня, а таксама сустрэчы з удзелам нацыянальных камандаў Данiі і Галандыі — гэтыя краіны ісламскія экстрэмісты вінавацяць у абразе мусульманскіх святыняў, у першую чаргу за карыкатуры на прарока Мухамеда. Раней міжнародная тэрарыстычная сетка «Аль-Каіда» выступіла з пагрозамі ажыццявіць тэракты падчас чэмпіянату свету па футболе ў Паўднёвай Афрыцы супраць нацыянальных зборных ЗША, Англіі, Францыі, Германіі і Італіі і іх балельшчыкаў.

Твае правы

НАПІСАЎ. І ДАЎ ПАДСТАВУ ДЛЯ СВАЙГО ЗВАЛЬНЕННЯ?

Сяргей ГРЫБ

РАБОТНІКУ, у якога ўзніклі непаразуменні з кіраўніцтвам, настойліва «параілі» звольніцца «па ўласным жаданні». Як рэагаваць на такую прапанову, калі намеру пакідаць сваё месца ўсё ж няма? Зрэшты, варыянт у такой сітуацыі адзін — заяву ні ў якім разе пісаць не трэба. Бо падобная заява для наймальніка стане цалкам законнай падставай для «развітання». І калі яе не будзе, то задача таго ж наймальніка ўскладніцца, яму давядзецца шукаць іншыя важкія прычыны — скажам, спасылацца на прагул падначаленага, на яго недастатковую кваліфікацыю, сістэматычнае невыкананне працоўных абавязкаў і г.д. Прычым, як адзначылі ўдзельнікі чарговай «выязной прыёмнай» Дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны ў Чачэрскім раёне, тут нялішне мець на ўвазе і яшчэ адзін цікавы нюанс: калі работнік пісаць заяву «па ўласным жаданні» не хоча, то неяк прымусіць рабіць гэта ні наймальнік, ні хто-небудзь іншы не можа.

Як «паспрачацца» з атэстацыяй?

Не менш цікавая сітуацыя. Падчас атэстацыі было прынятае рашэнне, што супрацоўнік не адпавядае сваёй пасадзе. Сам работнік з такой высновай катэгарычна не згодны. Што яму рабіць?

— Перш-наперш варта заўважыць, што заключэнне атэстацыйнай камісіі мае рэкамендацыйны характар, і пасля высновы аб неадпаведнасці работніка сваёй пасадзе наймальнік можа прыняць некалькі рашэнняў — даць работніку час «падцягнуцца» і правесці праз пэўны тэрмін пераатэстацыю, прапанаваць перавод на іншую пасаду, якая стасуецца з кваліфікацыяй і вопытам падначаленага, нарэшце, правесці звальненне на падставе 42-га артыкула Працоўнага кодэкса, — распавядае **начальнік управлення прававога забеспячэння і кантролю Дэпартамента дзяржінспекцыі працы Алена КАМІСАРАВА**. — Прычым калі выбіраецца шлях звальнення, то наймальнік павінен выканаць пэўную працэдуру — зрабіць паведамленне прафсаюзу або ўзгадніць свой намер з прафкамам, а таксама выплаціць работніку двухтыднёвую выхадную дапамогу.

Што да работніка, то ў выпадку нязгоды з высновай аб неадпаведнасці пасадзе пункт погляду атэстацыйнай камісіі можна абскардзіць спачатку ў вышэйшым органе ці арганізацыі, а затым — і ў судзе. У такіх варунках лепш за ўсё звярнуцца ў той жа суд на працягу трох месяцаў, прычым зварот туды будзе для работніка бясплатным.

Скарачэнне мае правілы

Супрацоўніка звальняюць па скарачэнні штатаў, аднак літаральна праз тыдзень на «скарочаным» месцы з'яўляецца іншы чалавек. Ці можа так быць?

— Прамой забароны на такі крок у заканадаўстве няма, рашэнне аб скарачэнні колькасці або штату прымаецца наймальнікам, — тлумачыць Алена Камісарава. — Разам з тым у падобнай сітуацыі можна звярнуцца на працягу месяца ў суд, прычым існуе верагоднасць таго, што суд возьме бок менавіта работніка. І тым больш гэта павінна адбыцца ў выпадку, калі наймальнік парушыў парадак скарачэння. Так, варта нагадаць: аб будучым вызваленні работнік павінен быць пісьмова папярэджаны не менш чым за два месяцы, наймальнік абавязаны праінфармаваць аб скарачэнні службу занятасці, прапанаваць работніку іншыя варыянты ўладкавання ці варыянты перанавучання, нарэшце, выплаціць выхадную дапамогу — у памеры трох сярэднямесячных заробкаў. Прычым гэта выплата робіцца непасрэдна ў дзень звальнення.

Галоўнае — калдагавор

Работнік патрапіў пад скарачэнне, а неўзабаве выйшаў на датэрміновую пенсію як беспрацоўны. Ці павінна арганізацыя, дзе чалавек працаваў да апошняга часу, рабіць яму аднаразовыя выплаты да святаў — як свайму былому супрацоўніку?

— У гэтым выпадку ўсё залежыць ад таго, што вызначае калектыўны дагавор менавіта гэтай арганізацыі, — зазначае Алена Камісарава. — Бо тут ёсць варыянты: у калдагаворы права на аднаразовыя выплаты можа распаўсюджвацца толькі на былых супрацоўнікаў, а можа — і на асобаў, што выйшлі з арганізацыі на пенсію ў выпадку скарачэння.

Калі даплачваюць за «шкоднасць»?

Ці маюць права на даплаты медсёстры, якія працуюць у шкодных умовах? На першы погляд, адказ тут відавочны — так. І разам з тым, спяшацца з катэгарычнымі высновамі ўсё ж не трэба. Бо заканадаўства вызначае: даплаты павінны рабіцца толькі тады, калі працоўнае месца прайшло атэстацыю і калі работнік заняты на шкодным месцы не менш за 80 працэнтаў свайго часу. У адваротным выпадку разлічваць на «прыбаўку» нельга.

І, як кажуць, у працяг «медыцынскай» тэмы. Зноў жа медсёстры двух аддзяленняў працуюць з вельмі рознай колькасцю пацыентаў. Ці могуць быць у такім выпадку аднолькавымі заробкі?

— Медсёстры двух аддзяленняў працуюць на поўныя стаўкі, і зменшыць выплаты па гэтых стаўках адным ці павялічыць іншым нельга, — кажа Алена Камісарава. — Сапраўды, з улікам вялікай нагрузкі наймальнік мае права ўстанавіць пэўныя даплаты. Але для гэтага таму ж наймальніку трэба «адшукаць» дадатковыя сродкі. Скажам, пры наяўнасці ў штатным раскладзе вакансіі за кошт яе такія даплаты можна вызначыць за сумяшчэнне прафесій або пашырэнне сферы абслугоўвання. А калі «лішняй» вакансіі няма, то магчымая крыніца даплат — больш высокія памеры прэміі за кошт эканоміі фонду зарплаты.

Пасада не залежыць толькі ад жадання

Студэнт-завочнік ВНУ мае праблемы з уладкаваннем. Аднак сітуацыя тут выглядае не зусім стандартнай. Служба занятасці прапануе рабочыя вакансіі ў сельгаспрадпрыемствах, аднак у кола інтарэсаў студэнта ўваходзяць прэтэнзіі толькі на больш прэстыжныя месцы — скажам, інжынера або загадчыка майстэрні. Ці абавязковае задавальненне падобных пажаданняў?

— Увогуле права заключэння працоўнага дагавора дадзена наймальніку, і ў сваю чаргу наймальнік можа падбіраць спецыяліста, які падыходзіць яму па кваліфікацыйных патрабаваннях, вопыце, стажы, — распавядае Алена Камісарава. — Словам, адмовіць у прыёме наймальнік можа, прычым за рэдкім выключэннем, ён не абавязаны тлумачыць прычыны свайго рашэння — да такіх выключных выпадкаў, у прыватнасці, адносіцца ўладкаванне цяжарнай жанчыны, жанчыны з дзіцем ва ўзросце да 3 гадоў, адзінокай маці з дзіцем ва ўзросце да 14 гадоў, маладога спецыяліста, работніка ў выпадку пераводу ці ўладкаванне за кошт броні службы занятасці. Што ж да канкрэтнага выпадку, то тут заўважу: на пасады спецыялістаў магчыма ўладкаванне асобаў, якія маюць адпаведную адукацыю, або, як варыянт у некаторых сітуацыях, — маюць дастатковыя веды і практыку. Ні першага, ні другога ў студэнта-завочніка няма — адпаведна, патрабаваць пасаду спецыяліста ён не можа.

Не змог на пенсію — звяртайся ў суд

Машыніст аміачных халадзільных установак не можа выйсці на датэрміновую пенсію толькі таму, што з 2004 года арганізацыя не праводзіла атэстацыю па ўмовах працы. Якім можа быць выйсце ў такой сітуацыі?

— Сапраўды, пры афармленні датэрміновай пенсіі пацвярджэнне «шкоднасці» працоўнага месца атэстацыяй — умова абавязковая, — падкрэслівае Алена Камісарава. — Разам з тым, правесці атэстацыю арганізацыя была павінна. А калі гэтага не адбылося, то работнік можа падаць у суд — з патрабаваннем, каб арганізацыя кампенсавала ўрон у сувязі з несвоечасовым выхадам на пенсію.

Ліміты на «лішнюю» працу

Ад работнікаў жыллёва-камунальнай гаспадаркі час ад часу патрабуюць выйсці на сваё месца для ліквідацыі аварыйных сітуацый. Як кампенсуюцца падобныя выхады? І што павінны атрымліваць камунальнікі, якія зноў жа ў сувязі з надзвычайнымі здарэннямі вымушаныя працаваць пасля заканчэння змены?

— Калі спецыфіка дзейнасці прадугледжвае неабходнасць выхаду на працу па выхадных у сувязі з неабходнасцю ліквідацыі аварыйных сітуацый, то наймальнік не абавязаны патрабаваць на гэта згоды работніка, — адзначае Алена Камісарава. — Разам з тым падобныя выхады павінны кампенсавацца або двайной аплатай, або прадастаўленнем іншага дня адпачынку «ўзамен». А каб той ці іншы «адгул» нідзе не згубіўся, канкрэтны тэрмін яго прадастаўлення абгаворваецца адразу — у загадзе або распараджэнні наймальніка аб прыцягненні да работы ў выхадны. Прычым патрабаваць «адгул» у зручны дзень выключна па сваім жаданні работнік не можа — тут неабходна дасягнуць згоды двух бакоў.

Наконт жа «павялічанай» працягласці змены трэба заўважыць наступнае. Па сутнасці ў такіх выпадках гаворка ідзе аб звышурочных. А наконт іх вызначаныя пэўныя «ліміты». Так, прыцягваць работніка з яго згоды да звышурочных можна не больш чым на 4 гадзіны на працягу двух дзён запар і не больш чым на 120 гадзін на працягу года. Да таго ж аплата звышурочных павінна рабіцца таксама ў двайным памеры або па дамоўленасці — кампенсавацца іншым днём адпачынку.

Чачэрскі раён.

Беларускія байцы адпомсцілі за «Еўрабачанне»

ЗБОРНАЯ БЕЛАРУСІ ПА ТАЙСКІМ БОКСЕ ПЕРАМАГЛА НА КАМАНДНЫМ ЧЭМПІЯНАЦЕ ЕЎРОПЫ

Спаборніцтвы праходзілі пад Рымам, у мястэчку Вэлетры. Увечары ў суботу 29 мая, калі праходзіў фінал конкурсу «Еўрабачанне», нашы спартоўцы якраз рыхтаваліся да галоўных паядынкаў турніру.

— Што? Расія паставіла нам усяго два балы? А Украіна ўвогуле нічога не паставіла? — абурыліся нашы байцы, калі карэспандэнт «Звязды» патэлефанаваў ім у Вэлетры. *— Гэта не па-суседску. Заўтра мы ім пакажам!*

Адкуль такая рэакцыя на нізкія балы ад Украіны і Расіі? Гэтыя каманды — нашы галоўныя канкурэнты на чэмпіянатах па тайскім боксе. Калі зборныя Тайланда і Галандыі традыцыйна не выстаўляюць на камандныя спаборніцтвы сваіх найлепшых прафесіяналаў, то беларусы, украінцы і рускія накіроўваюць туды самых-самых.

— Што? Расія паставіла нам усяго два балы? А Украіна ўвогуле нічога не паставіла? — абурыліся нашы байцы, калі карэспандэнт «Звязды» патэлефанаваў ім у Вэлетры. — Гэта не па-суседску. Заўтра мы ім пакажам!

У нядзелю 30 мая рынгі мястэчка Вэлетры дыміліся ад зацятых фінальных змаганняў. Першае, пра што мы даведаліся, гэта перакананучая перамога і першае месца лідара зборнай Віталя Гуркова (71 кг, клуб «Патрыёт»), які накаўтаваў казаха Алмаса Смагулава ў трэцім раўндзе. Потым стала вядома, што ўпершыню чэмпіёнам Еўропы стаў Максім Маруга (63,5 кг, «Кік-файтэр»). Золата зарабілі Андрэй Кулебін (67 кг, «Кік-файтэр»), Дзяніс Ганчаронак (91 кг, «Патрыёт»), Аляксей Кудзін (91 кг, «Сін-цяо»)...

Увечары ў рэдакцыю «Звязды» прыйшло смс-паведамленне ад старшага трэнера зборнай Дзмітрыя Пясецкага: «МЫ ПЕРАМАГЛІ». Канкурэнты — ужо ўзгаданыя ўкраінцы, расіяне, а таксама туркі, чэхі, славенцы — так і не змаглі шчыльна наблізіцца да нашых у камандным заліку.

Такім чынам, беларускія тайбаксёры кампенсавалі сваім першым месцам 24-ю пазіцыю гурта «3+2» на «Еўрабачанні».

У заўтрашнім нумары «Звязды» чытайце пра пікантныя падрабязнасці з чэмпіянату: як нашых байцоў перакармілі піцамі і спагеці, як лідар зборнай заснуў у італьянскім парку, як студэнтка БДУ і яшчэ тры магілёўскія дзяўчыны растлумачылі Еўропе, што беларускі не толькі прыгожыя, але і добра б'юцца...

Яўген ВАЛОШЫН.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 01.06.2010 г. (для б/н разлікаў)				*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ*	
1 долар ЗША	3 000,00	1 чэшская крона	145,27	USD	30,7400
1 еўра	3 690,90	1 польскі злоты	905,77	10 UAH	38,7886
1 латвійскі лат	5 212,86	1 расійскі рубель	97,59	1000 BYR	10,2433
1 літоўскі літ	1 069,42	1 украінская грыўня	378,55	EUR	37,8133

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

МІНІСТЭРСТВА АБАРОНЫ БУДЗЕ АЗДАРАЎЛЯЦЬ ПАДЛЕТКАЎ ЯКАСНА

НА прэс-канферэнцыі наконт арганізацыі занятасці падлеткаў у летні перыяд Вячаслаў РАМЕНЧЫК, начальнік упраўлення інфармацыі Галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай працы Міністэрства абароны, заявіў, што аб'яўлены год якасці накладвае асаблівую адказнасць на тых людзей, якія будуць працаваць з дзецьмі і падросткамі ў спартыўна-патрыятычных лагерах.

Ён паведаміў, што сёлета Узброеныя Сілы плануюць арганізаваць працу больш чым 70 спартыўна-патрыятычных лагераў на базе ваенных часцей і больш чым 90 — на базе сярэдніх навучальных устаноў. Усяго, такім чынам, з дапамогай Міністэрства абароны змогуць аздаравіцца каля 10 тысяч беларускіх дзяцей і падлеткаў. Вячаслаў Раменчык адзначыў, што гэта болей, чым летась. У прыватнасці, у 2009 годзе на базе ваенных часцей было арганізавана 75 спартыўна-патрыятычных лагераў для 3,5 тысячы дзяцей і падлеткаў, з якіх, дарэчы, прыкладна 1 тысячу складалі так званыя «цяжкія» падлеткі. Усяго ж за мінулы год Міністэрства абароны прыняло ўдзел у працы 167 спартыўна-патрыятычных лагераў, дзе аздараўляліся і бавілі час каля 9,5 тысячы маладых беларусаў.

— Сёлета вельмі важная падзея — 65-годдзе Вялікай Перамогі, таму праца з маладымі грамадзянамі нашай краіны ў спартыўна-патрыятычных лагерах будзе заснаваная перш за ўсё на лепшых гістарычных і баявых традыцыях краіны, — заявіў Вячаслаў Раменчык і расказаў, што падлеткаў чакаюць сустрэчы з ветэранамі ВАВ, наведванне гістарычных мясцін, упарадкаванне мемарыяльных комплексаў і помнікаў абаронцам Айчыны.

«Звязда» пацікавілася ў Вячаслава Раменчыка, ці будзе праводзіцца выхаванне дзяцей і падлеткаў на прыкладзе гераізму нашых продкаў і ў Грунвальдскай бітве, 600-годдзе якой адзначаецца ў гэтым годзе:

— Так, вядома, гэта будзе ў рамках тых мерапрыемстваў, якія арганізуюцца нашай дзяржавай.

Занятасцю дзяцей і падлеткаў у летні перыяд займаецца і Міністэрства ўнутраных спраў. Пра прэс-канферэнцыі **старшы інспектар аддзела арганізацыі прафілактыкі правапарушэнняў няпоўнагадовых Упраўлення прафілактыкі МУС Алег МАКСІМАЎ** расказаў, што з 1 мая па 1 верасня дзейнічае спецыяльная міжведамасная праграма «Клопат», а асабліва ўвага будзе звернутая на падлеткаў, што знаходзяцца на ўліку інспекцыі па справах няпоўнагадовых. Так, плануецца працаўладкаваць 5,7 тысячы такіх няпаўнагадовых, 1 тысячу накіраваць у студэнцкія будаўнічыя атрады, 1,3 — у валанцёрскія лагеры, 2,5 тысячы — у ваенна-патрыятычныя і абаронна-спартыўныя лагеры, 5 тысяч — у лагеры з дзённым знаходжаннем на базе ўстаноў адукацыі, 4,7 тысячы — у загарадныя аздараўляльныя лагеры, 1,5 тысячы — у палатачныя лагеры.

А вось **Аляксей АНАНЕНКА, галоўны інспектар упраўлення сацыяльнай і выхаваўчай працы Міністэрства адукацыі**, расказаў, што ў летнюю кампанію плануецца ахапіць каля 418 тысяч дзяцей і падлеткаў, што складае каля 35 % усіх дзяцей ва ўзросце ад 6 да 18 гадоў. З іх 186 тысяч будуць аздараўлівацца ў лагерах з кругласутачным знаходжаннем, а астатнія — з дзённым. Увогуле на правядзенне летняй аздараўляльнай кампаніі сёлета з бюджэту выдаткавана, па словах Аляксея Ананенкі, 76 мільярдаў рублёў.

Павел БЕРАСНЕЎ.

Падпісана «дарожная карта» Беларусі і Украіны

РАЗВЯЗАЦЬ клубок складаных пытанняў, якія існавалі паміж Украінай і Беларуссю на працягу апошніх 18 гадоў, а гэта праблемы ўзаемных разлікаў, а таксама сумеснай дзяржаўнай мяжы, заключаны дакумент, падпісаны ў Гомелі першым намеснікам прэм'ер-міністра Беларусі Уладзімірам Сямашкам і першым віцэ-прэм'ер-міністрам Украіны Андрэем Клюевым.

— План сумесных дзеянняў па рэалізацыі прыярытэтных напрамкаў беларуска-ўкраінскага супрацоўніцтва, які сфарміраваны па выніках сустрэчы прэзідэнтаў Беларусі і Украіны ў сёлетнім красавіку, можна назваць «дарожнай картай», — кажа намеснік прэм'-ер-міністра Беларусі Уладзімір Сямашка. — Ён будзе ўвасабляцца па працягу некалькіх гадоў, размова не ідзе пра аднамомантныя вынікі. Але ўжо сёння, напрыклад, выкананы пункты, якія датычацца ўзаемавыгаднай лагістыкі па дастаўцы венесуэльскай нафты для Беларусі праз Украіну.

Ёсць і іншыя прыклады стасункаў паміж нашымі краінамі, якія сведчаць аб узаемным паразуменні. Так, таварааварот паміж краінамі за чатыры першыя месяцы года склаў $1,1 млрд — гэта на 44 % больш, чым за такі ж перыяд летась. Як лічыць Уладзімір Сямашка, станоўчая дынаміка развіцця гандлёвых аперацый дазваляе меркаваць, што па выніках года таварааварот паміж краінамі складзе не менш за $4 млрд. Віцэ-прэм'ер лічыць, што і гэтую лічбу можна падвоіць. Прыняты дакумент стане асновай для развіцця рознабаковага супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Украінай на найбліжэйшыя гады.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ГАНДУРАСУ І ПАЎДНЁВАЙ КАРЭІ НІ Ў ЧЫМ НЕ САСТУПІЛІ

Так лічыць Бернд Штанге, але паказваць сябе прызывае са Швецыяй

НАЦЫЯНАЛЬНАЯ каманда па футболе правяла два таварыскія матчы, і ў абодвух выпадках супернікамі былі фіналісты чэмпіянату свету па футболе, які праз дзесяць дзён стартуе ў ПАР. Беларусы згулялі ўнічыю з Гандурасам (2:2) і абыгралі Паўднёвую Карэю (1:0). Цяпер наша каманда вядзе падрыхтоўку да таварыскага матчу са Швецыяй, які 2 чэрвеня пройдзе на стадыёне «Дынама». Галоўны трэнер зборнай Бернд Штанге пасля вяртання з Аўстрыі, дзе праходзілі падрыхтоўку з карэйцамі і гандурасцамі, пракаментаваў гульню беларусаў.

«Нашай галоўнай задачай было паказаць вынік, і мы гэтага дасягнулі, — заявіў Бернд Штанге. — Гэта поспех, бо нашымі супернікамі былі зборныя, якія знаходзяцца вышэй у рэйтынгу. Гандурас — 38-ы, Паўднёвая Карэя — 47-я, а Беларусь толькі 82-я. Нашы маладыя гульцы дасягнулі відавочнага прагрэсу. Калі раней яны ціха стукаліся ў зборную, то цяпер кулаком адчыняюць дзверы. Бачна, што з футбалістамі правільна працуюць у клубах». Пагадзіўся з галоўным трэнерам і старшыня федэрацыі футбола Генадзь Нявыглас, які выказаў задаволенасць развіццём нацыянальнай зборнай і яе маладымі гульцамі, якія раней не мелі там «пастаяннай прапіскі».

У той жа час Бернд Штанге адзначыў, што ў першай гульні супраць каманды Гандураса беларусы маглі і перамагчы, але не выкарысталі некалькі выгадных момантаў. Супраць Паўднёвай Карэі беларусы дзейнічалі лепш, асабліва ў другой палове гульні, аднак зноў не рэалізавалі галявыя моманты. З добрых пазіцый прамахнуліся, у прыватнасці, Сяргей Кісляк і Віталь Радзівонаў. «Было шмат шанцаў, якімі нам не ўдалося скарыстацца. І ў гэтым ёсць міжнародны клас гульні — умець выкарыстаць шанц», — заўважыў галоўны трэнер. Пры гэтым нямецкі спецыяліст падкрэсліў, што зборная заўсёды нядрэнна выступае ў таварыскіх матчах. «Наша задача — дасягаць выніку ў матчах, якія маюць турнірнае значэнне».

Нягледзячы на няўдалую гульню з Гандурасам, Юрый Жаўноў застанецца капітанам каманды і асноўным варатаром. Бернд Штанге падкрэсліў, што ў яго няма падстаў не давяраць тром нашым варатарам. «Юрый няўдала згуляў з Гандурасам, і цяпер усе кажуць пра неабходнасць пошуку новага галкіпера. Але варатарам трэба давяраць, асабліва такім, як Жаўноў. У клубе ён сам павінен настойваць на тым, каб яго часцей выпускалі на поле. Не магу сказаць, хто згуляе ў матчы супраць Францыі 3 верасня, у варотах будзе той, хто лепш выглядае. Але ў камандзе фантастычны настрой. Кожны ведае, што яму рабіць. Мы ідзём правільным шляхам і не дазволім сябе спіхнуць». Разам з гэтым Штанге падкрэсліў, што ў каманды няма ўстойлівай псіхалогіі пераможцаў, і ёй трэба дзейнічаць больш агрэсіўна. Не ўдалося пакуль дасягнуць і таго, каб на кожнай пазіцыі было па 2 гульцы, існуе праблема канкурэнцыі ў нападзенні.

Паядынак супраць каманды Швецыі стане для нашай зборнай трэцім за 7 дзён. Ён, на думку Штанге, і прадэманструе, ці змогуць нашы маладыя гульцы захаваць свае фізічныя кандыцыі і на роўных згуляць з аўтарытэтным супернікам. «Гэта фактычна графік каманды-ўдзельніцы Лігі чэмпіёнаў. І вынік будзе важным у псіхалагічным плане», — сказаў Бернд Штанге.

Бернд Штанге і Генадзь Нявыглас далі свае прагнозы і на чэмпіянат свету. Нямецкі спецыяліст упэўнены, што планетарнае першынство выйграе Іспанія. Прычым у фінале яна адолее Аргенціну з лікам 1:0, а пераможны гол заб'е на 88-й хвіліне Фернанда Торэс. А вось Генадзь Нявыглас паставіў на Англію і растлумачыў свой прагноз выйгрышам гэтай зборнай апошняга чэмпіянату Еўропы. У той жа час Бернд Штанге сказаў, што было б нядрэнна, калі б Францыя стала чэмпіёнам свету, а Беларусь перамагла яе ў стартавым матчы адбору да Еўра-2012.

Сёння ў 19 гадзін на стадыёне «Дынама» адбудзецца адкрытая трэніроўка нашых футбалістаў, і балельшчыкі змогуць кантактаваць з гульцамі і трэнерамі. Да 19 футбалістаў, якія гулялі ў Аўстрыі, далучацца Ягор Філіпенка і Вячаслаў Глеб. Тытулаваная каманда Швецыі таксама сёння апрабуе газон сталічнага «Дынама». Нагадаем, што ў фінальную частку чэмпіянату свету зборная прабіцца не змагла, але да нас прыедуць гульцы сусветнага ўзроўню. Сярод іх Андэрс Свенсан, які правёў 106 матчаў у нацыянальнай камандзе, Кім Чэльстром — паўфіналіст сёлетняй Лігі чэмпіёнаў у складзе французскага «Ліёна», Йохан Эльмандэр, які выступае за англійскі «Болтан». І крыўдзіць нашай моладзевай зборнай на леташнім чэмпіянаце Еўропы, футбаліст «Гамбурга» Маркус Берг, які забіў нашай камандзе 3 мячы ў стартавым матчы, а таксама яго напарнік па «маладзёжцы» Ола Тойванен, які выступае за галандскі «ПСВ Эйндховен». Так што паглядзець ёсць на каго. Нагадаем, што таварыскі паядынак пачнецца 2 чэрвеня ў 20.30, за гадзіну да пачатку матча на стадыёне адбудзецца канцэрт з удзелам зорак беларускай эстрады.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

Пазбаўляць ліцэнзій тых, хто гандлюе няякаснай рыбай

З такой прапановай выступіла Генеральная пракуратура Беларусі пасля таго, як выявіла грубыя парушэнні правілаў рэалізацыі рыбнай прадукцыі на шэрагу рынкаў Мінска і Магілёва.

— Апошнім часам у Генпракуратуру неаднаразова паступалі скаргі ад спажыўцоў адносна якасці рыбнай прадукцыі на асобных рынках рэспублікі, — адзначыў **пракурор аддзела па наглядзе за выкананнем правоў і свабод грамадзян Генпракуратуры Юрый КАРПІЦКІ**. — Мы не прымусілі сябе чакаць і разам са спецыялістамі з Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі і дзяржаўнага санітарнага нагляду наведалі з праверкай некалькі самых буйных гандлёвых аб'ектаў сталіцы і Магілёва. І што вы думаеце, ажно ў 15 суб'ектаў гаспадарання з 22 правераных выяўлены грубыя парушэнні правілаў рэалізацыі рыбнай прадукцыі.

— Удакладніце, калі ласка, якія гэта парушэнні?

— На момант праверкі рыба рэалізоўвалася без адпаведнай маркіроўкі, якая інфармуе, у прыватнасці, аб раёне промыслу, памеры і вазе, даце вырабу і тэрміне захоўвання марожанай рыбы. Непрымальным быў санітарны стан асобных павільёнаў, гандлёвых месцаў і халадзільнага абсталявання. На рынках сталіцы выявілі парушэнні тэмпературнага рэжыму пры захоўванні і рэалізацыі рыбнай прадукцыі. Акрамя таго, зафіксаваны адзінкавыя факты рэалізацыі пратэрмінаванай рыбы. Былі праведзеныя таксама і лабараторныя даследаванні адабраных пробаў рыбнай прадукцыі. Асобныя з іх не адпавядалі патрабаванням тэхнічных нарматыўных прававых актаў па паказчыках бяспекі. Так, партыя марожанага мінтая, якая рэалізоўвалася адным са сталічных камерцыйных прадпрыемстваў, не адпавядала ўстаноўленым патрабаванням па ступені заражанасці загінулымі паразітамі. А масавая доля ахоўных пакрыццяў партыі філе цілапіі на гандлёвых пунктах гэтага прадпрыемства перавышала ўказаную ў суправаджальных дакументах ажно ў 2 разы.

Забаронена рэалізацыя 435 кілаграмаў рыбнай прадукцыі агульным коштам каля 7,1 мільёна рублёў. Акрамя таго, вынесены пастановы аб часовым прыпыненні эксплуатацыі асобных гандлёвых месцаў да таго часу, пакуль не будуць ліквідаваныя парушэнні.

Паводле слоў Юрыя Карпіцкага, Генпракуратура па выніках праверкі ўнесла прадстаўленні на суму больш за 2,5 мільёна рублёў. Акрамя таго, прапанавала кіраўніцтву Мінгарвыканкама і Магілёўскага аблвыканкама ануляваць ліцэнзіі, выдадзеныя на рознічны гандаль, у суб'ектаў гаспадарання, у дзейнасці якіх былі выяўлены грубыя парушэнні заканадаўства.

ДА ВЕДАМА

У пачатку мая пракуратура Гродзенскай вобласці завяла крымінальную справу за злоўжыванне службовымі паўнамоцтвамі ў дачыненні дырэктара аднаго з прадпрыемстваў, якое займаецца рэалізацыяй рыбы. Жанчына падазраецца ў тым, што ў лютым-сакавіку гэтага года прымушала сваіх падначаленых перафасоўваць пратэрмінаваную рыбную прадукцыю ў іншую тару з указаннем новага тэрміну дзеяння.

Надзея ДРЫЛА.

НІ АГАРОДЖЫ, НІ МІЛЬЁНАЎ

Адзін прадпрымальны махляр у Брэсце ўзяўся падманваць пажылых людзей, што жывуць у прыватным сектары. Ён абяцаў зрабіць агароджу вакол дома альбо ўчастка. Але грошы браў наперад.

У адной пенсіянёркі гора-прадпрымальнік узяў каля двух з паловай мільёнаў рублёў, у другой — 1 мільён 300 тысяч, у трэцяга гаспадара — 2 мільёны рублёў. Але абяцаная агароджы домаўладальнікі не дачакаліся і пайшлі ў міліцыю. Зламыснік затрыманы.

Яна СВЕТАВА.

ВУЧЫЦЬ СЫНА

На меліяратыўным канале каля в. Печкі ў Маларыцкім раёне невядомыя разабралі механізмы і выкралі металічныя часткі шлюза.

Пра гэта заявіў у міліцыю дырэктар УП «Маларыцкае ПМС». Аператыўная група ўстанавіла, што такім чынам вырашыў падзарабіць трактарыст з мясцовага сельгаскааператыва. Ён разам з сынам-вучнем скраў тыя дэталі.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ТЭЛЕВІЗАР — ПРЫЧЫНА ПАЖАРУ

У Чашніках стары тэлевізар маркі «Рубін», выраблены ў 1958 годзе, стаў прычынай пажару ў драўляным доме пенсіянёркі 1915 года нараджэння.

Як паведаміла «Звяздзе» прэс-сакратар Віцебскага абласнога ўпраўлення па надзвычайных сітуацыях Марына Фандо, пенсіянерку пажарныя выратавалі. Медык канстатавала, што медыцынская дапамога гаспадыні дома не патрэбна. Магчымая прычына пажару — кароткае замыканне тэлевізара. У выніку пажару была пашкоджана маёмасць у доме на суму 1 мільён рублёў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ПРАЗ СЦЯНУ... ДА ГАРЭЛКІ

Двое беспрацоўных з Брэста вырашылі абрабаваць краму Брэсцкай спажыўкааперацыі па вул. Прыгранічнай. Яны не адключалі сігналізацыю і не пілавалі краты на вокнах, а залезлі ў краму праз сцяну. Напачатку сарвалі замок з дзвярэй кацельні, а затым спакойна ўзяліся ламаць сцяну крамы.

Зладзеі ўсю ўвагу сканцэнтравалі на алкаголі і цыгарэтах. Украдзенае пацягнула на 3 млн рублёў. Зладзеяў чакае суд.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

«Звязда» — газета-спартсменка!

Традыцыйная спартландыя пад патранажам Міністэрства інфармацыі прайшла днямі на базе Акадэміі фізкультуры. У спаборніцтвах акрамя абласных аддзяленняў аблсаюздруку ўзялі ўдзел і цэнтральныя СМІ.

Звяздоўцы Уладзімір Здановіч, Павел Берасневў, Надзея Дрыла, Настасся Занько і Ілья Лапато змагаліся з прадстаўнікамі іншых камандаў у бегу на 60 м, 100 м, падцягванні на перакладзіне і скачках у даўжыню. Завяршыліся спаборніцтвы эстафетай на 400 м.

«Вікторыю» ў выніку святкавала каманда «АНТ», другое месца — у газеты «Беларуская ніва», замкнула тройку лідараў — каманда Брэсцкага аблсаюздруку.

Газета «Звязда» сярод 21 каманды заняла шостае месца.

Іван ТОНЕЎ.

УЗБРОЕНЫ НАПАД НА БАНК У МІНСКУ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Высветлілася, што аддзяленне банка «Масква—Мінск» па вуліцы Ясеніна, 30 і сапраўды абчысцілі. Каля чатырох гадзін дня, калі мы прыехалі на месца здарэння, там ужо працавалі крыміналісты. Уваход у банк быў ачэплены аранжавай стужкай.

— Сам не магу туды прайсці, прыехаў крэдыт браць, і бачу такое, — жаліцца сівы мужчына ў гарнітуры.

Спрабую даведацца ў міліцыянераў хоць нейкія падрабязнасці пра абрабаванне банка. Тыя паклікалі «галоўнага».

— Нічога не фатаграфаваць, усе даведкі праз прэс-службу!

Падыходжу да маладых людзей, якія таксама назіраюць за міліцыянерамі побач з аранжавай стужкай.

— Здарылася ўсё ціха, мы не бачылі ні рабаўнікоў, не чулі ніякай страляніны, — распавядае супрацоўнік салона прыгажосці, які месціцца па суседстве з банкам. — І раптам панаехала міліцыі.

— Не паспелі амністыю абвясціць, як тут жа банкі рабуюць па самым бокам, — усхвалявана выказваецца дзяўчына з таго ж салона, зацягваючыся цыгарэткай.

Удалося даведацца, што напад на банк быў узброены па-сапраўднаму. Мужчына ўвайшоў у аддзяленне і пачаў пагражаць супрацоўнікам банка пісталетамі ці іх макетамі. На момант падрыхтоўкі гэтага матэрыялу пра затрыманне ўзброенага бандыта нічога не было вядома.

Горад ачапілі. Толькі на кавалку мінскай кальцавой аўтадарогі ад вуліцы Прытыцкага да Лагойскага тракта мы налічылі аж сем даішных аўтамабіляў. Але ці прынясе плён план «Перахоп»?

Ад 2008 года гэта ўжо чацвёртае дзёрзкае абрабаванне банка ў Мінску. Спачатку абчысцілі абменнік «Пріорбанка» ў гіпермаркеце «Прастор». Вынеслі дзясяткі тысяч долараў. У снежні гэтага года здарылася страшная трагедыя ва ўніверсаме «Аўтазаводскі» — нелюдзь забіў касірку абменніка «Абсалютбанка» і вынес грошы. Дагэтуль злачынца на волі. Яшчэ адну справу па абрабаванні абменніка «Абсалютбанка» ва ўніверсаме «Цэнтральны» раскрылі. І вось чарговы напад на аддзяленне банка. Па папярэдніх звестках, рабаўнік вынес каля 500 тысяч расійскіх рублёў (каля $16 тысяч).

— Самае галоўнае, што не пацярпеў ніхто з супрацоўнікаў банка, — з палёгкай выдыхае Юрый БАЦЯН, дырэктар дэпартамента адміністратыўнага ўпраўлення банка «Масква—Мінск». — На жаль, сёння больш не магу даць аніякай інфармацыі.

Адкрыты сезон «палявання» на... веласіпеды

Прынамсі, толькі ў Савецкі РУУС сталіцы за некалькі апошніх дзён звярнулася больш за 20 чалавек з заявамі аб крадзяжы двухколавага «каня».

Як адзначае прэс-афіцэр савецкага РУУС Вольга Яскевіч, асабліва крымінальнікі «палююць» за дарагімі «горнікамі» і «хуткаснікамі», кошт якіх вагаецца ад 600 тысяч да 3 мільёнаў рублёў. Прычым большасць крадзяжоў учыняецца ў вячэрні ці начны час з незачыненых тамбураў, лесвічных пляцовак і пралётаў. А таму ў ГУУС гаспадарам веласіпедаў, каб не стаць ахвярамі зладзеяў, раяць захоўваць элементарныя меры перасцярогі: па-першае, не пакідаць без нагляду сваіх двухколавых «коней», а, па-другое, лепш ставіць іх на ноч у гаражы ці падсобныя памяшканні, загадзя праверыўшы надзейнасць замкоў.

У сваю чаргу ахвотныя да чужога дабра таксама павінны памятаць, што за крадзеж веласіпеда прадугледжана пазбаўленне волі на тэрмін да двух гадоў.

Ігар ГРЫШЫН.

Абзац

◢ У праваслаўных вернікаў учора пачаўся Пятроўскі пост. Ён устаноўлены царквой па прыкладзе святых апосталаў, якія прыняўшы Святога Духа ў дзень Пяцідзясятніцы, у посце і малітве рыхтаваліся да сусветнай пропаведзі Евангелля. Пятроўскі пост нагадвае, што галоўны вораг не той, хто забівае цела, а той, што ўнутры душы. У посце чалавек вучыцца падпарадкоўваць цялесныя патрэбы свайму духу, як гэта рабілі многія святыя. Пятроў пост з'яўляецца нястрогім. Згодна з царкоўным звычаем, рыба ў гэты пост дазваляецца ва ўсе суботы, нядзелі, а таксама святочныя дні. Алей ядуць ва ўсе дні, акрамя серады і пятніцы. Скончыцца пост 11 ліпеня.

◢ **Па віне кіроўцы без правоў, жыхара Баранавічаў 1963 г.н., у Дзятлаўскім раёне пацярпелі пажылыя жанчыны 1940, 1932 і 1927 г.н. Каля 13.30 у нядзелю на бабулек, якія сядзелі на лаўцы каля хаты непадалёк ад дарогі, наехалі «Жыгулі». Жанчыны былі дастаўленыя ў бальніцу, дзе дзве з іх памерлі. Усяго за мінулую нядзелю ў ДТЗ у Беларусі загінула 8 чалавек.**

Поўны абзац



◢ Кітайскія навукоўцы даведаліся пра сакрэт трываласці і даўгавечнасці Вялікай сцяны. Хімікі ўстанавілі, што ў склад раствору, які змацоўваў каменныя блокі збудавання, уваходзіла клейкая рысавая каша. Рабочыя рыхтавалі раствор з варанага рысу і гашанай вапны — стандартнага кампаненту будаўнічых сумесяў. Выкарыстанне рысавай кашы было для таго часу прагрэсіўным і наватарскім крокам. Як сведчаць навукоўцы, на ўчастках глебы, дзе капаў раствор гэтай сумесі, да гэтага часу не могуць прарасці травы. Адметна, што такі рыс кітайскія рабочыя прымянялі і ў ежу.

◢ **У Інданэзіі пачалася кампанія па барацьбе з джынсамі. Улады інданэзійскай правінцыі Ачэх выдзелілі 20 тысяч спадніц для кампаніі па барацьбе з жаночымі абцягнальнымі джынсамі. У бліжэйшыя два месяцы спадніцы будуць выдаваць жанчынам, апранутым непрыстойна з пункту гледжання традыцыйных ісламскіх нормаў. Права меркаваць аб тым, хто з жанчын апрануты з выклікам, дадзена ісламскай паліцыі. У выпадку, калі жанчыну затрымаюць у джынсах тры разы запар, ёй пагражае двухтыднёвы тэрмін зняволення. Пад забарону трапіў у тым ліку і продаж джынсаў у мясцовых крамах. Парушальнікам пагражае пазбаўленне ліцэнзіі. Па звестках паліцыі, 27 мая былі затрыманыя 18 жанчын, якія каталіся на мапедах і былі апранутыя ў джынсы. У паліцэйскім участку ў кожнай з парушальніц канфіскавалі джынсы, а ўзамен далі доўгую спадніцу. Усе затрыманыя былі адпушчаны пасля прадастаўлення звестак пра сябе і гутаркі з мусульманскімі духоўнымі асобамі.**

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ

РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 15 июля 2010 года проводит 10-й открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности

Лот	Наименование техники	Местонахождение объекта	Год выпуска	Пробег в км/ наработка в м/ч, (износ)	Начальная цена продажи (руб.)	Сумма задатка (руб.)
1	2	3	4	5	6	7
74.	Топливозаправщик ТЗА-7,5-5334, с/о № А9041538 на а/шасси МАЗ-5334 ш. 127486, дв. 9023102, 4 кат.	н.п. Михановичи, в/часть 52188	1990	53545 1991 м/ч	26 000 000	2 600 000
75.	Топливозаправщик ТЗА-7,5-5334, с/о № А9041533 на а/шасси МАЗ-5334 ш. 127337, дв. 9022298, 4 кат.	н.п. Михановичи, в/часть 52188	1990	41673 926 м/ч	30 000 000	3 000 000
76.	Автотопливомаслозаправщик АТМЗ-5-4320, с/о № 1610 на а/шасси УрАЛ-4320-1012, ш. 031170, дв. 681644, 4 кат.	г. Михановичи в/часть 52188	1984	14097 2987 м/ч	53 000 000	5 300 000
77.	Автотопливомаслозаправщик АТМЗ-5,5-4310, с/о № 890234 на а/шасси КамАЗ-4310, ш. 0056945, дв. 0386657, 4 кат.	г. Михановичи в/часть 52188	1989	12301 1664 м/ч	48 000 000	4 800 000
78.	Автотопливомаслозаправщик АТМЗ-5,5-4310, с/о № 890340 на а/шасси КамАЗ-4310, ш. 0058813, дв. 0404411, 4 кат.	г. Михановичи в/часть 52188	1989	10174 448 м/ч	53 000 000	5 300 000
79.	Автоцистерна АЦ-8-5334 с/о № А8730666 на а/шасси МАЗ-5334, ш. 98844, дв. 802848, 4 кат.	г. Михановичи, в/часть 52188	1987	30424 284 м/ч	36 000 000	3 600 000
80.	Электростанция ЭД2х30/Т400-1РАМ1 № ПТ1545КВВМ на КамАЗ-43101, ш. 0034761, д. 0129165, 4 кат.	г. Береза, в/часть 23324	1988	14128 66 м/ч	45 000 000	4 500 000

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 2, 6-й этаж, в 11.00, **15 июля 2010 г.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток и подавшие заявление на участие в аукционе, учредительские и другие необходимые документы до **17.00 13 июля 2010 года.**

Победитель аукциона обязан:

1. Заключить договор купли-продажи **15 июля 2010 г.**

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение 5-ти банковских дней со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток и денежные средства победителем лота перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: 3012008660018, код 357, в Октябрьском отд. ОАО «БПС-Банк» г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, УНП 101099370. **Без НДС. Справки по тел.: (017) 278 06 97, факс 224 20 01. Наш адрес в интернете: www.belspeckontrakt.by.**

ДОПОЛНИТЕЛЬНО

В извещение, опубликованное в газете «Звязда» № 94 от 18 мая 2010 года о проведении 9-го открытого аукциона, вносятся изменения. Лоты с № 66 по № 73 «гусеничное шасси МТ-ЛБу» снимаются с торгов в связи с переносом аукциона по ним на поздний срок. Извещение на проведение аукциона по гусеничным шасси МТ-ЛБу будет опубликовано в газете «Звязда».

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ, НАХОДЯЩИХСЯ В РЕСПУБЛИКАНСКОЙ СОБСТВЕННОСТИ

Торги состоятся 8 июля 2010 г. в 11.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 62, к. 106.

Организатор торгов: фонд «Могилевоблимущество», 212030, г. Могилев, ул. Первомайская, 62, тел. 8(0222) 229022, 311185, 223375.

Продавец недвижимого имущества – РУП «Могилевское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру», тел. 8(0222) 333010.

Заявления на участие в торгах принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 62, к. 104. Последний день приема заявлений на участие в торгах с прилагаемыми к ним документами – **6 июля 2010 г. до 16.00.** Заключительная регистрация участников торгов – **8 июля 2010 г. с 10.00 до 10.50.** С объектами можно ознакомиться ежедневно в рабочие дни до установленного последнего дня подачи заявлений на участие в торгах.

№ лота	Сведения о предметах торгов				
	Информация о недвижимом имуществе			Начальная цена продажи предмета торгов, тыс. руб.	Сумма задатка, тыс. руб.
	Наименование и краткая характеристика	Место нахождения	Краткая характеристика объектов:		
1	**Изолированное помещение** общей площадью 46,5 кв.м (первый этаж), **изолированное помещение** общей площадью 36,0 кв.м (второй этаж), **изолированное помещение** общей площадью 924,4 кв.м (третий этаж), **изолированное помещение** общей площадью 924,8 кв.м (четвертый этаж)	г. Могилев, ул. Вишневецкого, 8а	Изолированные помещения в 4-этажном здании, фундамент бетонный, стены крупнопанельные, перекрытия железобетонные, полы бетонные, крыша совмещенная	364 016,668	36 000,0

Начальная цена продажи недвижимого имущества понижена на 20 процентов.

Задаток перечисляется на расчетный счет фонда «Могилевоблимущество» № 3642900001315 в филиале № 700 – Могилевское областное управление ОАО «СБ «Беларусбанк», код 536, УНП 700052050.

Для участия в торгах в указанный в извещении срок в фонд «Могилевоблимущество» подается заявление на участие в торгах со следующими документами:

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации и его подлинник для заверения его копии организатором торгов;

юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица и их подлинники для заверения их копий организатором торгов;

иностранным юридическим лицом, иностранной организацией, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств, иностранным государством и их административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организацией – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов, выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на русский или белорусский язык;

представителем иностранного инвестора – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности иностранного инвестора, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на русский или белорусский язык;

представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – доверенность.

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, физические лица (граждане Республики Беларусь и лица без гражданства), постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Прием заявлений на участие в торгах со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором торгов день и час, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в торгах.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, перечисленные выше, подавшие организатору торгов в названный в настоящем извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в настоящем извещении расчетный счет сумму задатка, зарегистрированные в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, получившие билеты участников торгов с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором торгов соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии с Инструкцией о порядке организации и проведения торгов по продаже некоторых объектов республиканской собственности, утвержденной постановлением Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь от 30 марта 2009 г. № 36.

Организатор торгов имеет право снять предмет торгов с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения торгов, при этом объявление об отказе от проведения торгов публикуется в газете «Звязда».

Срок заключения (государственной регистрации) договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента утверждения организатором торгов протокола о результатах торгов.

Оплата за предмет торгов осуществляется денежными средствами по безналичному расчету без предоставления рассрочки.

Победитель торгов возмещает фактические затраты на подготовку и проведение торгов.

КПУП «ГОМЕЛЬОБЛРЕКЛАМА» ФИЛИАЛ «ЭКСПЕРТ-УСЛУГА» (организатор аукциона) извещает о проведении 18 июня 2010 года повторного открытого аукциона по продаже имущества в 10.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, кабинет 2-18

№ ЛОТА	инвентарный №	Наименование	Начальная цена, с НДС бел. руб.	Задаток, с НДС бел. руб.
1	2037	Здание столовой с сетями водопровода, канализацией, дорогами, тротуарами, забором, линией электроснабжения	624 519 360	62 000 000
2	6202 и 6203	Здания специализированных складов	263 340 000	26 000 000

ТВОРЧЫ ПАЛЁТ НА «ШАРЫ»

Як ператварыць шэрыя дажджлівыя будні ў яркія сонечныя дні — дакладна ведаюць у народнай мастацкай студыі «Шар» з Магілёва. Выстава дзіцячых малюнкаў адкрылася ў Магілёўскай выставачнай зале.

Кіраўнік мастацкай студыі «Шар» Наталля ТАЛАНТАВА і яе выхаванцы.

Кожны малюнак — шчыры мастацкі твор. Звыклыя тэмы набываюць у маленькіх мастакоў зусім новае гучанне: Аляксандр Пушкін прыняў выгляд Элвіса на фоне вясёлкі, ветлівы кот не спяшаецца праглынуць дэсерт з апетытнай вішанькай, нетаропка плывуць дзіўныя рыбкі-сяброўкі, дзяўчына мые валасы ў душы модным шампунем, беларусачка ў полі танцуе з зайцамі, маршал Жукаў на партрэце чагосьці не па-ваеннаму разгубіўся, шкадлівы голуб скраў у хлопчыка найсмачнейшы хот-дог, мышы натоўпам прыйшлі да ката на дзень нараджэння...

Ліза ГЛАДКІХ і дзень нараджэння ката.

Ксенія ВАРАБ'ЁВА і яе добры анёл.

Ксенія Вараб'ёва, якой толькі 6 гадоў, намалявала свайго анёла:

— Гэта прыгожая і добрая дзяўчынка з крыламі, якая дапамагае мне ў вучобе, — патлумачыла юная мастачка.

Народная мастацкая студыя «Шар» маляўнічай выставай адзначыла сваё 10-годдзе. Работы яе выхаванцаў адзначаюцца шматлікімі ўзнагародамі на прэстыжных конкурсах і фестывалях. Але ўсё ж самая вялікая адметнасць студыі ў тым, што ў яе прымаюць усіх дзяцей і вельмі клапатліва ставяцца да іх незвычайных творчых ідэй.

Кіраўнік студыі «Шар» Наталля Талантава заклікае дзяцей вольна выяўляць свае пачуцці і спраўджваць фантазіі:

— Я хачу бачыць усіх дзяцей здаровымі і радаснымі. І няхай бацькі дазваляюць ім маляваць неба ў кветках і сініх жырафаў. У горад творчасці і дзяцінства трэба заходзіць з добрым сэрцам і адкрытай душой!

Ілона ІВАНОВА.
Фота Ірыны САВОСІНАЙ.

ТЭЛЕФАНУЙ, КАБ ПАЧУЦЬ СТАРЫЯ КАЗКІ НА НОВЫ ЛАД

Да Міжнароднага дня абароны дзяцей філіял «Мінская гарадская тэлефонная сетка» РУП «Белтэлекам» падрыхтаваў падарунак для самых маленькіх сваіх абанентаў. З 1 чэрвеня калекцыю казак службы «196» папоўніць байкі, казкі Карнея Чукоўскага і старыя казкі на новы лад.

— Шмат пакаленняў дзяцей выраслі на казках Карнея Чукоўскага. Бясспрэчна, гэта класіка дзіцячай літаратуры. Разам з тым, дынамічнасць, логіка, гумар і цудоўная мова гэтых казак робяць іх цікавымі і для сучасных дзяцей, — упэўнена **намеснік дырэктара філіяла па продажы і абслугоўванні кліентаў Таццяна ТРЫПУЦЕНЬ**. — У нашай казачнай фанатэцы з'явяцца таксама і байкі, якія даюць падставу і пасмяяцца, і паразважаць. А казкі на новы лад будуць цікавыя не толькі для дзяцей, але і для дарослых. У іх, напрыклад, Калабка не з'ядаюць, у трох парасят таксама некалькі іншая гісторыя..., а «Крошечка-Хаврошечка» мае сваю «біяграфію»...

Зараз фанатэка службы «196» змяшчае больш як 270 казак і легендаў народаў свету, ёсць у ёй казкі з працягам, дзіцячыя песні і нават інтэрактыўная казка, сюжэт якой залежыць ад абанента, які тэлефануе.

Абаненты з танальным наборам нумара маюць магчымасць з дапамогай галасавых падказак выбраць казку на свой густ. А для абанентаў, якія карыстаюцца тэлефонам з імпульсным наборам нумара, казкі для праслухоўвання змяняюцца кожную гадзіну. Аўтаінфарматар «196» працуе кругласутачна. Кошт паслугі складае 77 рублёў за хвіліну.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Без маралі няма духоўнасці

У Баранавічах прайшло пасяджэнне «круглага стала» «Місія жанчыны ў духоўна-маральным развіцці грамадства».

Актыў ГА «Беларускі саюз жанчын» сумесна з прадстаўнікамі дзяржаўных органаў улады, Беларускай Праваслаўнай Царквы, вучонымі і інш. абмяркоўвалі пытанні аб ролі жанчыны ў сучасным жыцці, яе ўплыве на грамадскія працэсы і магчымасці паляпшэння маральнага стану грамадства праз духоўнае станаўленне асобы.

— *Ёсць гістарычна-глыбінныя традыцыі ўшанавання жанок-міраносіц, іх ахвярнай любові, адданасці, адказнасці. Яны ў апошні час некалькі забытыя,* **— лічыць старшыня Беларускага саюза жанчын Надзея ЕРМАКОВА.** — *Але радуе тое, што гэтыя традыцыі сёння адраджаюцца ў Беларусі.*

У дыскусіі ў рамках «круглага стала» прынялі ўдзел палітыкі, навукоўцы, святары. Так, у сваім выступленні протаіерэй Пінскай Епархіі Храма Нараджэння Прасвятой Багародзіцы Георгій Мацкевіч спыніўся на некаторых аспектах духоўнасці сям'і. Жанчына павінна быць міраносіцай у жыцці — несці мір сваёй сям'і, хатняму ачагу, быць апорай мужу. Дарэчы, святар звярнуў увагу на адну акалічнасць. Біблейскае выказванне «І навёў Гасподзь Бог на чалавека моцны сон і, калі ён заснуў, узяў адно з яго рэбраў і закрыў тое месца плоццю» неабходна трактаваць крыху інакш — узяў не рабрыну, а грань.

Захаваць сям'ю, пазбегнуць негатыўных з'яў у грамадстве, спыніць сіроцтва можна толькі агульнымі намаганнямі.

На пасяджэнні прагучала думка, што без маралі няма духоўнасці. І гэта так, бо духоўнасць складваецца з культуры народа, яго гісторыі, рэлігійнасці і неабходна разглядаць гэтыя складнікі як адно цэлае.

Удзельнікі «круглага стала» наведалі Моўчадскую школу-інтэрнат у Баранавіцкім раёне, дзе сустрэліся з дзецьмі, педагогамі і выхавальнікамі.

А пасяджэнне прайшло ў санаторыі «Магістральны».

Сымон СВІСТУНОВІЧ. Фота аўтара.

СВЕТ ВАЧЫМА ДЗЯЦЕЙ

У Дзень абароны дзяцей мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць-герой» праводзіць акцыю «Малююць дзеці». 70 школьнікаў з Брэста і вобласці правядуць сеанс адначасовага малюнка на розныя тэмы. Лепшыя работы будуць вызначаныя ў пяці намінацыях. Іх аўтары атрымаюць прызы.

Яна СВЕТАВА.

Што можа быць смачнейшым за абед, прыгатаваны поварам Янінай САЎЧЫЦ і загадчыцай вытворчасці Наталляй БАКАНАВАЙ.

Дарослае дзяцінства

КРОК НАСУСТРАЧ...

Памятаю, у дзяцінстве бацькі часам мяне «палохалі»: не будзеш слухацца, аддадзім у інтэрнат. І гэта спрацоўвала — у інтэрнат не хацелася. Аднапавярховы шэры будынак знаходзіўся на ўскрайку гарадка, і перыядычна мы, дзеці «нармальныя», бегалі ўпотайкі глядзець на «інтэрнатаўскіх», калі іх выводзілі на прагулку. Знешне яны практычна нічым не адрозніваліся ад нас — тыя ж сінія школьныя касцюмчыкі, карычневыя сукенкі, фартушкі... І ўсё ж за агароджай шэрага будынка быў іншы свет, існавала іншае жыццё — жыццё без бацькоў. А значыць, думалася нам, без цацак, кніжак і цукерак. Мы шкадавалі «інтэрнатаўскіх», але пазбягалі і баяліся іх, дакладней, іх свету, у якім адсутнічаў галоўны складнік жыцця — любоў таты і мамы.

Такое, ці амаль такое ўспрыняцце вярнулася да мяне толькі на імгненне — калі трапіла на тэрыторыю сталічнай школы-інтэрната № 5 для дзяцей, якія засталіся без бацькоўскай апекі...

«Калі мой тата быў жывы, мама не піла...»

Рознаўзроставыя выхаванцы палолі клумбы — спакойна, з веданнем справы і без усялякіх пануканняў і вокрыкаў дарослых. Спецыяльна звярнула ўвагу на дзіцячую вопратку — адзенне як адзенне, у такім усе падлеткі ходзяць: джынсы, яркія маечкі, куртачкі. Ніякіх «сіроцкіх» кашуль і змрочных сукенак... На ўваходзе ў будынак хлопец гадоў чатырнаццаці ветліва павітаўся і, прытрымліваючы дзверы, прапусціў мяне наперад.

...Кабінет дырэктара інтэрната Наталлі Шарапавай — на першым паверсе. У школе яна працуе з 84-га года, дырэктарам — з 95-га. У свой час, прызнаецца Наталля Уладзіміраўна, ёй было страшнавата сюды пераходзіць, тым больш пасля працы ў дзіцячым садку. Тады школа-інтэрнат яшчэ не мела статусу ўстановы «сіроцкага» тыпу. Сюды хоць і накіроўвалі дзяцей з няўдалых сем'яў, аднак іх мамы і таты не былі пазбаўленыя бацькоўскіх правоў... Сёння ў школе-інтэрнаце № 5 жывуць і вучацца спрэс сіроты. Прычым тых, у каго памерлі бацькі, адзінкі. Пераважная большасць — сіроты сацыяльныя. Ад некаторых мамы адмовіліся яшчэ ў раддоме. Іншых пераравялі сюды ў класе 6-7-м, пасля таго, як іх бацькоў пазбавілі самага галоўнага права — выхоўваць сваіх дзяцей.

— І яны, напэўна, самыя цяжкія, — тлумачыць Наталля Уладзіміраўна. — Калі маці ці бацька здраджваюць **маленькаму** дзіцяці, яно яшчэ нічога не ўсведамляе. А вось дарослыя дзеці добра памятаюць нармальнае жыццё: «Калі мой тата быў жывы, мама не піла». А потым тата памёр ці знайшоў іншую жанчыну, мама загуляла, і дзіця стала ёй непатрэбным...

Тым не менш выхаванцы школы-інтэрната вельмі востра ўспрымаюць крытыку ці, не дай Бог, знявагу ў адрас бацькоў. Гэта ідзе не столькі ад сапраўдных эмоцый, колькі ад агульнапрынятай установкі: маму трэба любіць. Педагогі не імкнуцца разбураць дзіцячыя ілюзіі. Аднак падчас сур'ёзнай выхаваўчай гутаркі могуць адкрыта спытаць у юнага парушальніка дысцыпліны: няўжо ты хацеў бы пайсці па шляху сваіх бацькоў?.. Ніхто з дзяцей гэтага не хоча. Аднак, сумна жартуюць педагогі, гены — не педыкулёз, іх не выведзеш.

«Моцны арэшак»

З Эрыкам, васьмігадовым выхаванцам школы-інтэрната, я пазнаёмілася асабіста. Пакуль мы з Наталляй Уладзіміраўнай размаўлялі, ён двойчы забягаў у кабінет (дзверы ў дырэктара заўсёды адчыненыя), падыходзіў да стала і ўважліва мяне разглядаў.

Эрык — асобная гісторыя, «моцны арэшак» для ўсяго педкалектыву. Ён жыве выключна па сваіх правілах і па сваіх, нікому не вядомых законах. Можа папросту сарваць першаклашкам урок, раптоўна пачаўшы крычаць ва ўвесь голас... Можа перакуліць парту, а можа падбегчы да акна і сцягнуць фіранкі разам з карнізам. А яшчэ Эрык навучыўся выклікаць у сябе насавы крывацёк. Запырскаўшы падлогу крывёю, ён учыняе сапраўдны гвалт, а калі збягаюцца дарослыя, звальвае віну на аднакласнікаў: маўляў, яны мяне б'юць.

Лепшая вучаніца Алеся СЯБЕР.

Па вызначэнні ўрачоў, у хлопчыка відавочныя праблемы з псіхікай, але інтэлект пры гэтым захаваны, таму ў спецінтэрнат для дзяцей з разумовымі адхіленнямі яго не бяруць.

— Пакуль Эрык нікога не параніў, яго нельга прызнаць сацыяльна небяспечным. Таму ён знаходзіцца тут, — тлумачыць Наталля Уладзіміраўна. — І нам даводзіцца з ім працаваць, хоць гэта вельмі складана. Калі хлопчык пачынае крычаць і перашкаджаць іншым — а гэта здараецца часта — я забіраю яго да сябе ў кабінет. Але ён і тут верашчыць так, што барабанныя перапонкі не вытрымліваюць.

У Эрыка цяжкая спадчыннасць. Калі яго маці хадзіла цяжарная, яна злоўжывала наркотыкамі. І цяпер ніякія заспакаяльныя прэпараты, нават самыя моцныя, на хлопчыка практычна не дзейнічаюць.

Любіць... насуперак

Такіх, як Эрык — невыпраўных — у школе не шмат, хоць частка дзяцей трапляе сюды пасля калоніі. Кожны з іх — гэта міна запаволенага дзеяння: ніколі не ведаеш, калі выбухне... Многія з цягам часу выроўніваюцца — дзякуючы ў асноўным доўгацярпенню і прафесійным навыкам педагогаў (у якіх свае падыходы, заснаваныя часам больш на інтуіцыі, чым на методыках і тэхналогіях). Многія, але, зразумела, не ўсе.

— Бывае, глядзіш на дзяцей — складаных, яршыстых, праблемных — і думаеш аб тым, праз якія выпрабаванні ім давялося прайсці!.. Не кожны дарослы змог бы такое вынесці. Пры гэтым яны ўсё ж застаюцца дзецьмі — замкнёнымі, зацікнутымі, запалоханымі, часта азлобленымі. Але разам з тым здольнымі мяняцца, адтаваць, цягнуцца да нармальнага жыцця, — кажа Наталля Шарапава.

З кожным «новенькім» яна абавязкова знаёміцца асабіста. Запрашае да сябе ў кабінет для размовы. Характарыстыку з апошняга месца знаходжання загадзя не чытае — прынцыпова. «Ведаеш, — кажа навічку, — усё, што адбывалася з табой да сённяшняга дня, мяне не цікавіць. Мы з табой пачнём жыццё з чыстага аркуша. Лічы, што ты нарадзіўся наноў, і ўсё далейшае залежыць толькі ад цябе. Ну і крышачку ад нас».

Самае складанае для педагога — заслужыць іх давер, прымусіць паверыць, што ў гэтай установе дарослым не ўсё адно, па якой дарозе крочаць іх выхаванцы. Якім чынам? Адказ просты да банальнага: дзяцей неабходна любіць — насуперак усяму і часам нават без узаемнасці. Любіць з самага пачатку, не зважаючы на іх «генетыку», на іх не вельмі светлае мінулае, сумнеўныя сувязі і крымінальныя схільнасці.

У слова «любіць» тут укладваюцца розныя адценні і паняцці: павага, разуменне, дабрыня, патрабавальнасць... Адсутнасць абыякавасці. Душэўнае «праніканне»... Можна называць гэта па-рознаму, але настаўнікі і выхавальнікі, якія не ўмеюць любіць дзяцей, у школе-інтэрнаце № 5 не затрымліваюцца. Прыняўшы чалавека на працу, Шарапава пэўны час нават не імкнецца запамінаць яго імя. Дзесьці праз паўгода, калі новы работнік не спалохаўся нагрузак і не збег у больш спакойнае месца, яна можа з палёгкай уздыхнуць: наш чалавек...

Дырэктар школы-інтэрната № 5 Наталля ШАРАПАВА з выхаванцамі.

Установа адкрытага тыпу

А на першы погляд, школа-інтэрнат жыве звычайным, дастаткова ўпарадкаваным жыццём. У 7 гадзін раніцы пад'ём і сняданак, у 9 гадзін пачынаюцца ўрокі, у 14.30 — абед... З 17 гадзін — самападрыхтоўка. Увечары можна адпачыць, схадзіць на прагулку, паглядзець тэлевізар... Інтэрнат — на гэту акалічнасць усе мае сур'ёзныя прэтэнзіі. Але «жылплошчу» мы выдзяляем далёка не ўсім ахвотным, таму што аддзяленне разлічана ўсяго на 26 месцаў, з якіх штогод вызваляецца 12—13, — тлумачыць завуч па выхаваўчай рабоце Алена Карцава. — Перавагу аддаём тым выпускнікам, у каго найбольш складанае становішча — інакш кажучы, якім проста няма дзе жыць. Ну і, безумоўна, студэнтам вышэйшых навучальных устаноў — гэта правіла ніхто не адмяняў.

Такая «палітыка», тлумачыць Алена Рыгораўна, сябе апраўдвае. У тым сэнсе, што многім выхаванцам, якія паступаюць у ВНУ і застаюцца жыць у «аддзяленні», інтэрнат дапамагае канчаткова парваць з заганным кругам. Як, напрыклад, Кацярыне і Настассі, былым выхаванкам, а сёння ўжо студэнткам 5-га курса адной з прэстыжных ВНУ. Пасля заканчэння універсітэта Каця паедзе па размеркаванні ў Жлобін. Настасся застаецца ў Мінску — будучую настаўніцу забярэ пад сваё «крыло» аддзел адукацыі Заводскага раёна сталіцы.

— Можа, прыйдзеш працаваць да нас? — пытаецца Алена Рыгораўна.

— Не, — рашуча матае галавой Насця. — Хопіць ужо. Я і так дзесяць гадоў у інтэрнаце правяла і пяць гадоў тут...

Нармальнае, цалкам зразумелае жаданне — пачаць дарослае жыццё без аглядкі на мінулае. Хочацца верыць, што ў дзяўчат гэта атрымаецца, хоць без ранейшай падтрымкі (у аддзяленні адаптацыі працуюць псіхолаг, выхавальнік і сацыяльны педагог) першы час ім будзе цяжкавата.

Ненапісаная кніга

На змену ранейшым выхаванцам прыйдуць іншыя. Сёлета, дарэчы, зачыняецца сталічная школа-інтэрнат № 3, і частка дзяцей ужо рыхтуецца папоўніць шарэнгі падапечных Наталлі Шарапавай. Так што клопатаў у педагогаў і выхавальнікаў прыбавіцца... Шчыра кажучы, ім не прывыкаць. Не прывыкаць прыходзіць на працу ранкам, а пакідаць інтэрнат позна ўвечары. Не прывыкаць увесь час шукаць спонсараў для вырашэння «глабальных» матэрыяльных праблем і выкройваць грошы з уласнай кішэні на «дробязі» (напрыклад, на цукеркі)... Не прывыкаць выпраўджваць за дзверы нецвярозых бацькоў, адказваць на начныя званкі з міліцыі, выслухоўваць неверагодныя гісторыі, адрозніваць праўду ад хлусні, выціраць слёзы і соплі, вырашаць сотні бытавых праблем, адбівацца ад «нападак» жыхароў суседніх шматпавярховікаў... Не прывыкаць, нягледзячы на ўсё вышэйпералічанае, любіць сваіх няпростых выхаванцаў.

...Сёння дзеці разам з настаўнікамі збіраюць матэрыял для праекта пад назвай «Пра іх не напісана кніг» — пра лепшых педагогаў, якія аддалі інтэрнату шмат гадоў. Калі атрымаецца завяршыць «кнігу» праз некалькі месяцаў (якраз да 50-гадовага юбілею навучальнай установы), гэта будзе лепшым падарункам педагогам ад іх удзячных вучняў.

Наталля КАРПЕНКА.
Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ДЗІЦЯЧАЯ АБАРОНА

1 чэрвеня, у Дзень абароны дзяцей, у Магілёўскай СОС-дзіцячай вёсцы будзе свята. Дэвіз абраны актуальны — «Шчаслівыя дзеці ў клапатлівай сям'і», але ў сцэнары няма гучных пафасных прамоў пра абарону дзяцей.

— У гэты дзень усе кідаюцца аказваць увагу дзецям, але мы заўсёды просім: абараняйце дзяцей 364 дні ў год, а 1 чэрвеня давайце адпачнём з імі, — тлумачыць дырэктар СОС-дзіцячай вёскі ў Магілёве Павел Казюка.

Ружовыя міліцыянеры

На зялёным пагорку ў Пячэрску прыляпілася СОС-дзіцячая вёска. Прыгожая, добраўпарадкаваная, нават лялечная. Магілёўская СОС-вёска — трэцяя ў Беларусі, і цяпер у ёй жывуць 18 дзяцей з 5 маці.

У адміністрацыйным будынку вольна бегаюць дзеці. Дзяўчынкі ў адзенні моднага ружовага колеру круцяцца каля рабочага стала Паўла Казекі. Дырэктару малыя відавочна зусім не перашкаджаюць.

— Давайце я вас лепей пазнаёмлю, — прапаноўвае Павел. — Вось гэта Алеся, ёй 8 гадоў. Яна збіраецца быць «міністрам міліцыі». Гаворыць, што пад яе кіраўніцтвам усе міліцыянеры будуць добрымі і насіць ружовую форму. Сяброўку Алесі завуць Маша, яна таксама марыць пра міліцэйскую будучыню. Многія з выхаванцаў дзіцячых дамоў хочуць абраць прафесію, якая звязана з сілай і правам, каб была бяспека.

Алеся і Маша раней жылі ў дзіцячым доме, які месціцца непадалёк. Цяпер яны жывуць з СОС-маці ў няхай і сурагатных сем'ях, але ўсё ж набліжаных да натуральнага выхавання.

— Нам лепей тут жыць, таму што тут дамы, а там былі памяшканні, — дзяўчынкі спрабуюць патлумачыць перавагі СОС-вёскі. — Тут сям'я, а там — не. І тут лепей кормяць...

Насамрэч, кормяць амаль што аднолькава. Вось толькі карысныя стравы гатуюць СОС-маці, якія ведаюць густы сваіх выхаванцаў. Але гэта не значыць, што ім штодня падносяць чыпсы і колу. Ласункі дазваляюцца толькі раз на тыдзень. І каб наглядна патлумачыць перавагу фасолі над сасіскамі, дырэктару давялося запісаць дакументальную стужку «Асцярожна, ежа!» і паказаць яе малым.

СОС-маці Ларыса Марцінкевіч толькі што вярнулася з крамы і прыладжвае пакункі з рыбай. Жанчына дэманструе чэкі: больш за 200 тысяч каштуюць харчы, каля 70 тысяч — бытавая хімія, яшчэ адна сума — на тканіны для шыцця адзення.

— Мы звычайна набываем на тыдзень і болей, таму ў краме просім людзей, якія спяшаюцца, за намі чаргу ў касу не займаць, — усміхаецца Ларыса. — На нашы каляскі людзі глядзяць здзіўлена. А ў нас проста вялікая сям'я.

Залатая рыбка

СОС-маці Ларыса Марцінкевіч прыехала ў Магілёў з Ліды і стала першай маці ў новай СОС-вёсцы. Яна — настаўніца малодшых класаў, працавала сацыяльным педагогам і ніколі не заставалася абыякавай да дзяцей з праблемных сем'яў. Ларыса мае двух дарослых сыноў, а цяпер знайшла сабе новую справу, якая ёй па душы.

— Я не хачу гучна казаць пра вялікую любоў да дзяцей: здараецца, і яна мінае, калі пачынаюцца праблемы, — шчыра гаворыць жанчына. — Аднак мне хочацца быць патрэбнай і прыносіць ім карысць.

Сям'я Ларысы займае палову вялікага катэджа: вялікая гасцёўня запоўненая мэбляй спакойнага светлага колеру. Спальні, наадварот, па-дзіцячаму яркія. Дзіма, якому 6 гадоў, паказвае сваю залатую рыбку ў акварыуме. Ён калісьці называў Ларысу цёткай, а цяпер — мама:

— Мама Ларыса добрая, прыгожая. Корміць смачна.

Жанчына расказвае пра жыццё і розныя справы і праблемы, якімі яно напоўненае. Як малым падабаецца жыць у дзіцячай вёсцы, але старэйшыя дзеці ўсё ж часам пакутуюць на ўспаміны пра ранейшае жыццё. Адзін з хлопчыкаў, напрыклад, родам з Асіповічаў і яго кранае ўсё, што датычыцца гэтага горада — ад выступлення асіповіцкіх музыкаў на канцэрце да назвы цягніка. Прычым успаміны пра сям'ю, як бы там ні было, самыя лепшыя: хлопчык любіць тату, які адноўчы прыязджаў да яго ў дзіцячы дом і прывёз ласункі...

— Мы не абмяркоўваем падзеі мінулага, але часам дзеці самі іх згадваюць, калі бачаць падобнае ў жыцці альбо ў кіно, — тлумачыць Ларыса. — Яны раскрываюцца, і гэта добра. Напрыклад, былі праблемы з уборкай. Я тлумачыла, што трэба прыбірацца. Няўжо каму-небудзь падабаецца жыць у брудзе? І хлопчык мне кажа, што яго маці, здаралася, пакідала дзяцей адных на некалькі дзён, і было вельмі брудна... Гэтыя дзеці не па ўзросце дарослыя. Часам такія думкі выказваюць, што падаюцца мне маленькімі старымі.

А ўвогуле Ларыса называе сваю сям'ю звычайнай. Дзеці ходзяць у гарадскую школу, маці дапамагае рабіць урокі. Вось толькі ўвечары, пасля ўсіх клопатаў бурнага дня дзеці разам з Ларысай збіраюцца разам, каб хвілінку памаўчаць і падумаць, каб сапраўдным бацькам малых дапамог Бог.

— Мінулае нельга закрэсліць, — гаворыць мудрая маці. — Так, з ім трэба жыць, але такім чынам, каб яно нагадвала, што трэба рабіць у будучыні, каб жыццё было шчаслівым.

Дзень дзяцей

У СОС-вёсцы чакаюць 1 чэрвеня. Прагнуць пачатку лета, волі і адпачынку.

На свята да дзяцей прыедзе спецыяльны аўтобус для вясёлых гульняў, а дарослых педагогі і выхавацелі заклікаюць павярнуцца да ўласных дзяцей.

— Мы чым занятыя па жыцці? Зарабляем грошы, — пытаецца і тут жа адказвае Павел Казюка. — Пакуль у нас шалёны рытм жыцця, дзеці гадуюцца самі па сабе. Таму прапаную 1 чэрвеня не спяшацца абараняць усіх дзяцей, а павярнуцца да сваёй сям'і і паглядзець, што вы можаце зрабіць для ўласнага дзіцяці. Гэта не прыняце гучнага піяру, але будзе душэўна.

Безумоўна, дзеці маюць патрэбу ў абароне, лічаць СОС-маці: і ад гневу дарослых, і часам ад самых сябе. Але рабіць гэта трэба штодня, а не чакаць сімвалічных дзён.

Па гэтым законе СОС-дзіцячая вёска ў Магілёве жыве і развіваецца. Тут з'явіўся сацыяльны педагог і майстар па эксплуатацыі, шукаюць на сталую працу псіхолага і педагога. Таксама працуе сацыяльны цэнтр для жанчын, якія трапілі ў крызісную сітуацыю.

Дапамагаюць супрацоўнікам і валанцёры. Напрыклад, Павел Казека расказаў пра 18-гадовую дзяўчыну з цалкам добрай сям'і, якая часта прыязджае да дзяцей, з якімі пазнаёмілася яшчэ ў дзіцячым доме, і запрашае іх да сябе на вакацыі. Свет не без добрых людзей.

Усе дзеці СОС-вёскі — з Магілёўскай вобласці: 3 гады самаму малодшаму і 11 гадоў — старэйшай дзяўчынцы. Браты і сёстры жывуць у адной сям'і.

Дырэктар Павел Казека падкрэслівае, што сістэма СОС-вёскі больш падобная на сямейную форму выхавання: дзеці гадуюцца не ў замкнёнай рэзервацыі, а ў сацыяльным асяродку, грамадстве. І гэта абавязкова адаб'ецца на лепшай будучыні СОС-выхаванцаў.

Ілона ІВАНОВА.

«БУДЫНАК ШКОЛЫ Ў ДОБРЫМ СТАНЕ, ЯГО САПРАЎДЫ ШКАДА, АЛЕ... ІНШАГА ВЫЙСЦЯ НЯМА»

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

Увёсцы Куршынавічы Ляхавіцкага раёна зачыняюць сярэднюю агульнаадукацыйную школу. І гэта хутчэй канстатацыя факта, чым яго абмеркаванне ці абскарджанне. Як падалося, цудоўна разумеюць гэта і нашы заяўнікі, што звярнуліся на рэдакцыйную «гарачую лінію». Хоць летась жыхарам вёскі і ўдалося на год адстаяць навучальную ўстанову: тады вяскоўцы дайшлі нават да Адміністрацыі Прэзідэнта. Чаму ж няма сёлета той ранейшай упэўненасці? Справа ў тым, што вучыцца ў школе крыху больш за два дзясяткі дзяцей, і наўрад ці ў бліжэйшыя гады іх істотна паболее. Тады што ж прымусіла людзей звярнуцца ў газету? Хваляванні адносна далейшага лёсу будынка навучальнай установы.

— Гадоў з дзесяць таму ў нас ужо зачынілі цудоўны двухпавярховы дзіцячы садзік з басейнам. Будынак таксама быў не надта стары, але пакуль шукалі, як яго выкарыстоўваць — ён пачаў рассыпацца. Мы баімся, што нешта падобнае можа здарыцца і з зачыненай школай. Шкада, добры ж яшчэ будынак. Мы вось ад імя жыхароў вёскі прапаноўвалі ўладам зрабіць потым тут, напрыклад, базавую школу-сад. Можна было б прыстасаваць будынак пад краязнаўчы музей або турыстычную базу. А яшчэ лепш было б на базе колішняй школы разгарнуць сацыяльны прытулак для пажылых людзей. Аднак у адказ мы толькі і чуем, што, маўляў, грошай няма, — даводзілі нам сутнасць сваіх прапаноў заяўнікі.

Пракаментаваць сітуацыю мы папрасілі **начальніка аддзела адукацыі Ляхавіцкага райвыканкама Святлану ЮРЛЕВІЧ**. Суразмоўца, хоць у тым не было асаблівай патрэбы (вяскоўцы самі цудоўна ведаюць сітуацыю з колькасцю вучняў у школе зараз), вырашыла пачаць адказ менавіта з перспектыў навучальнай установы ў Куршынавічах.

— Будынку — 30 гадоў, ён быў пабудаваны ў 1980 годзе. Школа разлічана на 320 месцаў. Сёння ж там займаюцца толькі 24 вучні. Гэты паказчык склаўся за апошнія пяць гадоў. Прагноз на бліжэйшыя тры гады (пры ўмове, што ніхто з вёскі не з'едзе) — 17 вучняў. У 2014 годзе ў сярэдняй школе могуць займацца толькі 14 дзетак, — распачала Святлана Іванаўна. — На ўтрыманне будынка на гэты год было выдаткавана 323 мільёны рублёў. Толькі на аплату камунальных паслуг (святло, вада, ацяпленне) з гэтай сумы прыпадае 55 мільёнаў рублёў. У школе працуюць 15 педагогаў і 9 тэхнічных работнікаў. За год на выплату зарплаты ім ідзе 250 мільёнаў рублёў. Зыходзячы з усяго гэтага, як вам правільна сказалі заяўнікі, летась мы вывучалі мэтазгоднасць закрыцця шасці ўстаноў адукацыі, у тым ліку і Куршанавіцкай сярэдняй агульнаадукацыйнай школы.

Так, сам будынак школы ў добрым стане і яго сапраўды шкада. Асабліва на прыкладзе, як зноў жа правільна заўважылі заяўнікі, дзіцячага садка побач. Паводле слоў Святланы Юрлевіч, доўгі час на яго не знаходзілася пакупнікоў, пакуль у рэшце рэшт садок усё ж прадалі...

— Мы разумеем усю складанасць сітуацыі не горш за бацькоў вучняў. Ужо летась мы разглядалі магчымасць выкарыстання будынка ў выпадку закрыцця школы. Мы і сёлета прапануем адчыніць зноў жа або ЛТП, або сацыяльны прытулак для пажылых людзей. Сродкі спатрэбяцца не толькі на ўтрыманне самога будынка, але і на тэхнічную рэарганізацыю (закупку неабходнага абсталявання, рыштунку). З іншага боку, калі ўзяць той жа варыянт адкрыцця сацыяльнага прытулку для пажылых людзей, дык ён, як паказвае вопыт, найчасцей бывае запатрабаваным толькі ўвосень і зімой. Бачыце, зноў праблемы, — тлумачыла далей Святлана Іванаўна.

...Сёлета пытанне наконт школы ў Куршынавічах знаходзіцца ў стане разгляду ў Ляхавіцкім райвыканкаме і Брэсцкім аблвыканкаме, дадала напрыканцы начальнік аддзела адукацыі...

Сяргей РАСОЛЬКА.

Пытальнік

«Асфальтаванне Сацыялістычнага лічым пакуль заўчасным...»

Просім вашай дапамогі ў добраўпарадкаванні нашага завулка Сацыялістычнага, паколькі ў цяперашні момант там склаліся невыносныя абставіны. Праезная частка ўся запоўненая пясчанай масай так, што немагчыма праехаць грузавой машыне, а легкавой сюды ўвогуле лепш не накіроўвацца. Пешаходных дарожак няма, ходзім, дзе атрымаецца. А гэта ж цэнтральны накірунак, па якім ідуць у школу дзеці, увесь мікрараён ходзіць на прыём у паліклініку, у гэты ж бок трэба ісці, каб патрапіць у крамы. Шмат гадоў таму часткова паклалі бардзюры, планавалася добраўпарадкаванне нашага завулка, але ўсё рэзка абарвалася і нічога не было зроблена. Шмат разоў звярталіся вусна і пісьмова ў наш выканкам з набалелай праблемай. Нам таксама вусна і праз раённую газету адказвалі, што пакуль няма сродкаў, заплануем добраўпарадкаванне ў наступным годзе. Такіх наступных гадоў прайшло больш за 10. Зімой па нашым завулку цячэ вада і замярзае, можна катацца на каньках. А ў астатні час задыхаемся ад пяску і пылу, пакутуем ад бязводдзя, хоць тут у кожнага жыхара пракладзены водаправод.

Жыхары завулка Якімава, Ключнік, Жыбуль, Бычко, Немец, Аганаў (усяго 16 подпісаў), *г. Стоўбцы*

Да калектыўнага ліста заяўнікаў былі прыкладзены чатыры фотаздымкі праезнай часткі завулка. На жаль, іх якасць не дазваляе надрукаваць хоць бы адзін на старонках газеты, аднак, можаце паверыць, у пэўнай ступені яны пацвярджаюць словы жыхароў адносна сваёй бяды: нават увесну пры сухім пяску відавочна, якой сур'ёзнай перашкодай ён з'яўляецца і для пешаходаў, і для машын. Можна толькі ўявіць сабе, што робіцца тут пасля непагадзі...

Даць адказ на запыт заяўнікаў, што пражываюць па вышэйназваным адрасе (або проста мусяць ездзіць ці хадзіць па завулку Сацыялістычным) мы папрасілі Стаўбцоўскі райвыканкам. Вось што паведамілі адтуль.

«Зараз у г. Стоўбцы вядзецца завяршэнне распрацоўкі плана дэталёвай планіроўкі мікрараёна №7, будаўніцтва шматпавярховых дамоў, прылеглых да завулка Сацыялістычны. Праведзенымі пошукавымі работамі ўстаноўлена, што прапускная здольнасць сетак каналізацыі, што маюцца на завулку, не дазволіць прапусціць гаспадарча-бытавыя і ліўневыя сцёкі з мікрараёна №7 і спатрэбіцца будаўніцтва над праезнай часткай завулка Сацыялістычны дадатковых інжынерных камунікацый. У сувязі з выкладзеным правядзенне работ па асфальтаванні завулка на гэты момант з'яўляецца заўчасным. Існуючае пакрыццё завулка Сацыялістычны рэгулярна (раз у месяц) прафілюе аўтагрэйдар, які маецца на балансе ў РУП «Стаўбцоўскае АКБ».

Вядома, у гэтых словах ёсць пэўная, найперш эканамічная, мэтазгоднасць. Гэта калі разважаць увогуле. Калі закрануць прыватныя моманты, кідаюцца ў вочы два факты. Першы: калі верыць на слова заяўнікам, належнага добраўпарадкавання жыхары завулка не могуць дачакацца ўжо гадоў дзесяць. Другі: у свежым адказе з райвыканкама няма ні слова пра любыя тэрміны — ці то завяршэння памянёнай распрацоўкі плана будаўніцтва, ці то самога будаўніцтва, ці то пракладкі інжынерных камунікацый... А людзям жа ў такіх умовах, якія іх не задавальняюць, трэба жыць. І колькі так жыць — невядома.

Здарэнне

ПАТАНУЎ ВЫПУСКНІК

Выпускнік віцебскай школы № 30, які святкаваў апошні званок у кампаніі, падчас купання ў штучным вадаёме ў Віцебскім раёне патануў.

Як паведаміла «Звяздзе» прэс-сакратар Віцебскага абласнога ўпраўлення па надзвычайных сітуацыях Марына Фандо, глыбіня кар'ера, дзе раней здабывалі даламіт, да 20 метраў. Выратавальнікі прыехалі па выкліку сяброў хлопца. Паводле іх слоў, яны ўвечары ўжывалі спіртное, бо святкавалі апошні званок. Спробы самастойна выратаваць таварыша аказаліся няўдалымі. Цела патанулага пакуль не знойдзена.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

АГОНЬ ЗЛІЗАЎ СТАРЫЯ ПАБУДОВЫ

У Брэсце па вуліцы Савецкіх Пагранічнікаў, у самым цэнтры горада, загарэўся стары хлеў. Агонь хуценька ахапіў іншыя суседнія аналагічныя пабудовы і распаўсюдзіўся на ўсю чараду хлявоў прыватнага сектара.

Некалькі падраздзяленняў МНС больш за гадзіну ўтаймоўвалі полымя. Хлявы, што ўзводзіліся на пачатку 50-гадоў для захавання палівa, даўно прыйшлі ў крытычны, з пункту гледжання пажарнай бяспекі, стан, і камунальныя службы ўздымалі пытанне аб зносе пабудоў. Але многія з іх былі прыватызаваныя, і гараджане захоўвалі там рознае — ад старой мэблі і бытавой тэхнікі да каністраў з бензінам. Вось і пайшло ўсё з дымам. Добра, што без ахвяраў. А ўладам давядзецца вярнуцца да пытання аб ліквідацыі пажаранебяспечных пабудоў, бо гэта ўжо трэці падобны пажар у горадзе за апошні месяц.

Яна СВЕТАВА.

ГАЛОЎНАЕ — ВЫЙСЦІ З КВАТЭРЫ

У Беларусі будзе распрацавана новая праграма па стварэнні безбар'ернага асяродку

З 2006 года ўдзельная вага аб'ектаў сацыяльнай інфраструктуры, прыстасаваных для карыстання інвалідамі і іншымі асобамі са слабым здароўем, павялічылася ў сярэднім па краіне з 19,9 да 35 працэнтаў. Прычым гэты паказчык можа ўзрасці да 50 працэнтаў ужо сёлета.

Адна з галоўных праблем людзей з абмежаванымі магчымасцямі — транспарт. У сувязі з гэтым, паведаміў начальнік упраўлення дзяржаўнай сацыяльнай падтрымкі насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Іван Нагібін, з 2007 года рэгіёны набылі і паставілі «на лінію» 1590 аўтобусаў, тралейбусаў і трамваяў са зручнай нізкай падлогай — амаль у 1,9 раза больш, чым планавалася цяперашняй праграмай па стварэнні безбар'ернага асяродку. Не менш адметныя моманты — пачатак вытворчасці пасажырскіх вагонаў, спецыяльна абсталяваных для перавозкі інвалідаў-калясачнікаў, устаноўка сістэм аўтаматычнага адкрыцця дзвярэй крамаў і вакзалаў, устаноўка дарожных знакаў і святлафораў з святлодыёднымі крыніцамі святла, пераабсталяванне дарог і тратуараў з улікам магчымасцяў з'езду на калясках, прадстаўленне візуальнай інфармацыі аб руху транспарту. Прычым, напрыклад, у сталічным метрапалітэне найбліжэйшым часам ёсць намер устанавіць спецыяльныя вертыкальна-гарызантальныя ліфты — на станцыях, якія былі ўведзены ў эксплуатацыю яшчэ ў 1984 годзе.

Нарэшце, працягваецца ўстаноўка пандусаў і парэнчаў пры ўваходзе ў будынкі, робіцца пашырэнне праёмаў дзвярэй, абсталяванне зручных санвузлоў і ліфтаў. Увогуле планавалася, што да канца гэтага года безбар'ерныя ўмовы будуць створаныя ў 5104 будынках, насамрэч жа да пачатку года такіх будынкаў аказалася 6715. Прычым перш-наперш гаворка пра такія па-сапраўднаму патрэбныя большасці людзей аб'екты, як установы аховы здароўя, адукацыі, культуры, сацыяльнай абароны, сувязі, пункты грамадскага харчавання, крамы, банкі, выканкамы. І разам з тым тут узнікае першая праблема — якасць падобных работ. Не сакрэт, што многія з тых жа пандусаў маюць ухіл, пераадолець які цяжка нават целкам здаровому чалавеку.

І ўсё ж, паводле слоў міністра працы і сацыяльнай абароны Марыяны Шчоткінай, яшчэ больш вострай застаецца тэма будаўніцтва. Людзей з абмежаванымі магчымасцямі на нашых вуліцах няшмат па вельмі простай прычыне — часта яны не могуць пакінуць свой дом. Можна пагадзіцца, што больш чым палову жыллёвага фонду (як правіла, гаворка пра старыя дамы) прыстасаваць для інвалідаў і людзей са слабым здароўем немагчыма тэхнічна — з-за вузкіх праектных праёмаў дзвярэй і вузкіх лесвіц. Аднак горш іншае: стандартам часам не адпавядаюць і целкам новыя дамы.

Вядома, у нечым пытанні можна зняць дзякуючы вытворчасці больш вузкіх крэсла-калясак. Ужо сёлета Беларускі пратэзна-артапедычны аднаўленчы цэнтр мае намер зменшыць мінімальную шырыню каляскі з 58 да 56 сантыметраў. Аднак само па сабе гэта вырашэнне толькі частковае — скажам, для падлеткаў ці людзей з невялікай камплекцыяй. Каляскі для людзей з большымі «габарытамі» ў стандартны 60-сантыметровы ліфт усё роўна не ўвойдуць. А адсюль — неабходнасць змянення падыходаў да праектавання і будаўніцтва. Тым больш што пакуль фактычна не спрацоўвае і альтэрнатыўны шлях — перасяленне інвалідаў і людзей са слабым здароўем у жылыя памяшканні на першых паверхах. Каб падобная практыка стала распаўсюджанай, трэба мець спецыяльныя дамы. Сёння, заўважыла міністр, такіх дамоў па сутнасці няма.

Між тым у краіне ўжо пачалася інвентарызацыя будынкаў і збудаванняў, якія неабходна прыстасаваць для інвалідаў і аслабленых людзей. Па выніках інвентарызацыі стане зразумелым — на якой колькасці аб'ектаў спатрэбіцца пераабсталяванне і колькі яно будзе каштаваць. Прычым абследаванні павінны стаць адным з галоўных «выходных пунктаў» для распрацоўкі новай дзяржаўнай праграмы стварэння безбар'ернага асяродку на 2011—2015 гады. Работа над праграмай вядзецца цяпер, і, на думку Марыяны Шчоткінай, галоўнае тут — пазбегнуць фармальных падыходаў. Інваліды і людзі са слабым здароўем павінны мець магчымасць на справе карыстацца інфраструктурай, і ў прыватнасці, размова аб транспарце, сацыяльных аб'ектах, жыллі. Да слова, у тых жа дамах, якія не падлягаюць пераабсталяванню, існуе магчымасць альтэрнатывы — устаноўкі пад'ёмнікаў. Іх вытворчасць ужо наладжваецца ў Беларусі.

Дарэчы, адзначаюць у міністэрстве, новая праграма безбар'ернага асяродку фактычна мае дачыненне да кожнага трэцяга жыхара нашай краіны — 507 тыс. інвалідаў, 307 тыс. дзяцей ва ўзросце да 3 гадоў, 122 тыс. дзяцей-інвалідаў ва ўзросце да 18 гадоў, а таксама 2,4 млн пенсіянераў.

Сяргей ГРЫБ.

АПЕРАЦЫЯ «ЧЫСТАЕ ПАВЕТРА» ПРОЙДЗЕ Ў МІНСКУ З 1 ПА 30 ЧЭРВЕНЯ

Пра гэта карэспандэнту «Звязды» паведамілі ва ўпраўленні ДАІ ГУУС Мінгарвыканкама.

На працягу месяца сталічная Дзяржаўтаінспекцыя разам з работнікамі Мінскага гарадскога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя будуць правяраць аўтатранспарт на таксічнасць і на дымнасць выхлапных газаў. Плануецца арганізаваць 9 перасоўных пастоў. Транспартныя сродкі, якія не будуць адпавядаць вызначаным нарматывам, забароняць эксплуатаваць. Больш за тое, за кіраванне аўтамабілямі з неадрэгуляванымі рухавікамі аўтаўладальнікам пагражае папярэджанне ці штраф у памеры да пяці базавых велічыняў. Пры вынясенні пакарання, паводле слоў інспектара аддзела агітацыі і прапаганды сталічнай ДАІ Ліліі ГЛІНСКАЙ, інспектар будзе ўлічваць стан транспартнага сродку, год яго выпуску, а таксама працэнт перавышэння шкодных рэчываў у выхідах рухавіка. Да ведама, гранічная канцэнтрацыя вокісу вугляроду ў выхлапных газах бензінавых рухавікоў не павінна перавышаць 1,5 працэнта. Нарматыў для дызельных рухавікоў без турбанадзімання — да 60 працэнтаў, з турбанадзіманнем — да 70 працэнтаў.

У межах экалагічнай апэрацыі будуць таксама ладзіцца праверкі аўтатранспартных прадпрыемстваў і станцый тэхнічнага абслугоўвання аўтатранспарту.

Надзея ДРЫЛА.

На дарозе

АЎТАДАМІНО Ў ВЫКАНАННІ ПАДЛЕТКА

Уначы ў Мазыры мікрааўтобус «Фальксваген Т-4» пратараніў 3 аўтамабілі, якія былі прыпаркаваныя ўздоўж дарогі. За рулём машыны быў 16-гадовы падлетак.

Вучань аднаго з мазырскіх ПТВ тайна ад бацькоў узяў ключы ад аўто і праехаўся па вуліцы Інтэрнацыянальнай. На закругленні дарогі, не знізіўшы хуткасці, ён спачатку зачапіў «Запарожац», які ў сваю чаргу знёс «Аўдзі-100», якая добра кранула «Аўдзі-80». Спрацаваў прынцып «даміно». У выніку дарожна-транспартнага здарэння разлілося паліва, і супрацоўнікі МНС, каб пазбегнуць узгарання, на ўсякі выпадак залілі пашкоджаныя аўтамабілі пенай. Няўдалага кіроўцу даставілі з машыны нават без траўмаў, а вось усе машыны атрымалі значныя механічныя пашкоджанні. Страты ўладальнікам аўто давядзецца кампенсаваць маці віноўніка ДТЗ, на якую зарэгістраваны «Фальксваген».

У ДАІ УУС Гомельскага аблвыканкама гавораць, што за май 2010 года ў вобласці адбылося ў 3 разы больш аварый з удзелам дзяцей, чым за той жа месяц летась. Лета толькі пачынаецца, і дарослым трэба падумаць, як энергію дзяцей накіраваць у «мірнае» рэчышча: каб пошукі рамантыкі і адрэналіну не прывялі да трагедыі.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ТРАКТАРЫСТА ВЫРАЗАЛІ З КАБІНЫ

Каля вёскі Крыўчыцы Пінскага раёна 50-гадовы механізатар утрамбоўваў сняжок на трактары К-700. Але ў нейкі момант не справіўся з кіраваннем, і магутная машына перавярнулася. Вызваліць чалавека з пакарабачанай кабіны самі вяскоўцы не змаглі. Падраздзяленне хуткага рэагавання МНС справілася з задачай толькі з дапамогай спецыяльнай тэхнікі. Спачатку трактар павярнулі на бок. А затым трактарыста літаральна выразалі з таго, што засталося ад кабіны. Чалавек дастаўлены ў бальніцу. Як сказаў карэспандэнту газеты кіраўнік прэс-службы Брэсцкага абласнога ўпраўлення МНС Сяргей Машноў, пінскі трактарыст у кашулі нарадзіўся. Для такога выпадку ён атрымаў адносна лёгкія траўмы, якія не пагражаюць жыццю.

Яна СВЕТАВА.

Творы і аўтары

«ВЫБРАНЫ І ЎПАЎНАВАЖАНЫ НАРОДАМ»

Так называецца эксклюзіўная кніга на беларускай мове прэзідэнта Туркменістана Гурбангулы Бердымухамедава. Яе прэзентацыя днямі адбылася ў Мінску ў начным клубе «Брадвей».

Прэзентацыя, праўда, прайшла ў вячэрні час і была прымеркаваная да адкрыцця ў беларускай сталіцы мясцовага культурна-асветнага фонду «Бахар», што ў перакладзе з туркменскай мовы азначае вясна. Фонд створаны прадстаўнікамі туркменскай дыяспары ў Беларусі для садзейнічання збліжэнню двух народаў, узаемаўзбагачэння іх культур, паглыблення супрацоўніцтва ў розных сферах, у тым ліку і ў эканамічнай. І сваю высакародную дзейнасць фонд пачаў з прэзентацыі кнігі туркменскага лідара.

У ёй, у прыватнасці, ён аддае даніну павагі туркменскай духоўнай спадчыне, багатаму гістарычнаму мінуламу свайго народа, акрэслівае планы развіцця краіны на найблізейшую і далёкую перспектыву, гаворыць пра маштабныя праекты, якія зменяць да лепшага жыццё туркменаў. У рэалізацыі гэтых велічных планаў, будзем спадзявацца, не апошнюю ролю адыграе паглыбленне эканамічнага супрацоўніцтва з Беларуссю. У час візіту ў нашу краіну ў студзені г.г. прэзідэнт Туркменістана выказаўся на карысць наданя беларуска-туркменскім адносінам сістэмнага характару. Між іншым, у Туркменістане цікавяцца нашымі трактарамі, аўтамабілямі, дарожнай тэхнікай. Выкананы кантракт на пастаўку 1500 «Беларусаў». 120 туркменскіх студэнтаў вучацца ў профільных беларускіх ВНУ, пасля заканчэння якіх будуць працаваць на комплексе па вытворчасці калійных угнаенняў. У будучыні мяркуецца значна павялічыць колькасць туркменскіх студэнтаў у Беларусі.

Некалькі слоў аб аўтары кнігі. Гурбангулы Мялікгулыявіч Бердымухамедаў нарадзіўся ў 1957 годзе ў сяле Бабараб Ашхабадскай вобласці Туркменіі. У 1979 годзе скончыў стаматалагічны факультэт Туркменскага медыцынскага інстытута, а ў 1990 годзе — аспірантуру. Кандыдат медыцынскіх навук. Працоўны шлях пачаў у 1979 годзе стаматолагам у паліклініцы Ашхабада. Будучы прэзідэнт Туркменіі працаваў стаматолагам у сельскай амбулаторыі...

У 1997 годзе быў вылучаны на пасаду міністра аховы здароўя і медыцынскай прамысловасці Туркменістана. З 2001 года працаваў намеснікам старшыні Кабінета міністраў. У 2007 годзе Гурбангулы Бердымухамедаў абраны прэзідэнтам Туркменістана. Нягледзячы на вялікую занятасць, знайшоў час для стварэння кнігі.

Гэта, дарэчы, не першая кніга прэзідэнта туркменскай дзяржавы, якая была прапанавана ўвазе беларускай грамадскасці. Нагадаем, некалькі гадоў таму ў памяшканні Беларускага таварыства дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі адбылася прэзентацыя кнігі першага туркменскага прэзідэнта Сапармурата Ніязава «Рухнама». Яго суайчыннікі яшчэ называлі «Вялікім Туркменбашы», «Вялікі Сардарам», што значыць правадыр.

Кніга Сапармурата Ніязава таксама была перакладзена на беларускую мову і прысвячалася слаўнай гісторыі туркменскага народа, сённяшняму дню дзяржавы. «Рухнама» ў поўным сэнсе слова стала настольнай кнігай усіх туркменаў, яе вывучалі ў школах, вышэйшых навучальных установах. «Рухнаму» перакладзі на многія замежныя мовы. Трэба сказаць, што ў Туркменістане з вялікай павагай ставяцца да твораў сваіх лідараў. Сапармурат Ніязаў кіраваў краінай на працягу 15 гадоў. Пасля яго раптоўнай смерці была выдадзеная кніга запаветаў Туркменбашы, якую так і назвалі «Мае запаветы». У кнігу ўвайшлі вытрымкі са шматлікіх выступленняў і артыкулаў Туркменбашы, а таксама фрагменты з яго гісторыка-філасофскіх прац і паэтычных твораў.

Цяпер грамадскасць нашай краіны мае магчымасць на беларускай мове пазнаёміцца з кнігай прэзідэнта Туркменістана Гурбангулы Бердымухамедава. «Выбраны і ўпаўнаважаны народам» таксама перакладзена на замежныя мовы, яе прэзентацыя прайшла ў многіх краінах, у тым ліку Вялікабрытаніі, Галандыі, Расіі.

Леанід ЛАХМАНЕНКА.

Панская сядзіба пераўтворыцца ў гатэль

Даць другое жыццё сядзібе Бышэўскага ў пасёлку Лынтупы Пастаўскага раёна, пабудаванай у XIX стагоддзі, пажадаў расійскі інвестар.

Як адзначыў старшыня Пастаўскага райвыканкама Віктар Гутараў, у былым панскім палацы інвестар хоча адкрыць гатэль і займацца прыёмам турыстаў. Па папярэдніх падліках, для гэтага плануецца ўкласці ў аднаўленчыя і іншыя работы каля 1,5 мільёна долараў. У сядзібе-гатэлі змогуць спыніцца тыя, хто прыедзе ў раён на паляванне, адпачынак. Гэтая былая панская сядзіба — адна з дзевяці на тэрыторыі Віцебскай вобласці, якія вызначаны для прыцягнення інвестараў, якія хочуць займацца арганізацыяй турызму.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

У Гродзенскім аграрным універсітэце створаны апякунскі савет

Такое рашэнне прынята на апошняй сустрэчы з выпускнікамі розных гадоў. На думку **рэктара ўніверсітэта Вітольда ПЕСЦІСА**, апякунскі савет будзе садзейнічаць вырашэнню надзённых задач — умацаванню навукова-тэхнічнай базы і кадравага, навукоўага патэнцыялу, укараненню інавацый.

У наступным годзе Гродзенскі сельскагаспадарчы інстытут, а цяпер аграрны ўніверсітэт, адзначыць сваё 60-годдзе. За гэты перыяд ён падрыхтаваў больш за 26 тысяч спецыялістаў, сярод якіх: кожны трэці на сёння — Герой Рэспублікі Беларусь, 8 Герояў Сацыялістычнай Працы, 5 лаўрэатаў Дзяржаўных прэмій СССР, 35 кавалераў ордэна Леніна, 28 дактароў навук.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Минский городской центр недвижимости

УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»
(организатор аукциона) 02 июля 2010 года

ПОВТОРНО ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже принадлежащего ОАО «Крион» (продавец) здания специализированного животноводства (здание коровника) с инв. номером 620/С-24926 общей площадью 1847,1 кв. м, расположенного по адресу: Республика Беларусь, Минская обл., Дзержинский р-н, Негорельский п/с, около дер. Павловщина. Площадь земельного участка 0,9550 га, инв. номер 622200000001000887.

Начальная цена – 165 628 000 белорусских рублей без учета НДС.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона; заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; а также иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток в размере 16 000 000 белорусских рублей перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, код 153001331, УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за объект продажи. Процедура проведения торгов установлена порядком проведения аукциона.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем аукциона подписывается в течение 10 календарных дней с даты проведения аукциона. Оплата объекта продажи осуществляется в течение 20 календарных дней с даты проведения аукциона. Аукцион состоится **02 июля 2010 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 01.06.2010 по 30.06.2010 в рабочие дни с 09.00 до 18.00 (в пятницу – до 16.45)** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:
(017) 227 48 36 – УП «Минский городской центр недвижимости» (ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск);
(017) 275 22 81 – ОАО «Крион» (ул. Серова, 8, 220024, г. Минск).

Сайт в интернете: www.mgcn.by

Предложение о покупке акций

Ашмян Михаил Леонидович (первый заместитель генерального директора ОАО «Минскпромстрой»), проживающий по адресу: г. Минск, Старовиленский тракт, д. 67, кв. 22 (контактный тел. 283 16 26) извещает акционеров открытого акционерного общества «Минскпромстрой» о своем намерении приобрести акции ОАО «Минскпромстрой».

Условия предложения:
Эмитент акций: Открытое акционерное общество «Минскпромстрой».
Юридический и почтовый адрес эмитента: 220034, г. Минск, пер. Войсковый, д. 12.
Количество акций: 2 973 (две тысячи девятьсот семьдесят три) простые обыкновенные акции.
Минимальная цена покупки: 2550 (две тысячи пятьсот пятьдесят) белорусских рублей за одну акцию.
Максимальная цена покупки: 2580 (две тысячи пятьсот восемьдесят) белорусских рублей за одну акцию.
Сделки купли-продажи акций будут совершаться на биржевых торгах в системе открытого акционерного общества «Белорусская валютно-фондовая биржа».
Форма, порядок и сроки оплаты акций: денежными средствами в белорусских рублях путем безналичного перечисления через расчетно-клиринговую систему открытого акционерного общества «Белорусская валютно-фондовая биржа» в день заключения сделки.
Дата начала покупки акций 7 июня 2010 г.
Дата окончания покупки акций 14 июня 2010 г.
01.06.2010 г. _____ (Ашмян М.Л.)

Предложение о покупке акций

Бадуева Нина Николаевна (председатель Наблюдательного совета ОАО «Минскпромстрой»), проживающая по адресу: г. Минск, ул. Ленина, д. 4, кв. 56 (контактный тел. 284 45 29) извещает акционеров открытого акционерного общества «Минскпромстрой» о своем намерении приобрести акции ОАО «Минскпромстрой».

Условия предложения:
Эмитент акций: Открытое акционерное общество «Минскпромстрой».
Юридический и почтовый адрес эмитента: 220034, г. Минск, пер. Войсковый, д. 12.
Количество акций: 1 300 (одна тысяча триста) простых обыкновенных акций.
Минимальная цена покупки: 2550 (две тысячи пятьсот пятьдесят) белорусских рублей за одну акцию.
Максимальная цена покупки: 2580 (две тысячи пятьсот восемьдесят) белорусских рублей за одну акцию.
Сделки купли-продажи акций будут совершаться на биржевых торгах в системе открытого акционерного общества «Белорусская валютно-фондовая биржа».
Форма, порядок и сроки оплаты акций: денежными средствами в белорусских рублях путем безналичного перечисления через расчетно-клиринговую систему открытого акционерного общества «Белорусская валютно-фондовая биржа» в день заключения сделки.
Дата начала покупки акций 7 июня 2010 г.
Дата окончания покупки акций 14 июня 2010 г.
01.06.2010 г. _____ (Бадуева Н.Н.)

Предложение о покупке акций

Калашникова Ирина Юрьевна (заместитель генерального директора по финансам ОАО «Минскпромстрой»), проживающая по адресу: г. Минск, ул. Тимошенко, д. 8, кв. 113 (контактный тел. 210 18 72) извещает акционеров открытого акционерного общества «Минскпромстрой» о своем намерении приобрести акции ОАО «Минскпромстрой».

Условия предложения:
Эмитент акций: Открытое акционерное общество «Минскпромстрой».
Юридический и почтовый адрес эмитента: 220034, г. Минск, пер. Войсковый, д. 12.
Количество акций: 1 477 (одна тысяча четыреста семьдесят семь) простых обыкновенных акций.
Минимальная цена покупки: 2550 (две тысячи пятьсот пятьдесят) белорусских рублей за одну акцию.
Максимальная цена покупки: 2580 (две тысячи пятьсот восемьдесят) белорусских рублей за одну акцию.
Сделки купли-продажи акций будут совершаться на биржевых торгах в системе открытого акционерного общества «Белорусская валютно-фондовая биржа».
Форма, порядок и сроки оплаты акций: денежными средствами в белорусских рублях путем безналичного перечисления через расчетно-клиринговую систему открытого акционерного общества «Белорусская валютно-фондовая биржа» в день заключения сделки.
Дата начала покупки акций 7 июня 2010 г.
Дата окончания покупки акций 14 июня 2010 г.
01.06.2010 г. _____ (Калашникова И.Ю.)

Предложение о покупке акций

Россолько Николай Львович (заместитель генерального директора по экономике ОАО «Минскпромстрой»), проживающий по адресу: г. Минск, ул. 50-лет Победы, д. 7, кв.17 (контактный тел. 285 38 83) извещает акционеров открытого акционерного общества «Минскпромстрой» о своем намерении приобрести акции ОАО «Минскпромстрой».

Условия предложения:
Эмитент акций: Открытое акционерное общество «Минскпромстрой».
Юридический и почтовый адрес эмитента: 220034, г. Минск, пер. Войсковый, д. 12.
Количество акций: 1 208 (одна тысяча двести восемь) простых обыкновенных акций.
Минимальная цена покупки: 2550 (две тысячи пятьсот пятьдесят) белорусских рублей за одну акцию.
Максимальная цена покупки: 2580 (две тысячи пятьсот восемьдесят) белорусских рублей за одну акцию.
Сделки купли-продажи акций будут совершаться на биржевых торгах в системе открытого акционерного общества «Белорусская валютно-фондовая биржа».
Форма, порядок и сроки оплаты акций: денежными средствами в белорусских рублях путем безналичного перечисления через расчетно-клиринговую систему открытого акционерного общества «Белорусская валютно-фондовая биржа» в день заключения сделки.
Дата начала покупки акций 7 июня 2010 г.
Дата окончания покупки акций 14 июня 2010 г.
01.06.2010 г. _____ (Россолько Н.Л.)

Предложение о покупке акций

Дашкевич Олег Владимирович (технический директор – главный инженер ОАО «Минскпромстрой»), проживающий по адресу: г. Минск, ул. Васнецова, д. 15б, кв. 25 (контактный тел. 290 93 36) извещает акционеров открытого акционерного общества «Минскпромстрой» о своем намерении приобрести акции ОАО «Минскпромстрой».

Условия предложения:
Эмитент акций: Открытое акционерное общество «Минскпромстрой».
Юридический и почтовый адрес эмитента: 220034, г. Минск, пер. Войсковый, д. 12.
Количество акций: 2400 (две тысячи четыреста) простых обыкновенных акций.
Минимальная цена покупки: 2550 (две тысячи пятьсот пятьдесят) белорусских рублей за одну акцию.
Максимальная цена покупки: 2580 (две тысячи пятьсот восемьдесят) белорусских рублей за одну акцию.
Сделки купли-продажи акций будут совершаться на биржевых торгах в системе открытого акционерного общества «Белорусская валютно-фондовая биржа».
Форма, порядок и сроки оплаты акций: денежными средствами в белорусских рублях путем безналичного перечисления через расчетно-клиринговую систему открытого акционерного общества «Белорусская валютно-фондовая биржа» в день заключения сделки.
Дата начала покупки акций 7 июня 2010 г.
Дата окончания покупки акций 14 июня 2010 г.
01.06.2010 г. _____ (Дашкевич О.В.)

Предложение о покупке акций

Крупко Иван Владимирович (член Наблюдательного совета ОАО «Минскпромстрой»), проживающий по адресу: г. Минск, ул. Бурдейного, д. 18, кв. 95 (контактный тел. 283 15 96) извещает акционеров открытого акционерного общества «Минскпромстрой» о своем намерении приобрести акции ОАО «Минскпромстрой».

Условия предложения:
Эмитент акций: Открытое акционерное общество «Минскпромстрой».
Юридический и почтовый адрес эмитента: 220034, г.

Краіна здароўя

Выпуск № 20 (189)

Дзіцячая тэма

НА КАНІКУЛЫ — У ЛАГЕР

Калі паездка ў лагер першая ў жыцці дзіцяці, бацькі хвалююцца не менш, чым сын або дачка. Як зрабіць, каб дзіця адаптавалася ў новых умовах, правяло змену з задавальненнем і з карысцю для здароўя, пасталела, завяло новых сяброў, а потым увесь год даймала бацькоў роспытамі: «Калі я зноў у лагер паеду?».

Старанна сплануйце гэту паездку, каб дзіця як мага хутчэй уключылася ў лагернае жыццё, поўнае весялосці і прыгод. Псіхолагі лічаць: у 9—10 гадоў дзіцяці проста неабходна пачаць сталець, а лагер, дзе яно будзе рабіць гэта пад наглядам дарослых, — ідэальнае месца. Калі яно яшчэ ні разу ў жыцці не адрывалася ад дома і сям'і на цэлы месяц і едзе ў лагер упершыню, лепш, калі яно паедзе туды разам з прыяцелем і толькі на адну змену. Загадзя падрыхтуйце яго да лагернага распарадку дня, які можа адрознівацца ад хатняга.

Каму ў лагеры не месца

Перш чым купіць пуцёўку, зірніце на дзіця непрадузята. Якім яго ўбачаць незнаёмыя дзеці і дарослыя? Самастойным або «мамчыным сынком», завадатарам або ціхоняем, акуратыстам або неахайнікам? Ці зможа яно пастаяць за сябе і пражыць месяц, а то і больш, без сямейнай апекі? Ці ўдасца спешчанаму хатняму дзіцяці рабіць тое, да чаго яно, магчыма, не было прывучана дома, напрыклад, засцілаць ложак і ўтрымліваць у парадку асабістыя рэчы? Бо, магчыма, вы проста не заўважаеце: яно настолькі спешчанае, што знаходжанне ў лагеры замест карысці і задавальнення прынясе яму толькі пакуты і комплексы. Такое дзіця яшчэ не «даспела» да самастойнага жыцця і, хутчэй за ўсё, яму патрэбная дапамога дзіцячага псіхолага.

Настройце дзіця на тое, што яму давядзецца даволі доўга жыць у калектыве і быць увесь час на вачах, бо ў лагеры няма нумароў «люкс», а пакоі разлічаны на 4—10 дзяцей. Любы навічок спачатку адчувае ў лагеры стрэс. Бо ён упершыню застаўся без мамы, якая дома заўсёды прыходзіла на дапамогу. Папярэдзьце сына або дачку, каб яны не канфліктавалі, не паклёпнічалі і не скнарнічалі. Таксама загадзя падрыхтуйце іх да таго, што некаторыя лагерныя «заўсёднікі» могуць падбіваць парушыць рэжым і пайсці гуляць за тэрыторыю, пакурыць, выпіць або зусім уцячы з лагера. Навучыўшы дзіця цвёрда гаварыць «не», вы засцеражаце яго ад небяспекі.

Настройцеся і вы на тое, што ў першыя дні знаходжання ў лагеры дзеці-«навабранцы», магчыма, будуць прасіць забраць іх з «гэтага жахлівага месца». Не паддавайцеся паніцы і спачатку паспрабуйце разабрацца, што ж менавіта не падабаецца дзіцяці. Можа, гэта нясмачная ежа, нязвыклы распарадак, канфлікт з іншымі дзецьмі? Ацаніце сітуацыю крытычна, абмяркуйце праблему з важатым. Настройце дзіця на аптымістычны лад, скажыце яму, што вы ганарыцеся тым, што яно становіцца самастойным. Напэўна праз тыдзень яно начыста забудзецца пра тое, што прасілася дадому.

У лагер ехаць не варта:

- школьнікам малодшых класаў: на думку псіхолагаў, лепш за ўсё першы раз паехаць у лагер у 10—11 гадоў;
- так званым «хатнім» дзецям, якія не хадзілі ў дзіцячы садок і на «падоўжаны дзень». Калі ўсё ж вы прынялі рашэнне адправіць такое дзіця ў лагер, лепш выбраць месца, дзе вы зможаце часта яго наведваць;
- гіперактыўным дзецям: нярэдка сваімі выхадкамі яны ператвараюць жыццё іншых дзяцей у атрадзе ў кашмар;
- дзецям, якія пакутуюць ад такіх захворванняў, як эпілепсія, энурэз, хаджэнне ў сне.

Збіраем чамадан

Рэчы, якія вы пакладзяце ў дзіцячы чамадан, павінны быць не толькі камфортнымі, але і моднымі. У школьным узросце ў дзяцей няма патрэбы вылучыцца з дапамогай адзення. Наадварот, ім важна быць такімі, як усе. Прыгледзьцеся, што носяць «прасунутыя» аднагодкі сына або дачкі, і купіце дзіцяці пару падобных рэчаў, каб «было ў чым пайсці на дыскатэку». Гэтым вы дапаможаце ім хутчэй уліцца ў дзіцячы асяродак і не адчуваць сябе «белымі варонамі». Не ўпадайце і ў іншую крайнасць, набіваючы чамадан дарагой вопраткай: гэта можа выклікаць зайздрасць і непрыязнасць іншых дзяцей.

Добра, калі рэчы будуць мець меткі з прозвішчам дзіцяці, а ў чамадане будзе вопіс «маёмасці».

Не забудзьцеся і пра прадметы асабістай гігіены: зубную пасту і шчотку, расчоску, шампунь, мыла, мачалку і сонцаахоўны крэм. Знайдзіце месца ў чамадане і для асабістых рэчаў: ручак, нататніка, любімай цацкі ці кніжкі. Дазваляецца ўзяць з сабой крыху ежы: пячэнне, вафлі, свежую садавіну ці агародніну, а таксама мінеральную ваду ці сок. Зразумела, у чамадане не месца семкам, а таксама каўбасе, чыпсам і іншым некарысным і скорапсавальным прадуктам.

Не раскоша, а сродак стасункаў

Яшчэ некалькі гадоў таму педагогі не раілі бацькам даваць дзецям у лагер мабільны тэлефон, каб не выклікаць зайздрасці ў «нетэлефанізаваных» дзяцей. Сёння мабільнік ёсць амаль у кожнага, бо ён ужо даўно не раскоша, а зручны спосаб аператыўнай сувязі. Галоўнае, каб тэлефон быў простым, недарагім і не выклікаў у навакольных спакусы яго прысвоіць. Прывучыце дзіця не званіць хатнім па кожнай дробязі, ды і самі не званіце яму з пытаннямі накшталт «што сёння было на сняданак?».

Аптэчка юнага падарожніка

У летнім аздараўляльным лагеры за здароўем дзяцей сочыць медработнік. Але не звяртацца ж да яго з кожнай дрынкай! Збярыце дзіцяці невялікую аптэчку. Пакладзіце туды набор пластыраў, ёд, сродак ад камароў. Калі ў дзіцяці нярэдка выступае «прастуда» на губах, дадайце ў аптэчку і сродак ад герпесу. Спатрэбяцца ледзяныцы ад кашлю і кроплі ад насмарку. Калі ў дзіцяці ёсць хранічныя захворванні, пры якіх патрабуецца пастаянны прыём лекаў, пакладзіце ў аптэчку запас, якога хопіць да канца змены, і абавязкова ўкладзіце запіску з тлумачэннем для доктара.

Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.

Здароўе нацыі

НЯМА ЗАГАДАК ДЛЯ ПАТОЛАГААНАТАМА. ЦІ ЎСЁ Ж ТАКІ ЁСЦЬ?

Святлана БАРЫСЕНКА

Хвораму зрабілі біяпсію — узялі кавалачак тканкі і... выявілі пухліну. Але што гэта за пухліна (існуе бясконцая колькасць іх разнавіднасцяў), як яна паводзіць сябе ў арганізме? А калі гэта метастаз, то дзе шукаць асноўны ачаг раку?.. Пацыент думае, што пошукам адказу на такія пытанні займаецца ўрач на звычайным прыёме. На самай справе дыягназы, а значыць, і лячэнне, залежаць ад таго спецыяліста, з якім хворы наўрад ці калі-небудзь павітаецца. Дзякуючы інтэлектуальнай рабоце патолагаанатама, які валодае ведамі па ўсёй медыцыне, выяўляецца большасць ранніх ракаў, непухлінных захворванняў, вызначаюцца іх прычыны. Але ці ёсць «загадкі» для такіх спецыялістаў?

Расказвае загадчык курса паталагічнай анатоміі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі, кандыдат медыцынскіх навук Юрый РОГАЎ.

— Падчас ускрыцця — аналізу той клінічнай работы, якая праводзілася ў стацыянары, — мы ўстанаўліваем, на што хварэў чалавек, як яго лячылі, што паслужыла прычынай смерці. Наш аналіз — гэта, з аднаго боку, кантроль за аказаннем медыцынскіх паслуг, а з другога, — пастаянны працэс вучобы медыцынскіх работнікаў, неабходны для забеспячэння медыцыны на высокім узроўні.

— Што можна сказаць пра гэты ўзровень? Ці правільна лечацца хворыя?

— Варта разумець, што ацэнка якасці пастаўленага дыягназу і прапанаванага лячэння патрэбна не для таго, каб асудзіць урача, а каб крытычна асэнсаваць асобны выпадак. Нават калі патолагаанатам атрымлівае разыходжанне з тым, што яму было прапанавана для работы, то нічога незвычайнага ці экстраардынарнага тут няма.

Паводле сусветнай практыкі, аптымальны працэнт разыходжанняў павінен набліжацца да 10. Гэта значыць, дапушчальна, калі кожны дзясяты дыягназ будзе «няправільным». Але гэта можа датычыцца як сур'ёзных момантаў, так і афармлення дакументаў. За савецкім часам працэнт разыходжанняў вагаўся каля 12. Сёння ў заходніх краінах ён роўны 30, у Расіі — 16-17, Беларусі — 4. Іншая справа, на Захадзе робіцца менш ускрыццяў. Такое ўмяшанне выконваецца толькі, калі выпадак быў цяжкі для ўрачоў, невідавочны. У нас жа працэнт ускрыццяў досыць высокі — 60-70 працэнтаў ад агульнай колькасці памерлых у стацыянарах.

— Мне здавалася, ён павінен быць яшчэ больш высокім, бо нават калі пытанняў няма ва ўрачоў, яны могуць быць у сваякоў...

— Працэнт не набліжаецца да сотні якраз таму, што ўскрыццё неабходна ўзгадняць са сваякамі. Відавочна, гэта ў пэўнай ступені пытанне культуры, менталітэту. Людзей можна зразумець: у іх і без таго гора, а тут яшчэ з целам памерлага будуць нешта рабіць... Хоць вы цалкам маеце рацыю. У прынцыпе ўскрывацца павінен кожны, хто памёр у стацыянары. Для удакладнення дыягназу, тых момантаў, якія могуць быць важныя для жывых сваякоў, паколькі мы можам выявіць пухліны, інфекцыі і іншыя хваробы, пра якія дагэтуль ніхто з блізкіх не здагадваўся.

— Дазвол сваякоў патрабуецца ва ўсіх выпадках?

— Ёсць сітуацыі, пры якіх, згодна з законам, гэта не патрабуецца. Напрыклад, калі хворы памёр пры знаходжанні ў стацыянары тэрмінам да сутак, або засталося шэраг пытанняў адносна дыягназу, або смерць наступіла пасля аператыўнага ўмяшання.

— Аб'ём вашай работы пры ўскрыцці залежыць ад канкрэтнай сітуацыі?

— Ёсць стандартная методыка даследавання памерлага. Мы абапіраемся на анамнез, прапісаныя скаргі пацыента, некаторыя іншыя моманты. У цэлым аналіз складаецца з трох частак — клінічных звестак, макраскапічных анатамічных змяненняў і гісталагічнага даследавання пад мікраскопам. Пры неабходнасці праводзяцца бактэрыялагічныя, вірусалагічныя і іншыя даследаванні.

— На маю думку, пасля ўскрыцця не павінна быць ніякіх загадак...

— Тым не менш шэраг пытанняў застаецца без адказу. Паводле аднаго амерыканскага артыкула, 5 працэнтаў ускрыццяў застаюцца без дыягназу. Гэта можа быць звязана з малой колькасцю марфалагічных ці клінічных звестак. А можа быць і такая сітуацыя. Раптоўна памірае малады чалавек. Пры клінічным і марфалагічным даследаваннях у яго ўсё было ў норме. Значыць, можна толькі меркаваць, што ў мужчыны была электрычная нестабільнасць сэрца, што цяжка даказаць сучаснымі метадамі.

— Асноўная функцыя паталагічнай анатоміі, як вядома, — пастаноўка канчатковага дыягназу для жывых людзей...

— Думаю, не для ўсіх чытачоў гэта так відавочна. Пацыент прыходзіць да канкрэтнага ўрача, размаўляе з ім і з яго вуснаў чуе дыягназ захворвання. Хворы, якому робяць гастраскапію, і не здагадваецца, што дыягназ яму паставіў патолагаанатам. Для большасці жанчын застаецца невядомым, што па саскрэбу з поласці маткі ці кавалачку тканкі з шыйкі маткі, узятым гінеколагам, дыягназ ставіць таксама патолагаанатам. Вузкія спецыялісты атрымліваюць ад патолагаанатамаў і «інструкцыю» для прызначэння лекавай тэрапіі.

Мала сказаць, што ў чалавека тая ж пухліна. Трэба яшчэ назваць усе яе асаблівасці — з якіх клетак ці тканкі развіваецца, дабраякасная яна ці злаякасная, а калі злаякасная, то якой ступені і г.д. Ад гэтага залежыць правільнасць лячэння.

На 90 працэнтаў патолагаанатамы працуюць для жывых пацыентаў. Для людзей, якія чакаюць правільнага дыягназу і адэкватнага лячэння, штогод па рэспубліцы даследуецца каля 3,5 мільёна кавалачкаў тканак. І гэта не простая, руцінная работа. Толькі ўласна па пухлінных захворваннях існуюць вялізныя міжнародныя класіфікацыі паражэнняў кожнага органа і тканак. Усе яны заканчваюцца раздзеламі «неўдакладненыя» і «некласіфікаваныя» пухліны.

У цэлым размова ідзе пра бясконцы аб'ём інфармацыі, якой патолагаанатамы павінны валодаць. Гэта тытанічная інтэлектуальная праца, якую немагчыма аўтаматызаваць. Клініка-анатамічны і клініка-гісталагічны аналіз залежыць не ад маркёраў, не ад мікраскопа, а выключна ад інтэлекту спецыяліста. Бывае так, што маркёры якраз супраць тых дыягназаў, якія выстаўляюцца пацыенту. Толькі патолагаанатам раскладвае ўсё па паліцах.

— Як можна ацаніць магчымасці патолагаанатамічнай дыягностыкі?

— Некаторыя пухліны можна выставіць з дапамогай толькі вельмі дарагіх сучасных метадаў даследавання — у першую чаргу малекулярна-генетычных. На Захадзе гэты накірунак імклівa развіваецца. У нас жа метад прымяняецца толькі ў некаторых лабараторыях і, галоўным чынам, у навуковых, а не практычных мэтах. Разам з тым, зноў жа, падкрэслю, што наша работа — інтэлектуальная, а значыць, патрабуе пастаяннай падрыхтоўкі самога спецыяліста. У ідэале кожны ўрач штогод павінен праходзіць дадатковую падрыхтоўку — удзельнічаць у сусветных канферэнцыях, семінарах і г.д.

— Кавалачак тканкі, узяты падчас той жа біяпсіі ці саскрэбу, можа быць неінфарматыўным?

— Можа. І не толькі таму, што ёсць органы, адкуль у прынцыпе складана ўзяць тканку, а значыць, атрыманы кавалачак будзе надзвычай малым. Урач можа ўзяць тканку не адтуль, дзе ёсць пухлінныя клеткі, а там, дзе тканка змярцвела, утварыўся некроз. Такія выпадкі рэдкія, паколькі ўрачы, безумоўна, ведаюць, як праводзіць падобныя маніпуляцыі.

Чым больш дынамічна орган — такі як галаўны мозг, сэрца — уцягнуты ў жыццёва важныя працэсы, тым, вядома, складаней рабіць забор матэрыялу. Вынік можа залежаць ад таго, адкуль узяты матэрыял, але не ўсё так адназначна. Бывае, на фоне невуса ўзнікае злаякасная пухліна — меланома. Здаецца, пухліна звонку, яе лёгка даследаваць, але ж не кожны з нас уважліва ставіцца да нейкіх зменаў на скуры, і атрымліваецца, што, нягледзячы на абсалютную даступнасць для агляду, застаюцца выпадкі выяўлення раку на позніх стадыях.

Не складана ўзяць матэрыял з шыйкі маткі. Але працэс ідзе ў тканцы нераўнамерна, а значыць, многае залежыць ад таго, адкуль менавіта ўзяты матэрыял — з таго месца, дзе ўжо ёсць цяжкая дысплазія, або адтуль, дзе працэс яшчэ знаходзіцца на ранняй стадыі або, як мы казалі вышэй, адтуль, дзе ёсць некроз. Важна захапіць зону паміж нармальнай тканкай і пухлінай, каб было бачна, якая гэта пухліна, як яна расце, які ў яе край. Так, добра акрэсленае ўтварэнне, хутчэй за ўсё, дабраякаснае, а злаякаснае пранікае на клетачным узроўні ў навакольныя тканкі.

— Сам па сабе некроз не можа гаварыць пра тое, што ёсць пухліна?

— Неабавязкова. У выніку запаленчага працэсу могуць пацярпець сасуды. Тканка дрэнна харчуецца і ўзнікае змярцвенне.

— Ці надыдзе час, калі па любым кавалачку тканкі, з любой часткі цела, можна будзе сказаць, што ў арганізме нядобра?

— Тое, што адбываецца ў арганізме на адлегласці ад нармальнай тканкі, можа праявіцца тым, што ў крыві, якая харчуе пэўны орган, з'явяцца біялагічныя малекулярныя маркёры адмоўнага працэсу. Аднак у тканцы, якая знаходзіцца ў здаровай зоне, не павінна быць ніякіх намёкаў. Працэс злаякаснага росту адбываецца пэўнымі зменамі на імуннай сістэме, аднак гэта яшчэ не вердыкт. Хоць пэўныя зрухі ў імуннай сістэме могуць спрыяць актывізацыі пухліннага росту...

У нашым арганізме з-за знешніх і ўнутраных уздзеянняў пастаянна ўзнікаюць нейкія пухлінныя элементы, парушэнні ў генетычным матэрыяле, але наша сістэма самарэгулявання здольная кантраляваць гэтыя працэсы. Так што не думаю, што па кавалачку тканкі, аддаленай ад дрэннага працэсу, можна будзе сказаць штосьці канкрэтнае.

— А па аналізе крыві можна будзе выяўляць любы рак?

— Цяпер аб пухлінным працэсе магчыма гаварыць дзякуючы некаторым анкапратэінам, бялковым ферментам. Напрыклад, альфафетапратэін — бялок, які з'яўляецца і выяўляецца ў крыві пры некаторых пухлінных працэсах. Пры пухлінах эндакрынных органаў павышаецца выпрацоўка гармонаў... Іншая справа, часам тыя ж ферменты цяжка вылавіць: звычайна іх канцэнтрацыя ў крыві невысокая.

Наогул колькасць пухлін, якія можна западозрыць па крыві, вельмі абмежаваная. Аналіз крыві варта ўсё ж такі разглядаць як падставу для далейшага абследавання. Заключэнне патолагаанатама застаецца асноўным у рашэнні гэтых дыягнастычных праблем.

— Як у ідэале павінна выглядаць патолагаанатамічная служба?

— Наладжваца паводле прынцыпаў, якія прымяняюцца па Захадзе. У першую чаргу гэта пастаянная вучоба спецыялістаў, абмен інфармацыяй, назапашванне вопыту на шэрагу канферэнцый і г.д. Неабходна і адпаведная тэхніка, камп'ютарызаванае працоўнае месца, лабараторыя, якая дазваляе рабіць дарагія аналізы, літаратура, інтэрнэт. У свеце кожнаму з гэтых аспектаў надаецца вялікая ўвага, паколькі без патолагаанатамічных метадаў даследавання немагчымая сучасная дакладная дыягностыка многіх захворванняў, іх правільнае лячэнне, захаванне жыцця, у рэшце рэшт.

в. Таль, Любанскі раён.

Фота Анатоля КІПІШЧУКА.

С ТАТАМ НА РЫБАЛЦЫ

ЛЕКАВЫ РЫНАК КРАІН МЫТНАГА САЮЗА: АГУЛЬНЫЯ «ПРАВІЛЫ ГУЛЬНІ»

Актуальныя праблемы рэгулявання лекавага абарачэння ва ўмовах Адзінага Мытнага саюза аказаліся ў цэнтры ўвагі ўдзельнікаў міжнароднага навукова-практычнага сімпозіума «Лякарства на карысць чалавека», які прайшоў у Мінску. Яго арганізатарамі выступілі Міністэрства аховы здароўя і Асацыяцыя міжнародных фармацэўтычных вытворцаў у Рэспубліцы Беларусь.

— Шчыра кажучы, сёння для фармбізнэсу існуе больш пытанняў, чым адказаў: што будзе і як будзе ў рамках Мытнага саюза, — прызнаўся ў сваім выступленні на сімпозіуме **генеральны дырэктар Асацыяцыі расійскіх фармацэўтычных вытворцаў Віктар ДЗМІТРЫЕЎ**. — Лекі — гэта асаблівы тавар, які патрабуе асаблівай лагістыкі. Для расіян, напрыклад, даволі нечакана набыла актуальнасць не толькі эканамічная, але і фізічная даступнасць некаторых найменняў лекаў. Як сведчыць практыка, утрыманне цэнаў на даступным узроўні і захаванне асартыменту ў аптэках нярэдка ўступаюць у супярэчнасць.

Паводле слоў Віктара Дзмітрыева, у Расіі, Беларусі і Казахстане дзейнічаюць сёння розныя падыходы да рэгістрацыі лекавых сродкаў. Напрыклад, у Расіі адмененая перарэгістрацыя лекавых сродкаў кожныя пяць гадоў, гэта значыць, што не трэба раз у пяць гадоў праходзіць фінансава затратную працэдуру, якая да таго ж адымае і шмат часу. Дастаткова толькі пацвердзіць, што прэпарат знаходзіцца на рынку і даць інфармацыю аб выяўленых пабочных эфектах. Ёсць сур'ёзныя розначытанні ў нашых краінах і ў трактоўцы вынікаў даклінічных і клінічных даследаванняў лекавых сродкаў, таму адзін і той жа прэпарат у розных краінах суправаджаюць розныя інструкцыі. Узяць той жа дыклафенак: ва ўсіх трох краінах складзены розныя інструкцыі па яго прымяненні.

Сярод праблем, якія трэба будзе вырашаць, трэба ўзгадаць складанне адзінага для ўсіх спісу безрэцэптурных прэпаратаў, увядзенне адзіных прынцыпаў фарміравання абмежавальных спісаў лекавых сродкаў, распрацоўку адзіных патрабаванняў да маркіроўкі лекавых сродкаў, увядзенне празрыстай працэдуры і сумленнай канкурэнцыі на ўзроўні дзяржаўных закупак, неабходнасць супрацьстаяння наплыву фальсіфікаваных лекаў. Дарэчы, для Беларусі праблема фальсіфікатаў да апошняга часу актуальнай не была, бо створаная сістэма нагляду працавала бездакорна і фальсіфікаваныя лекі ў нашу краіну не траплялі. А вось у Расіі аб'ёмы рэалізацыі фальсіфікаваных лекаў пастаянна растуць.

Затое ў Расіі прадстаўнікі фармбізнэсу праз Вышэйшы арбітражны суд дабіліся права праводзіць усе перадрэгістрацыйныя работы і экспертызы джэнерыка да заканчэння тэрміну патэнтнай аховы на арыгінальны прэпарат. Як толькі тэрмін патэнта завяршаецца, на рынак можна будзе пастаўляць джэнерык арыгінальнага прэпарата, які прайшоў усе клінічныя выпрабаванні і рэгістрацыю, і тым самым рабіць гэта лякарства больш даступным для пацыентаў. Раней ад моманту завяршэння патэнтнай аховы да моманту з'яўлення на рынку яго джэнерыка магло прайсці і некалькі гадоў.

На форуме быў агучаны намер стварыць і ўкараніць электронную сістэму паведамлення пра сур'ёзныя пабочныя рэакцыі ў рэжыме online, а таксама стварыць інтэграваную сістэму інспектавання вытворчасці ў выглядзе адзінага фармацэўтычнага інспектарата.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ 8 июля 2010 года в 11.00

№ лота	Сведения о предмете аукциона на право заключения договора аренды земельного участка для размещения объекта строительства: Адрес земельного участка/ кадастровый номер/размер/ срок аренды/арендодатель	Целевое назначение земельного участка	Условия развития инфраструктуры застраиваемой территории, характеристика расположенных на земельном участке инженерных сооружений	Условия предоставления земельного участка	Начальная цена предмета аукциона, бел. руб.	Сумма задатка, бел. руб.
1	Брестская область, Кобринский район, г. Кобрин, ул. Матросова (земельный участок № 8)/ кадастровый номер 124350100001006304/ площадь участка 0,0070 га/ срок аренды 10 лет/ арендодатель – Кобринский райисполком. Тел. 8(01642) 2 28 11, 2 28 04, 2 33 68.	Установка торгового павильона	Прочие неиспользуемые земли. Ограничений в использовании земли нет.	- внесение победителем аукциона платы за право заключения договора аренды земельного участка в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении земельного участка; -возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения в сумме 402 829 рублей и расходов на публикацию данного извещения; - заключение с Кобринским райисполкомом договора аренды земельного участка и осуществление в 2-месячный срок после принятия решения о предоставлении участка государственной регистрации прав на него; - начало освоения земельного участка в течение 6 месяцев с даты государственной регистрации прав на земельный участок; - обеспечение целевого использования земельного участка в течение срока аренды; - осуществление установки павильона и благоустройства прилегающей территории в соответствии с разработанной проектно-сметной документацией.	2 000 000	200 000
2	Брестская область, Кобринский район, г. Кобрин, ул. Дружбы, 43/ кадастровый номер 124350100001005766/ площадь участка 0,4931 га/ срок аренды 50 лет/ арендодатель – Кобринский райисполком. Тел. 8(01642) 2 28 11, 2 28 04, 2 33 68.	Строительство торгового центра (магазин промышленных товаров, магазин продовольственных товаров, кафе)	Прочие неиспользуемые земли. На площади 0,0270 га имеются ограничения в использовании земли в охранной зоне канализационного коллектора.	- внесение победителем аукциона платы за право заключения договора аренды земельного участка в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении земельного участка; - возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения в сумме 925050 рублей и расходов на публикацию данного извещения; возмещение убытков гражданке Савчук М.Н. в сумме 5077,0 тыс. руб.; - организация и регистрация юридического лица (его филиала) в г. Кобрине при вводе объекта в эксплуатацию; - заключение с Кобринским райисполкомом договора аренды земельного участка и осуществление в 2-месячный срок после принятия решения о предоставлении участка государственной регистрации прав на него; - начало освоения земельного участка - после утверждения проектно-сметной документации, но не позднее 2-х лет с даты регистрации прав на земельный участок; - обеспечение целевого использования земельного участка в течение срока аренды; - осуществление строительства и благоустройства прилегающей территории в соответствии с разработанной проектно-сметной документацией.	106 135 558	10 600

Аукционные торги состоятся 8 июля 2010 года в 11.00 по адресу: г. Кобрин, ул. Суворова, 25, зал заседаний, 1 этаж.

Для участия в аукционе приглашаются юридические лица и индивидуальные предприниматели. Для участия в аукционе необходимо подать заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с Кобринским райисполкомом, к заявлению на участие в аукционе прилагаются документы:

копия платежного поручения (с отметкой банка отправителя об исполнении) о внесении задатка на расчетный счет 3632002160014 в филиале № 113 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 237, УНП 200042468, получатель – Кобринский райисполком – по 2 июля 2009 включительно;

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования; представителем индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность; представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица; представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык; представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов на участие в аукционе представители индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

Индивидуальные предприниматели и юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задаток в размере, установленном для предмета аукциона с наибольшей начальной ценой.

Порядок осмотра земельных участков осуществляется на местности по согласованию с арендодателем.

Аукцион проводится при наличии двух или более участников аукциона. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену.

Участник, ставший победителем аукциона (претендент), обязан: подписать протокол аукциона в день аукциона; в течение 10 рабочих дней со дня принятия Кобринским исполнительным комитетом решения о предоставлении земельного участка победителю аукциона: внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, расходы, связанные с формированием земельного участка для размещения объекта строительства, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка, после чего, но не позднее 2 рабочих дней, заключить с местным исполнительным комитетом договор аренды земельного участка.

Порядок проведения аукциона определен в соответствии с «Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договора аренды земельных участков», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462 с учетом требований Указа Президента Республики Беларусь от 27 декабря 2007 г. № 667 «Об изъятии и предоставлении земельных участков».

Заявления на участие в аукционе с необходимыми документами принимаются по адресу: г. Кобрин, ул. Суворова, 25, райисполком, каб. 404 с 8.00 до 16.00 по рабочим дням по 2 июля 2010 г. включительно. Тел. для справок 8 (01642) 2 28 11, 2 28 04, 2 20 99. Полная информация об аукционе размещена на сайте www.brest-region.by

Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»

- Оценка оборудования и транспортных средств
- Оценка недвижимости и сетей всех форм собственности
- Независимая строительная экспертиза

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

	Наименование объекта	Начальная цена продажи, бел. руб.	Сумма задатка, бел. руб.
1	Кабина (доска обшитая жестью) Кабина (доска обшитая жестью) Здание административно-хозяйственное общей площадью 278 кв.м, год постройки – 1992 (материал стен – ж/бетонные панели) Здание обрабатывающей промышленности иного назначения общей площадью 1442 кв.м, год постройки – 1992 (материал стен – ж/бетонные панели) Ограждения – ж/б плиты Щиток Щ 81 Стан ХПТ 32-3-8 Правильная машина Индукционная установка Станок фрезерный Ванна металло-керамическая Кран-балка Станок обрезной Стан трубоволочильный Сотовый телефон Весы крановые	631 788 361	31 589 000
Продавец имущества: Управляющий в деле о банкротстве ПУИП «Упеко Индастриз», имущество расположено по адресу: **г. Гомель, ул. Лепешинского, 7** на земельном участке площадью 1,4289 га.			
2	Здание мебельного цеха с бытовыми помещениями (общей площадью 1394,5 кв.м) и изолированное нежилое помещение (площадью 179,4 кв.м)	147 446 725	7 372 000
3	Здание котельной общей площадью 91 кв.м	20 892 816	1 045 000
Продавец имущества: Управляющий в деле о банкротстве БИ СП ЗАО «Реан», имущество расположено по адресу: **г. Речица, ул. Луначарского, 97.**			

Срок подачи заявления	**До 17.00 8 июня 2010 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 34/а
Дата, время, место проведения аукциона	**9 июня 2010 г. в 12.00** по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 34/а, Гомельское областное управление Филиал Центр «Белтехинвентаризация» РУП «Жилкоммунтехника»
Номер р/с для перечисления залога	Р/с 3012035310012 в Филиал ОАО «БПС-Банк» по Минской области, код 331, УНП 102353509
Условие продажи	Без условий. **Цены указаны без НДС.** Шаг аукционных торгов – 8 %, вознаграждение – 5 % от цены продажи лота
Условие пользования	Объекты продаются в собственность

Дополнительная информация по тел.: (0232) 77 37 27, 77 52 87 (факс).

Пільны погляд

ШАНУЙМА І БУДЗЕМ ШАНАВАНЫМІ

ЧАМУ ў юбілейны год Францішка Багушэвіча зусім неюбілейны выгляд мае надмагільны помнік паэту ў вёсцы Жупраны Ашмянскага раёна, хоць магіла ўнесена ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Рэспублікі Беларусь і ахоўваецца дзяржавай?

Некалі чуў такі выраз: як мы будзем самі сябе паважаць, так і нас будуць шанаваць у свеце. А мо трошкі іначай, але сэнс дакладна такі. З часам пераконваюся, што так і адбываецца насамрэч. І не ў адпаведнасці з нашым жаданнем ці хаценнем. А ў залежнасці ад рэальнай сітуацыі і рэальнага становішча спраў. Як бы мы ні заяўлялі, што мы лепшыя, што мы непаўторныя і г.д., але калі словы нашы не будуць падмацоўвацца справамі, то ніякая дэкларацыя не знойдзе неабходнага нам водгуку.

Пераконваўся то пераконваўся, але па нашай звычцы апраўдваць усе праблемы нейкімі незалежнымі ад нас прычынамі я таксама нібыта пагаджаўся з тым, што ў нас **рэальна** ёсць. А вось зусім нядаўна мусіў упэўніцца ў вялікай памылцы дараваць нашу непавагу да нашага мінулага і да нашых праслаўленых папярэднікаў.

Толькі што Беларусь адсвяткавала 170-гадовы юбілей аднаго з самых першых нашых асветнікаў, дзяржаўнікаў, абаронцаў, ахвярнікаў на ніве беларускасці і чалавечай справядлівасці, удзельніка паўстання 1863 года, а акрамя таго — выдатнага паэта, чыё жыццё і дзейнасць прасякнутыя натуральным і таму звыклым патрыятызмам і сапраўднай грамадзянскасцю — Францішка Багушэвіча. Адсвяткавала так, як магла, як зразумела ролю гэта выбітнага прадстаўніка нацыянальнага гонару беларусаў у нашай гісторыі.

22 мая ў Кушлянах, што на Смаргоншчыне, дзе з 1898 года і да сваёй смерці ў 1900 годзе жыў паэт і дзе сёння дзейнічае музей-сядзіба Францішка Багушэвіча «Кушляны», адбылося паэтычнае свята, наладжанае Дзяржаўным музеем гісторыі беларускай літаратуры і Смаргонскім райвыканкамам. Прысвечана яно слаўнаму юбілею нашага знанага паэта. З удзелам прадстаўнікоў мясцовых уладаў, гасцей — пісьменнікаў і музейшчыкаў з Мінска. Не будзем наракаць, што для такога юбілею і для такой асобы, як Францішак Багушэвіч, магло б быць і больш высокае прадстаўніцтва. Разумеем: занятасці, праблем і клопатаў хапае і іншых. А вось тыя мясцовыя жыхары, хто ў не па-вясенняму моцную спёку адважыўся аддаць свой выхадны дзень удзелу ў гэтым святе на лужку каля дома-музея, не пашкадавалі, бо і свята атрымалася святочным, цікавым і познавальным, і наталіць свой інтарэс да беларускай мінуўшчыны было можна.

Я таксама застаўся задаволены тым, што ў чарговы раз пабываў у гэтым святым для беларусаў куточку. Чуў, што і іншыя, хто прыехаў з Мінска, таксама. Пад гэтым узнёслым настроем вырашылі мы наведаць іншыя мясцінкі, звязаныя з імем Францішка Багушэвіча. З задавальненнем паклалі кветкі да выдатнага помніка паэту ў Смаргоні, які паўстаў на гэтай зямлі ў мінулым годзе, падчас святкавання Дня беларускага пісьменства.

Затым вырашылі пакласці кветкі да помніка паэту ў Жупранах і да месца яго вечнага спачыну ў гэтай жа вёсцы. І які ж сорам, якое пачуццё ўласнай віны апанавалі нас, калі падышлі да помніка на могілках, што побач з велічным касцёлам! Ад бронзавага барэльефа на помніку па ўсёй паверхні пацяклі брудныя палосы. Няўжо яны не паддаюцца рукам ні школьнікаў, ні гаспадароў-захавальнікаў гэтай святыні — бо магіла знаходзіцца пад аховай дзяржавы як гісторыка-культурная каштоўнасць (унесена ў дзяржаўны спіс у 2003 годзе пад нумарам 413Д000072, ахоўнае абавязацельства выдадзена тады ж Жупранскаму сельвыканкаму, якому належаць мясцовыя могілкі), пра што сведчыць аж занадта як для надмагілля аб'ёмная ахоўная шыльда, прымацаваная да помніка, — ні вернікам, якія так дбайна даглядаюць іншыя пахаванні на гэтых могілках?

Самае непрыемнае і незразумелае, што помнік элементарна разбураецца. Зроблены, відаць, з недаўгавечнага матэрыялу, ён сёння проста рассыпаецца, развальваецца, літаральна ападае кавалкамі на зямлю. І сам помнік паэту, і той, што стаіць побач і пад якім пахаваны родзічы паэта. Рассыпаецца не проста помнік. Як падаецца мне, рассыпаюцца напышлівыя словы нашай уяўнай павагі і фальшывай пашаны, наша пустая дэкларацыя аб павазе і шанаванні слаўнага сына зямлі беларускай. Вядома, словы прамаўляць прасцей. А вось зрабіць тое канкрэтнае, чаго патрабуюць сённяшнія абставіны, усё-ткі аказваецца цяжэй. А для гэта ж трэба ўсяго толькі сапраўды паважаць памяць продкаў. Нават звычайных людзей. Ну а выбітных сыноў народа — найперш. Як мы іх, так і саміх нас будуць шанаваць іншыя, чужаземныя людзі. І не трэба чакаць чарговага юбілею, не варта спасылацца на каманды і патрабаванні зверху — ці то самага высокага, ці то крыху ніжэйшага. А мы самі хто? Няўжо нам самім цяжка паправіць і дагледзець магілы нашых заслужана памятных продкаў? Дальбог, калі б хто дасведчаны кінуў кліч, я таксама падаўся б у валанцёры і паехаў у Жупраны, каб дапамагчы прывесці ў парадак помнік таму чалавеку, які заклікаў і заклікае ўсіх нас быць людзьмі, быць беларусамі, быць грамадзянамі сваёй краіны, або разам з іншымі ахвяраваў бы сродкі на аднаўленне надмагілля.

Часам бывае дастаткова неабыякавасці аднаго чалавека, каб справа зрушылася. Згадайма зусім нядаўні прыклад з помнікам бабулі Уладзіміра Караткевіча ў Рагачове. Варта было карэспандэнту «Звязды» Глебу Лабадзенку спачатку ў газеце, а пасля на сваім уласным блогу паведаміць пра недапушчальна запусцелы выгляд магілы і прапанаваць збор сродкаў на надмагілле, як неабыякавых людзей знайшлося шмат (нягледзячы на тое, што магіла не ў дзяржаўным рэестры і што не ўсе зацікаўленыя чытаюць блог журналіста альбо стала карыстаюцца інтэрнэтам), і неўзабаве з дапамогай мясцовых уладаў помнік быў усталяваны. Значыць, можам, калі захочам.

Францішак Багушэвіч прасіў, пераконваў, маліў нас не выракацца мовы сваёй — каб не ўмёрлі. Я ж прашу ўсяго толькі: не забывайма сваіх папярэднікаў, бо дрэва без каранёў — недаўгавечнае. Яно памрэ, засохне. Незваротна, назаўсёды. А лесу без падлеску не бывае. Які падлесак вырасцім і выхаваем сёння, такі лес, такі бор будзем мець заўтра.

Каб жа не пашкадаваць, што забыліся, што не хапіла часу, што паспадзяваліся на іншых...

Анатоль БУТЭВІЧ,
старшыня грамадскай назіральнай камісіі пры Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь па захаванні гісторыка-культурнай спадчыны.
Фота аўтара.

Наш культурны асяродак
Жыравандоля
Выпуск № 9 (95)

Андрэй ФЕДАРЭНКА:

«НАМ НЕ ХАПАЕ ДОБРАГА СТАНОЎЧАГА ГЕРОЯ...»

АНДРЭЙ ФЕДАРЭНКА — знакавае імя ў сучаснай беларускай літаратуры. Кожная з яго публікацый знаходзіць водгук у чытача. Пра тое, чым жыве пісьменнік, якія ў яго планы на найбліжэйшы час, і пойдзе наша размова...

— Андрэй, вы цяпер ці не адзін з найболей друкуемых пісьменнікаў... У «Мастацкай літаратуры» выйшаў том вашай прозы. У РВУ «ЛіМ» адна за другой — кнігі ў серыі «Пераходны ўзрост»: «Три талера» і «Афганская шкатулка». Часопіс «Полымя» надрукаваў ваш новы раман... Як жывецца такому беларускаму пісьменніку? Ці адчуваеце зваротную сувязь з чытачом? У чым гэта выяўляецца — закідаюць лістамі, раяцца з вамі на тэму, як жыць..?

— Я так доўга — 15 гадоў — чакаў моманту, калі пачнуць нарэшце выдавацца мае кнігі, што цяпер успрымаю гэта як належнае і, на жаль, мала радуюся. На жаль, бо каму-каму, а мне на чытацкую ўвагу грэх скардзіцца. Лістамі ў іх класічным значэнні — аркушык паперы ў канверце — мяне, безумоўна, не закідваюць, але праз інтэрнэт прамая і зваротная сувязь з чытачамі існуе даволі актыўная. Было прыемна, калі мая кніга «Нічые» праз незалежнае інтэрнэт-галасаванне, у якім удзельнічала каля тысячы чалавек (ініцыятар — пісьменнік і выдавец Адам Глобус), заняла першае месца і я атрымаў прэмію «Залатая літара-2010». Плюс многія мае творы ўведзены ў школьныя праграмы і ВНУ. Таму мне заўсёды лёгка выступаць перад школьнай, студэнцкай, выкладчыцкай аўдыторыямі. Большасць або чытала мяне, або хоць бы чула, што такі існуе. Наконт «як жыць» ніхто даўно ўжо з пісьменнікамі не раіцца, цяпер усе разумныя і ведаюць усё пра ўсё, ледзь навучыўшыся гаварыць.

— Сёння шмат кажуць пра тое, што некуды знікла літаратурна-мастацкая крытыка. Вам асабіста хапае ўвагі крытыкаў? І ці патрэбна яна вам?..

— Безумоўна, мне важны любы водгук: і хвалебны, і крытычны. Гэта не значыць, што я выразаю з газет і складваю ў папку розныя рэцэнзіі, але заўсёды сёе-тое застаецца ў памяці і дапамагае пры напісанні новых твораў. Я не лічу, што літаратурна-мастацкая крытыка знікла, проста крытыку цяпер нашмат цяжэй, чым пісьменніку. Па простай прычыне — крытыкі перасталі з'яўляцца «заканадаўцамі моды», іхнія артыкулы і рэцэнзіі практычна не маюць рэзанансу. Адзін напіша, што твор убогі, другі — што гэта класіка, і нічога не мяняецца, пісьменнік як пісаў, так і піша, чытач, у большасці, як не чытаў, так і не чытае...

— У рамане, які вы надрукавалі ў часопісе «Полымя», героем, зразумела, з'яўляецца пісьменнік са сваімі трывогамі і сумненнямі. А ўвогуле, якога, на ваш мастакоўскі погляд, нестае героя ў сучаснай беларускай прозе?

— У свае 46 я прыйшоў да цвёрдай, несумненнай для мяне высновы: нам не хапае старога добрага станоўчага героя. Вайна, як і перабудова, даўно скончыліся. Ужо проста ванітуе ад постперабудовачнага чарнюцця, ад тупых крымінальных разборак, герояў-кілераў, гераінь-шлюх і інш., інш., інш. «Трэба нам песень шчырых і светлых», як абсалютна правільна заўважыў геніяльны Купала. Адна дзяўчынка напісала мне па e-mail пра аповесць «Нічые»: «Усе ваенныя сутычкі прапускала — надакучыла ўжо, затое пацыфісцкую, светлую канцоўку перачытвала ажно чатыры разы!»

— Некалькі слоў пра ўласныя мастацкія арыенціры... Каго перачытваеце з беларускай класікі? Хто вам блізкі з сучасных беларускіх празаікаў?

— Гэта Быкаў — яго аўтабіяграфічная «Доўгая дарога дадому», Чорны, Пташнікаў, Мележ... Бліжэй за ўсіх мне апошні, у яго аднаго ёсць неабходныя кампаненты мастацкага тэксту — гумар і самаіронія. Гэта пры тым, што пры жыцці Мележ настолькі хваравіта ўспрымаў любую крытыку, што яго проста баяліся рэдагаваць, называлі гэты працэс — «гладзіць кракадзіла». Лішні раз пацвярджаецца, якія розныя бываюць пісьменнікі ў жыцці і ў творчасці. Як кажа Барыс Акунін, «ніколі не знаёмцеся асабіста з пісьменнікам, які вам падабаецца, — вас абавязкова чакае расчараванне». З сучасных празаікаў стараюся не прапускаць новых рэчаў Адама Глобуса, Уладзіміра Сцяпана, Алеся Наварыча, Людмілы Рублеўскай, Алены Брава... Прыемна, што Глобус пастаянна выклікае ўвагу вядучых грамадска-палітычных газет краіны. У гэтым, як мне падаецца, праяўляецца і свайго роду літаратурнае выхаванне грамадства. А яго ж — выхавання праз мастацкае слова, праз кнігу — якраз і ўвачавідкі нестае...

— Вы яшчэ — і рэдактар аддзела прозы часопіса «Маладосць». Што чакаеце ад маладых аўтараў? На каго ўскладваеце спадзяванні?

— Чытаючы гару — без перабольшання цэлую гару тэкстаў цяперашніх маладых, я з сумам бачу, што ім няма пра што пісаць. Усё надумана, высмактана з пальца, недзе вычытана, у лепшым выпадку недзе пачута. У аснову твора не кладзецца штосьці асабіста перажытае. Хай яно будзе наіўным, хай слабенькім — але гэта ёсць абавязковая першая прыступка, падмурак для стварэння чагось сапраўднага. Лічаныя адзінкі тых, каго можна вылучыць, напрыклад, студэнта лінгвістычнага ўніверсітэта Івана Карповіча. Вельмі шкада, што мала пішуць таленавітыя Алесь Хітрун і Каця Безмацерных... Ужо цягне асэнсаваць, як чытач шырокі іх успрыме, яны ж — вышэй за пачаткоўцаў звычайных. Мне падаецца, што вінаваты і выдаўцы... Чаму б ім не заўважыць моладзь, не стварыць пэўнае спрыяння для з'яўлення іх кніг?.. Мо тады і самі таленавітыя маладыя празаікі напоўніцу выявяць свой талент. Ці адно толькі рынак, эканамічныя сурокі перашкаджаюць зірнуць уважліва на маладых, а значыць на будучыню беларускай літаратуры?!.

— Звычайна пісьменнікі неахвотна расказваюць пра планы, пра тое, што пішацца... Дык, можа быць, скажаце пра тое, што з вашых твораў яшчэ ў выдавецкай працы, чаго шукаць чытачу Андрэя Федарэнкі ў блізкай будучыні ў кнігарнях?

— Абдумваю і хачу напісаць трэцюю пасля «Шчарбатага талера» і «Афганскай шкатулкі» аповесць для падлеткаў, гэткага анты-Гары Потэра. Вялікага розуму не трэба для вырашэння ўсіх праблем пры дапамозе чароўнай палачкі. Я хачу адправіць сваіх герояў, скажам, у мінулае, дзе нічым не дапамогуць ім іхнія мабільнікі, смартфоны, ноўтбукі і іншыя «заваёвы цывілізацыі», і для таго, каб выжыць, ім спатрэбяцца вечныя чалавечыя каштоўнасці — кемлівасць, спрыт, розум, інтуіцыя ці, калі хочаце, прыродны інстынкт... Што тычыцца больш блізкіх планаў — у выдавецтве «Галіяфы» запланавана кніга эсэ «Сечка», у нашым выдавецтве «Літаратура і мастацтва» — кніга «Мяжа», дзе акрамя аднайменнага рамана сабраны лепшыя мае апавяданні, напісаныя цягам апошніх 20 гадоў.

Гутарыў Мікола БЕРЛЕЖ.

Дзённік бландзінкі

БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА ЯК ТАВАР

Была на кангрэсе беларусістаў... І чарговы раз пачула пытанне, ці, хутчэй, сцвярджэнне: «А навошта займацца постмадэрнізмам, калі ў Еўропе ён даўно не модны?»

Што цікава, не прайшло і пяці хвілін, як прагучала другое, не менш задаванае пытанне: «А навошта разглядаць літаратуру ў панятках мужчынскае/жаночае, калі ў свеце фемінізм ужо аджыў сваё?»

Забаўна, гэтыя сцвярджэнні пра тое, што постмадэрнізм і фемінізм — з'явы настолькі састарэлыя, што і займацца імі не варта, — я чую роўна з той пары, як упершыню пачула гэтыя словы! Гэта значыць, пакуль адна частка нашага грамадства яшчэ і ведаць не ведала пра іх існаванне, другая (што праўда, малалікая) — ужо сцвярджала: усё гэта не модна і не актуальна... Узнікае пытанне — а што модна, што актуальна? Якія вусны цяпер носяць? І ці варта пад кожны буйны сход мяняць паняційны апарат і абвяшчаць з'яўленне новага «ізму»?

Іншым разам узнікае адчуванне, што некаторыя чакаюць: у гуманітарных навуках кірункі павінны мяняцца, як у фэшн-індустрыі, — з кожным сезонам. Вось толькі аднасілі «новую шчырасць» (якая, нагадаю, адносіцца да постмадэрнізму), як ужо прымяраюць «новы рэалізм» (які нейкім бокам павінен адносіцца да рэалізму, але, як тлумачаць яго маці-заснавальніцы, і побач каля яго не стаіць)... У чым іх прынцыповая навізна, уцямна вам ніхто не растлумачыць.

Наогул, мне здаецца, што гэтыя размовы пра модна-нямодна, актуальна-неактуальна, якія дасягнулі ўжо навуковых кангрэсаў, ідуць ад сённяшняга разумення таго, што культура ёсць у першую чаргу **тавар**. Дакладней, павінна была ім стаць...

Вось як піша пра гэта беларускі філосаф Павал Баркоўскі ў сваім артыкуле «Пра капітал, культурнае развіццё і культурную палітыку»: «Каб быць больш паспяховым (эфектыўным) у культуры, трэба быць больш і лепш прадаваным. Культура спажывання — гэта такая культура, дзе аўтар апынаецца прадаўцом, глядач — спажыўцом, а твор стаецца таварам. Зрэшты нават не Таварам, а наўпрост — таварам, пасярод іншых у спажывецкім кошыку...»

Як сцвярджае аўтар, усё гэта ўжо дзейнічае менавіта тут і цяпер, на нашай тэрыторыі, і «найноўшая беларуская культура ёсць культурай спектакля — увасабленнем сусвету імітацыі і спажывання»!

Я амаль згадзілася з такім прагрэсіўным разуменнем нашай айчыннай культуры, каб не адзін прыклад, які вярнуў мяне да рэальнасці, бо добра вядомы мне з паўсядзённай практыкі.

Баркоўскі піша: «Напрыклад, нам прапаноўваюць набыць новую мадэль мабільнага альбо камп'ютара не таму, што больш старыя мадэлі не выконваюць сваіх функцый, а таму, што больш новы тавар адмыслова валодае большым наборам гэтых функцый, г.зн. гарантуе падвышаны лад спажывання жыцця...Тое ж самае адбываецца ў рэчышчы культуры: мы маем развіваць беларускую культуру і стараць усё большую культурную прапанову не таму, што нам замала Багушэвічаў, Коласаў ці Караткевічаў, каб сцвярджаць яе існаванне, але таму, што новым пакаленням спажыўцоў патрэбныя культурныя прадукты з большай сукупнасцю функцый і належным мадэрным дызайнам...»

Праблема ў тым, што паралель паміж мабільнікам і беллітам не працуе... Не таму, што мая свядомасць адмаўляецца разглядаць «твор як тавар», а таму, што на нашых абшарах сапраўды ніхто не выказвае патрэбы ў такім новым культурным прадукце, як літаратура, прынамсі такой, каб яна падштурхнула пісьменнікаў-вытворцаў да «змены мадэльнага шэрагу».

Дзіўна, але з'яўляючыся даволі паспяховым рынкамістам літпрадукцыі, я тым не менш ніколі не сустракалася з прапановай выдавецтваў «пралабіраваць» іх тавар. Нараканні, што беларуская літаратура не прадаецца, — чула, а вось спробы інтэнсіфікаваць продажы беларускай кнігі настолькі незаўважныя і неэфектыўныя, што, на мой погляд, і гаварыць пра іх не варта. Не сакрэт, што менеджары па продажах пры выдавецтвах — гэта лузары, якія не знайшлі сабе іншай працы, а тая, па-сутнасці, зводзіцца да развозу накладу па кнігарнях... Капеечныя зніжкі і правядзенне прэзентацый для некалькіх дзясяткаў чалавек абсалютна не ўплываюць на прыбыткі. А калі ў вытворцаў няма прыбыткаў — пра які тавар можна гаварыць?

Абсалютна дакладна ведаю, што ні адзін з беларускіх пісьменнікаў, нават самых папулярных, не жыве на грошы з продажу кніг. З чаго вынікае выснова: або наогул уся культура не ёсць тавар; або наша нацыянальная літаратура — гэта нейкі феномен, які не можа быць разгледжаны як частка культуры; або нехта зарана паспяшаўся абвясціць, што мы жывём у «грамадстве спектакля»...

«ЗОРКІ»

Мая пяцігадовая сяброўка памяняла садок — з беларускамоўнага на звычайны, але ў цэнтры...

Вялікая розніца! Цяпер у яе выхавальніца ходзіць па групе басанож і цэлы дзень слухае «Уладзімірскі цэнтрал». Дзіцятка таксама навучылася спяваць Круга тоненькім галаском...

А яшчэ ў іх групе ёсць тры шасцігадовыя дзяўчынкі, якія пра сябе гавораць: «Мы — звёзды!»

Я ўжо даўно падазравала, што «зоркай» можна стаць толькі праз саманазыванне...

«БЕЛАЕ НЕ НАСІЦЬ, У АБЛІПКУ НЕ АПРАНАЦЬ, А ГАЛОЎНАЕ — НЕ ТАНЦАВАЦЬ!!»

Еду днямі ў транспарце.

Насупраць жанчына пенсійнага, а можа і перадпенсійнага ўзросту чытае невялікую кніжку, старанна абгорнутую ў старую зжоўклую газету. Чытае старанна, як першакласнік, прагаворваючы, хоць і ціха, словы ўголас. Я ўжо даўно не бачыла, каб хто так занурваўся ў чытво... Прыпынак. Жанчына апускае рукі і ў мяне з'яўляецца магчымасць прачытаць назву: «Як паводзіць сябе на могілках»...

Ганна КІСЛІЦЫНА.

P.S. *Дарэчы, учора быў Сусветны дзень бландзінак.*

Открытое акционерное общество «Дорожно-строительный трест № 3» – продавец (организатор аукциона) 29 июня 2010 года проводит открытый аукцион по продаже имущества с применением метода понижения начальной цены продажи

№ п/п	Сведения о предмете аукциона	Начальная цена предмета аукциона, бел. руб.	Место нахождения имущества	Сумма задатка, бел. руб.
Лот № 1	Баня (площадь 191 кв. м)	133 710 236	Могилевская область, Горецкий район, г. Горки, ул. Мира, 20А	13 371 024
	Забор ж/б панелей 79 м²			
	Мазутная (площадь 100 кв. м)			
	Котельная (площадь 529,4 кв.м)			

1. Наименование продавца – организатора аукциона, его место нахождения и контактные телефоны: ОАО «ДСТ № 3», г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, тел. 26 34 24, 28 41 00.
2. Дата, время и место проведения аукциона: 29.06.2010 г. в 11.00 по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, каб. 34.
3. Порядок, в соответствии с которым проводится аукцион: Положение о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества от 28.05.2009 г. При подаче заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, подписывает с ОАО «ДСТ № 3» соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.
4. Информация о земельном участке: Площадь земельного участка – 1,3016 га, кадастровый номер – 722050200001006510.
5. Реквизиты текущего (расчетного) счета, на который должна быть перечислена сумма задатка: р/с 3012008900015 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Могилевской области, код 355, УНП 700049607, ОКПО 03454762.
6. Место, дата и время окончания приема заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, кабинет 33; дата: 28.06.2010 г.; время: 17.00.
7. Срок возможного снятия имущества с аукциона: за 3 дня до даты проведения аукциона.
8. Сроки подписания договора купли-продажи: в течение 10 рабочих дней после проведения аукциона.
9. Извещения о проведении открытых аукционов с понижением начальной цены на 20 % и 50 % по продаже имущества ОАО «ДСТ № 3» опубликованы в газете «Звязда» № 212 от 10.11.2009 г., № 16 от 29.01.2010 г., с применением метода понижения начальной цены № 52 от 23.03.2010 г., № 71 от 10.04.2010 г., № 87 от 07.05.2010 г.

Вытокі

Адкуль бліжэй да космасу: з Жоўкіна ці Каменя

АБЛАСНЫ грамадска-культурны цэнтр у Брэсце распачаў цікавую работу па ажыўленні абрадаў і народных традыцый Палесся. Цыкл атрымаў назву «Рух зямлі». У адпаведнасці з народным календаром на сцэне АКЦ праходзяць паказы святочных абрадаў. Выканаўцаў гэтых дзей аўтар праекта, начальнік аддзела традыцыйнай культуры Ларыса БЫЦКО, прывозіць з самай глыбінкі. Так было і на гэты раз. Імпрэза прысвячалася траецкім абрадам. Фальклорны гурт Жоўкінскага Дома культуры Пінскага раёна першы раз выступаў у абласным цэнтры. Жанчыны вельмі хвалявaліся.

Яны прыехалі ў прыгожых строях, вышытых у асноўным сваімі рукамі. І толькі самай маладзейшай удзельніцы гурта сукенка засталася ад бабулі, якую тая вышывала ў дзяворцтве, недзе ў 1905—1910 гадах. Спачатку жанчыны з вёскі Жоўкіна, якая знаходзіцца на паўднёвым захадзе Піншчыны, спявалі веснавыя песні, потым прыступілі да апранання Куста. Убор для Куста зрабілі спрэс кляновы, вельмі густы, з-за лістоў амаль не было бачна маладой жанчыны, якая іграла гэту ролю. У тым і асаблівасць жоўкінскай традыцыі. А калі пайшлі гуляць — гэта значыць вадзіць Куста ад хаты да хаты — тут пасыпаліся жарты, смешкі, прыпеўкі. Гаспадару з гаспадыняй жадалі добрага ўраджаю, прыплоду ў хляве, дабрабыту — у хаце. Калі ў знак падзякі за віншаванне давалі грошы, то («кустоўшчыкі» па аналогіі з калядоўшчыкамі. — **С.Я.**) гаварылі: «Няхай вашыя тысячы вам мільёнамі вернуцца».

Гурт «Багатуха» з вёскі Камень Пінскага раёна таксама паказваў Куста, але крыху паіншаму. Вядома, у кожнай вёсцы былі свае асаблівасці святкавання. І «Багатухі» — сталыя артысты, іх калектыў мае званне народнага. Яны паказалі ўсю дзею вельмі хораша, дынамічна. У іх ёсць свае іскрынкі, напрыклад, «агляд двара». Госці з Кустом аглядаюць двор, цікавяцца, як вядзецца гаспадарка. Гаспадар з гаспадыняй, якія прымаюць гасцей, запрашаюць паспяваць, прапаноўваюць пачастункі, са сваёй роляй спраўляюцца не горш за сапраўдных артыстаў. Але ў іх выкананні адчуваецца пастаноўка, рэжысура, што натуральна. А ў выкананні жанчын з Жоўкіна ёсць натуральная адвечнасць, хоць трымаліся яны, зразумела, больш напружана і нерашуча. Але ў іх некранутасці — іх каштоўнасць як крыніцы ведаў пра траецкі абрад. Іхні спрэс адзеты ў галінкі Куст, з якога адны лапці тырчалі, разам з пахам аеру і зялёнай лістоты нагадваў пра спрадвечнае яднанне чалавека з прыродай яшчэ ад тых часоў, калі людзі верылі ў сілу такіх вось магічных дзеянняў. Як усклікнула Ларыса Быцко, калі павялі першага Куста: «Гэта ж нейкі космас!». І праўда, абрад, які згадваецца ў летапісах XII стагоддзя і цудам захаваўся да нашага часу ў Івацэвіцкім, Іванаўскім, Пінскім, Столінскім, Лунінецкім, Бярозаўскім раёнах і на захадзе ўкраінскага Палесся, — выглядае прыгожа-загадкавым і ўзнёсла-рамантычным.

Ніна Васільеўна ФІСЮК.

Яшчэ адзін гурт з Парэчча, што радаваў гледачоў тым вечарам, паказаў траецкія, веснавыя, летнія песні. Удзельніца калектыву з Парэчча 87-гадовая Ніна Васільеўна Фісюк — скарбніца гэтых песень. Яна выканала нават некалькі сольных нумароў. І прыбавіла ўсім не проста настрою, бадзёрасці, але і сапраўднай станоўчай энергетыкі. Вось тут і ўспомнілася метафара Ларысы пра космас. Вясковыя кабеты без усялякага акампанементу, як і раней іх маці ды бабулі на вячорках, спявалі пра вясну і ўраджай, пра каханне і разлуку, і радавалася, спявала ўслед за імі душа.

Варта дадаць, што прыгожы абрадавы канцэрт праходзіў на фоне выставы ручнікоў, посцілак, якія спецыяльна прывезла дырэктар Аснежыцкага дома рамёствaў Галіна Шчасная. Творы мастацтва палескіх майстрых вельмі розныя, але кожны з іх адлюстроўвае каларыт сваёй мясцовасці. Як слушна заўважыла **начальнік аддзела культасветработы абласнога ўпраўлення культуры Таццяна ШЧАРБУК**, падтрымліваць такія самабытныя калектывы, захоўваць іх песні, абрады — святы абавязак сучаснікаў, бо менавіта з вытокаў народнай культуры пачынаецца разуменне сутнасці народа, пачынаецца тое, што прынята называць патрыятызмам.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Апрананне жоўкінскага Куста.

Выставы

ГІСТОРЫЯ ВЕРЫ

У Магілёўскай Ратушы адкрылася выстава «Сакральныя коды вечнасці»

— Рэлігія нясе ў сабе таямніцу і мудрасць, — тлумачыць **дырэктар Музея гісторыі Магілёва Сяргей КЛІМАЎ**. — Яны раскрываюцца нам праз веды і розныя рэчы. На нашай выставе прадстаўлены экспанаты, якія дазволяць сучаснікам дэкадзіраваць і прачытаць гэтую векавую мудрасць.

Архангел Міхаіл — беларускі абраз з фондаў Нацыянальнага мастацкага музея.

На выставе дэманструюцца абразы і розныя металічныя прадметы, якія ахопліваюць час ад VI да XX стагоддзяў і эпоху ад паганства да хрысціянства, розных яго канфесій. У адной зале сабраны экспанаты з Нацыянальнага мастацкага музея, дзвюх прыватных калекцый і збору мясцовых знаходак Музея гісторыі Магілёва.

Самыя старыя на выставе — бранзалеты, якія былі знойдзены ў Магілёве, ва ўрочышчы Змяёўка гісторыкам і археолагам Аляксандрам Марзалюком. Яны зялёнага колеру ад паціны мінулых вякоў. Сучасную жанчыну здзівіць памер бранзалетаў — надта маленькі, на хударлявую руку. Відаць, у V—VII стагоддзях, якімі датуюцца знаходкі, жанчыны былі стройныя і не мелі праблем з лішняй вагой з-за кароткага харчовага ланцуга.

Жаночыя ўпрыгажэнні дапаўняюць скроневыя колцы, шыйныя грыўні, пярсцёнкі і, безумоўна, абярэгі. Сярод амулетаў вылучаецца прыгожы «рысік» альбо «конік», які трымалі ад рознай напасці мужчыны і жанчыны ў XI—XIII стагоддзях. А вось «ключ» — гэта цалкам жаночы абярэг, для дабрабыту і ўрадлівасці. Побач лунніца і салярная падвеска: Луна і Сонца таксама былі добрымі талісманамі.

— Хрысціяне за тым часам, як здараецца і цяпер, не адмаўляліся ад паганскіх абярэгаў і часам насілі іх на шыі разам з крыжыкам, — каментуе Сяргей Клімаў. — А вось паглядзіце на калекцыю крыжоў. Найбольш дарагі з іх — маленькі срэбны стараверскі крыжык з закругленнямі. Вельмі рэдкі і, уявіце, яму ўжо больш за 1000 гадоў.

Георгіеўскі крыж знайшлі ў тайніку старога магілёўскага дома.

Сярод крыжоў ёсць і Георгіеўскі крыж 4-й ступені. Сяргей Клімаў распавёў, што ён сам знайшоў гэтую ўзнагароду ў старым доме на вуліцы Лазарэнкі ў Магілёве. Ён ляжаў у тайніку, у цаглянай кладцы і, верагодна, быў схаваны ў смутныя рэвалюцыйныя часіны чалавекам, які служыў у Стаўцы імператара Мікалая II у Магілёве.

На выставе можна пабачыць крыжы-машчавікі, у якіх захоўваліся звычайна часткі мошчаў святых альбо зямля са святых месцаў. На маленькім нацельным абразку адзін з самых папулярных у сярэднявечча хрысціянскіх сюжэтаў — вялікапакутнік Мікіта, які перамагае д'ябла. Высакароднымі фарбамі прыцягваюць увагу літыя абразы, з эмалямі і пазалотай, якія прапанаваў музею прыватны калекцыянер з Магілёва.

Частку драўлянага распяцця пачатку XIX стагоддзя прывезлі з Круглянскага раёна. Гэта вельмі каштоўны экспанат, таму што такіх рэчаў зусім не засталося. Адметнасць распяцця — гэта выдрапаныя на грудзях Хрыста імёны. Верагодна, што гэта зрабілі дзеці, бо лёгка чытаецца «Олька». Распяцце будуць рэстаўраваць, але, лічыць Сяргей Клімаў, драпіны трэба пакінуць як сімвал часу.

Гэтыя прадметы дапаўняюць абразы. Усе яны ў свой час былі канфіскаваныя брэсцкімі мытнікамі і прыведзеныя ў парадак у Нацыянальным мастацкім музеі. Сярод усіх вылучаецца напісаны ў традыцыйнай беларускай манеры прыгожы абраз Архангела Міхаіла.

Ілона ІВАНОВА. Фота Ірыны САВОСІНАЙ.

РАСКЛАД РУХУ ПАСАЖЫРСКІХ ЦЯГНІКОЎ ПА СТАНЦЫІ МІНСК-ПАСАЖЫРСКІ

УП «МІНСКАЕ АДДЗЯЛЕННЕ БЕЛАРУСКАЙ ЧЫГУНКІ» З 30 МАЯ 2010 ГОДА

№ катэгорыя цягніка	Маршрут руху	Час адпраўлення з пач. станцыі	Па станцыі Мінск-Пасажырскі			Час		Дні абарачэння
			Час прыбыцця	Стаянка	Час адпраўлення	Прыбыццё на канцавыя станцыі	У дарозе	
НА МАСКВУ								
12 хуткі	Варшава—Масква	13.00	23.42	0.29	0.11	10.33	9.22	штодня
68 хуткі	Брэст—Валгаград	20.45	0.53	0.30	1.23	18.31	40.08	з 1/6 па 16/10 аўторак, чацвер, субота; з 21/10 чацвер, субота
10 хуткі	Варшава—Масква	15.55	1.58	0.13	2.11	11.45	8.34	штодня
148 хуткі	Калінінград—Масква	16.39	2.58	0.25	3.23	15.21	10.58	з 7/6 па 6/9 штодня; з 7/9 па няцотных
196 хуткі	Брэст—Масква	21.44	3.16	0.24	3.40	16.23	11.43	штодня
132 хуткі	Брэст—Масква	4.26	8.37	0.16	8.53	19.54	10.01	штодня
14 хуткі	Берлін—Масква	15.32	10.46	0.28	11.14	20.35	8.21	па 4/10 штодня, акрамя аўторка, нядзелі з 6/10 па-нядзелак, серада, субота
70 хуткі	Берлін—Саратаў	15.32	10.46	0.28	11.14	15.12	26.58	з 6/6 па 27/9 нядзеля, аўторак; з 1/10 нядзеля
214 хуткі	Брэст—Екацярынбург	11.10	15.48	0.16	16.04	11.32	42.28	з 7/6 па 13/9 панядзелак
114 хуткі	Брэст—Новасібірск	11.10	15.48	0.16	16.04	10.37	65.33	субота
144 хуткі	Брэст—Новасібірск	11.10	15.48	0.16	16.04	10.37	65.33	аўторак
64 хуткі	Мінск—Іркуцк	-	-	-	16.04	17.41	96.37	чацвер, нядзеля
26 хуткі	Мінск—Масква	-	-	-	18.26	5.56	10.30	штодня
304 пасаж	Брэст—Чалябінск	13.55	19.28	0.25	19.53	6.43	57.50	пятніца
426 пасаж	Калінінград—Чалябінск	8.53	19.32	0.21	19.53	6.43	57.50	17, 26/6; 6, 15, 24/7; 3, 12, 21/8
414 пасаж	Мінск—Чалябінск	-	-	-	19.53	6.43	57.50	з 31/5 па 18/10 панядзелак
22 хуткі	Прага—Масква	23.00	21.02	0.16	21.18	8.05	9.47	штодня
4 хуткі	Мінск—Масква	-	-	-	21.47	6.34	7.47	па няцотных
8 хуткі	Мінск—Масква	-	-	-	21.47	6.34	7.47	па цотных
2 хуткі	Мінск—Масква	-	-	-	21.55	8.48	9.53	штодня
6 хуткі	Вільнюс—Масква	17.00	21.40	0.23	22.03	8.58	9.55	штодня
28 хуткі	Брэст—Масква	17.40	22.03	0.15	22.18	9.20	10.02	штодня
30 хуткі	Калінінград—Масква	11.50	22.14	0.23	22.37	9.27	9.50	па 30/9 штодня; з 1/10 па няцотных
392 пасаж	Гродна—Унеча	16.00	22.45	0.22	23.07	11.18	11.11	па няцотных
78 хуткі	Гродна—Масква	17.22	23.12	0.20	23.32	10.26	9.54	штодня
НА ПОЛАЦК, ВІЦЕБСК, С.-ПЕЦЯРБУРГ								
58 хуткі	Гродна-С. Пецярбург	17.48	0.42	0.13	0.55	17.34	15.39	з 31/5 па 3/9 панядзелак, серада, пятніца, нядзеля; з 5/9 па 14/11 нядзеля; з 19/11 па 18/4 панядзелак, пятніца; з 20/4 панядзелак, серада, пятніца
142 хуткі	Брэст—Віцебск	20.34	6.08	0.14	6.22	11.00	4.38	па цотных
326 пасаж	Мінск—Мурманск	-	-	-	7.54	7.15	46.21	з 1/6 па 14/9 аўторак, пятніца, нядзеля; з 17/9 пятніца, нядзеля
48 хуткі	Львоў—С. Пецярбург	23.12	12.33	0.13	12.46	5.18	15.32	па няцотных
118 хуткі	Мінск—Віцебск	-	-	-	16.50	21.03	4.13	штодня, акрамя серады
625 пасаж	Мінск—Полацк	-	-	-	17.08	23.00	5.52	штодня
52 хуткі	Мінск—С. Пецярбург	-	-	-	17.41	8.40	13.59	штодня
50 хуткі	Брэст—С. Пецярбург	14.05	18.28	0.20	18.48	9.36	13.48	штодня
624 пасаж	Гродна—Віцебск	16.00	22.45	0.22	23.07	5.59	5.06	па цотных
612 пасаж	Баранавічы—Віцебск—Полацк	21.21	23.32	0.16	23.48	5.48 8.35	5.36 8.47	штодня
НА КАЛІНІНГРАД, РЫГУ, ВІЛЬНЮС								
5 хуткі	Масква—Вільнюс	18.55	3.08	0.25	3.33	8.00	4.27	штодня
425 пасаж	Чалябінск—Калінінград	20.00	4.02	0.27	4.29	16.29	11.00	23/6; 2,12,21,30/7; 9,18,27/8
147 хуткі	Масква—Калінінград	19.26	4.56	0.22	5.18	18.09	11.51	з 8/6 па 7/9 штодня; з 8/9 па цотных
305 пасаж	Магілёў—Вільнюс	23.58	5.38	0.52	6.30	11.08	4.38	штодня
307 пасаж	Мінск—Вільнюс	-	-	-	18.14	22.05	3.51	штодня
359 пасаж	Адлер—Калінінград	14.36	18.17	0.23	18.40	7.24	11.44	па 1/7 і з 7/9 па 7, 11, 15, 19, 23, 27, 31 чыслах кожнага месяца; з 5/7 па 31/8 па няцотных і 2/9
311 пасаж	Харкаў—Калінінград	0.50	19.19	0.28	19.47	8.33	11.46	па няцотных
29 хуткі	Масква—Калінінград	13.54	23.21	0.25	23.46	12.03	11.17	па 1/10 штодня са 2/10 па цотных
НА ГОМЕЛЬ, КІЕЎ, СОЧЫ, СІМФЕРОПАЛЬ								
330 пасаж	Баранавічы—Жытомір	22.20	0.21	0.22	0.43	12.40	11.57	штодня
140 хуткі	Мінск—Сімферопаль	-	-	-	0.59	5.18	28.19	з 18/6 па 24/9 па цотных
312 пасаж	Калінінград—Харкаў	14.01	0.30	0.29	0.59	19.21	18.22	па няцотных
360 пасаж	Калінінград—Адлер	17.56	4.23	0.21	4.44	8.28	50.44	па 27/6 і 3/9 па 3, 7, 11, 15, 19, 23, 27 чыслах кожнага месяца; з 1/7 па 31/8 па няцотных
146 хуткі	Брэст—Магілёў	20.34	6.08	0.14	6.22	11.32	5.10	па няцотных
616 пасаж	Гродна—Гомель	23.23	7.16	0.28	7.44	12.24	4.40	штодня
100 хуткі	Мінск—Сімферопаль	-	-	-	8.44	10.39	25.55	з 1/6 па 30/9 штодня з 1/10 па няцотных
382 пасаж	Мінск—Сімферопаль	-	-	-	9.50	15.46	29.56	па 6,10,14,18,22,26, 30 чыслах кожнага месяца
94 хуткі	Мінск— Адэса	-	-	-	11.31	10.26	22.55	па 10/6 і са 2/10 па цотных; з 11/6 па 30/9 штодня
96 хуткі	Мінск—Гомель	-	-	-	15.04	19.32	4.28	штодня, акрамя чацвярга
98 хуткі	Мінск—Гомель	-	-	-	15.04	19.32	4.28	чацвер
104 хуткі	Мінск—Магілёў	-	-	-	15.42	19.23	3.41	штодня
806 пасаж	Мінск—Калінкавічы—Гомель	-	-	-	16.29	21.05 23.22	4.36 6.53	штодня
108 хуткі	Мінск—Гомель—Калінкавічы	-	-	-	17.15	21.26 0.13	4.11 6.58	штодня
306 пасаж	Вільнюс—Магілёў	14.16	18.50	0.19	19.09	22.59	3.50	штодня
302 пасаж	Мінск—Адлер	-	-	-	19.20	11.29	39.09	па цотных
356 пасаж	Мінск—Кіславодск	-	-	-	19.20	11.10	38.50	па 3, 7, 11, 15, 19, 23, 27, 31 чыслах кожнага месяца
390 пасаж	Мінск— Анапа	-	-	-	19.20	11.15	38.55	па 1, 5, 9, 13, 17, 21, 25, 29 чыслах кожнага месяца
486 пасаж	Мінск—Феадосія	-	-	-	20.10	1.35	29.25	з 15/6 па 21/9 па няцотных; з 1/7 па 17/9 штодня
86 хуткі	Мінск—Кіеў	-	-	-	21.25	8.33	11.08	штодня
494 пасаж	Мінск—Сімферопаль	-	-	-	22.12	4.53	30.41	з 15/6 па 21/9 па няцотных
384 пасаж	Мінск—Марыупаль	-	-	-	23.04	7.10	32.06	па няцотных
136 хуткі	Мінск—Еўпаторыя	-	-	-	23.59	4.09	28.10	з 10/6 па 30/9 штодня
НА БРЭСТ, ГРОДНА, ЛЬВОЎ								
9 хуткі	Масква—Варшава	16.50	0.10	0.12	0.22	8.25	9.03	штодня
27 хуткі	Масква—Брэст	15.43	0.53	0.17	1.10	5.30	4.20	штодня
47 хуткі	С. Пецярбург—Львоў	12.45	1.40	0.13	1.53	15.19	13.26	па няцотных
77 хуткі	Масква—Гродна	17.08	2.10	0.22	2.32	8.39	6.07	штодня
49 хуткі	С. Пецярбург—Брэст	15.03	3.55	0.13	4.08	8.24	4.16	штодня
303 пасаж	Чалябінск—Брэст	20.00	4.02	0.14	4.16	9.07	4.51	чацвер
67 хуткі	Валгаград—Брэст	12.50	4.27	0.20	4.47	9.07	4.20	з 5/6 па 20/10 панядзелак, серада, субота; з 25/10 панядзелак, серада
611 пасаж	Полацк—Віцебск—Баранавічы	18.47 22.24	4.40	0.30	5.10	7.31	2.21	штодня
329 пасаж	Жытомір—Баранавічы	16.05	5.21	0.20	5.41	7.58	2.17	штодня
11 хуткі	Масква—Варшава	21.09	5.49	0.30	6.19	15.14	9.55	штодня
195 хуткі	Масква—Брэст	19.39	6.35	0.13	6.48	12.18	5.30	штодня
21 хуткі	Масква—Прага	23.44	8.07	0.18	8.25	5.05	21.40	штодня
131 хуткі	Масква—Брэст	23.34	8.24	0.14	8.38	12.42	4.04	штодня
803 пасаж	Мінск—Брэст	-	-	-	11.40	16.07	4.27	з 6/6 нядзеля
57 хуткі	С. Пецярбург—Гродна	22.38	12.13	0.16	12.29	19.43	7.14	з 1/6 па 4/9 панядзелак, аўторак, чацвер, субота; з 6/9 па 15/11панядзелак; з 20/11 па 19/4 аўторак, субота; з 21/4 аўторак, чацвер, субота
113 хуткі	Новасібірск—Брэст	18.54	12.01	0.35	12.36	17.32	4.56	пятніца
143 хуткі	Новасібірск—Брэст	18.54	12.01	0.35	12.36	17.32	4.56	панядзелак
213 хуткі	Екацярынбург— Брэст	17.20	12.01	0.35	12.36	17.32	4.56	з 6/6 па 12/9 нядзеля
105 хуткі	Мінск—Брэст	-	-	-	13.35	17.56	4.21	штодня
69 хуткі	Саратаў—Берлін	11.29	14.47	0.16	15.03	9.09	19.06	6/6 па 26/9 пятніца, нядзеля; з 1/10 пятніца
13 хуткі	Масква—Берлін	8.00	15.06	0.28	15.34	9.09	18.36	па 2/10 штодня, акрамя пятніцы, нядзелі; з 4/10 панядзелак, чацвер, субота
371 пасаж	Мінск—Івана-Франкоўск	-	-	-	15.50	11.13	19.23	па 6/9 па цотных
371 пасаж	Мінск—Львоў	-	-	-	15.50	4.54	13.04	з 8/9 па цотных
137 хуткі	Мінск—Гродна	-	-	-	16.22	22.06	5.44	штодня
111 хуткі	Мінск—Брэст	-	-	-	17.29	21.42	4.13	штодня
101 хуткі	Мінск—Варна	-	-	-	17.37	8.55	39.18	з 16/6 па 1/9 серада
801 пасаж	Мінск—Брэст	-	-	-	18.47	23.18	4.31	пятніца
115 хуткі	Мінск—Варшава	-	-	-	20.40	5.46	10.06	штодня
145 хуткі	Магілёў—Брэст	18.00	22.32	0.16	22.48	8.52	10.04	з 31/5 па няцотных
141 хуткі	Віцебск—Брэст	18.03	22.32	0.16	22.48	8.52	10.04	па цотных
391 пасаж	Унеча—Гродна	12.50	23.00	0.22	23.22	5.26	6.04	па цотных
623 пасаж	Віцебск—Гродна	18.03	23.00	0.22	23.22	5.26	6.04	па няцотных
615 пасаж	Гомель—Гродна	18.28	23.10	0.23	23.33	7.16	7.43	штодня

ПРЫБЫЦЦЁ ЦЯГНІКОЎ МЯСЦОВАГА ФАРМІРАВАННЯ

№ катэгорыя цягніка	Маршрут руху	Час адпраўлення з пачатковай станцыі	Час прыбыцця ў Мінск	Дні абарачэння
413 пасаж	Чалябінск—Мінск	20.00	4.02	з 6/6 па 24/10 нядзеля
802 пасаж	Брэст—Мінск	0.45	5.23	субота
381 пасаж	Сімферопаль—Мінск	21.55	5.29	па 6, 10, 14, 18, 22, 26, 30 чыслах кожнага месяца
107 хуткі	Гомель—Мінск	21.56	5.46	штодня
3 хуткі	Масква—Мінск	23.21	6.06	па няцотных
7 хуткі	Масква—Мінск	23.21	6.06	па цотных
301 пасаж	Адлер—Мінск	16.19	6.46	па цотных
355 пасаж	Кіславодск—Мінск	16.53	6.46	па 7, 11, 15, 19, 23, 27, 31 чыслах кожнага месяца
389 пасаж	Анапа—Мінск	17.25	6.46	па 5, 9, 13, 17, 21, 25, 29 чыслах кожнага месяца
626 пасаж	Полацк—Мінск	1.00	7.00	штодня
1 хуткі	Масква—Мінск	22.25	7.28	штодня
116 хуткі	Варшава—Мінск	20.50	8.04	штодня
85 хуткі	Кіеў—Мінск	22.09	8.35	штодня
51 хуткі	С. Пецярбург—Мінск	19.08	8.51	штодня
372 пасаж	Івана-Франкоўск—Мінск	13.12	9.03	па 8 /9 па цотных
372 пасаж	Львоў—Мінск	19.02	9.03	з 10/9 па цотных
628 пасаж	Брэст—Мінск	23.34	9.10	панядзелак
139 хуткі	Сімферопаль—Мінск	7.52	10.00	з 20/6 па 26/9 па цотных
106 хуткі	Брэст—Мінск	6.20	10.30	штодня
308 пасаж	Вільнюс—Мінск	6.40	10.40	штодня
95 хуткі	Гомель—Мінск	6.37	10.40	штодня, акрамя чацвярга
97 хуткі	Гомель—Мінск	6.37	10.40	чацвер
117 хуткі	Віцебск—Мінск	6.40	10.48	штодня, акрамя серады
103 хуткі	Магілёў—Мінск	7.27	10.56	штодня
135 хуткі	Еўпаторыя—Мінск	7.35	11.13	з 13/6 па 3/10 штодня
805 пасаж	Гомель—Калінкавічы—Мінск	4.35 6.50	11.30	штодня
102 хуткі	Варна—Мінск	20.50	11.50	з 20/6 па 5/9 нядзеля
63 хуткі	Іркуцк—Мінск	11.40	12.01	аўторак, субота
138 хуткі	Гродна—Мінск	6.30	12.13	штодня
93 хуткі	Адэса—Мінск	14.30	12.53	па 12/6 і з 4/10 па цотных з 13/6 па 2/10 штодня
325 пасаж	Мурманск—Мінск	19.55	15.21	з 5/6 па 18/9 аўторак, чацвер, субота;з 21/9 аўторак, чацвер
99 хуткі	Сімферопаль—Мінск	13.35	16.12	з 3/6 па 2/10 штодня, з 3/10 па няцотных
112 хуткі	Брэст—Мінск	11.55	16.40	штодня
493 пасаж	Сімферопаль—Мінск	9.25	17.23	з 18/6 па 24/9 па цотных
485 пасаж	Феадосія—Мінск	10.17	18.36	з 18/6 па 2/7 па цотных з 4/7 па 20/9 штодня
25 хуткі	Масква—Мінск	10.29	20.06	штодня
804 пасаж	Брэст—Мінск	16.41	20.39	з 6/6 нядзеля
383 пасаж	Марыупаль—Мінск	12.12	20.41	па цотных

БЕСПЕРАСАДАЧНЫЯ ВАГОНЫ

Станцыя прызначэння	№ цягніка	Час адпраўлення	Станцыя і час перапрычэпкі			Час		Дні абарачэння	Прыбыццё назад у Мінск		
			прыбыццё		адпраўленне	прыб. на кан. ст.	у дарозе		№ цягніка	час прыб.	Дні прыбыцця
Мінск—Кішынёў	312	0.59	4.10	Жлобін	7.09	7.16	30.17	па няцотных	615	23.10	па няцотных
Мінск—Амстэрдам	11	6.19				10.29	29.10	аўторак, серада, нядз.	12	23.42	аўтор., чацв., пятн.
Мінск—Базель	11	6.19				10.37	29.18	штодня	12	23.42	штодня
Мінск—Адлер	616	7.44	12.24	Гомель	17.40	11.29	50.45	па няцотных	311	19.19	па няцотных
Мінск—Прага	21	8.25	-	-	-	5.05	21.40	панядз., серада, суб.	22	21.02	панядз., серада, пятн.
Мінск—Вена	21	8.25	-	-	-	6.03	21.38	пятніца	22	21.02	нядзеля
Мінск—Будапешт	21	8.25	-	-	-	8.32	25.07	па 3/10 чацвер, нядзеля	22	21.02	па 5/10 аўторак, субота
Мінск—Масква	96	15.04	19.35	Гомель	20.11	11.40	19.36	па 20/9 штодня; з 22/9 па цотных	95	10.40	па 22/9 штодня; з 24/9 па цотных
Мінск—Берлін	69	15.03	-	-	-	9.09	19.06	па 26/9 нядзеля	70	10.46	па 28/9 аўторак
Мінск—Берлін	13	15.33	-	-	-	9.09	18.36	па 2/10 штодня, акрамя пятн., нядз.; з 4/10 панядзелак, чацвер, субота	14	10.46	па 4/10 штодня, акрамя аўторка, нядзелі; з 6/10 панядз., серада, суб.
Мінск—Трускавец	371	15.50	4.54	Львоў	8.40	11.49	19.59	па цотных	372	9.03	па цотных
Мінск—Астана	114	16.04	11.32	Екацярынбург	17.55	19.48	72.44	аўторак, субота	63	12.01	аўторак, субота
Мінск—Сургут	114	16.04	17.43	Цюмень	19.00	9.08	64.04	субота	113	12.01	пятніца
Мінск—Друя	625	17.08	20.46	Крулеўшчызна	2.26	6.40	13.32	штодня	626	7.00	штодня
Мінск—Пскоў	52	17.41	4.48	Дно	5.43	7.30	12.49	панядзелак, чацвер	51	8.51	панядзелак, чацвер
Мінск—Херсон	86	21.25	1.32	Гомель	3.29	23.19	25.54	з 8/6 па 12/9 па 8, 12, 16, 20, 24, 28 чыслах кожнага месяца	311	19.19	з 7/6 па 11/9 па 7, 11, 15, 19, 23, 27 чыслах кожнага месяца
Мінск—Сімферопаль	86	21.25	1.32	Гомель	3.29	4.53	31.28	па 12/6 і з 12/9 па 4, 8, 12, 16, 20, 24, 28 чыслах кожнага месяца	311	19.19	па 15/6 і з 15/9 па 7, 11, 15, 19, 23, 27, 31 чыслах кожнага месяца
Мінск—Сафія	86	21.25	8.33	Кіеў	15.55	5.55	56.30	з 12/6 па 31/8 аўторак, субота; па 5/6 і з 4/9 субота	615	23.10	з 17/6 па 5/9 панядзелак, пятніца; па 10/6 і з 9/9 пятніца

ПАВАЖАНЫЯ ПАСАЖЫРЫ!

Станцыя Мінск-Пасажырскі прапануе наступныя віды паслуг для пасажыраў:

1. Прыём групавых заявак на афармленне месцаў па наяўным і безнаяўным разліку — вул. Бабруйская, 4, касы №№ 2, 3.

2. Продаж білетаў з дастаўкай на дом і на прадпрыемствы — тэл. 225 62 46.

3. Выдача праязных дакументаў прадпрыемствам, міністэрствам і ведамствам па загадзя пералічаных сумах — тэл. 225 21 27.

4. Папярэдні прыём і афармленне да перавозкі багажу, грузабагажу, ручной паклажы грамадзян, арганізацый і прадпрыемстваў — тэл. 225 56 01.

ЗАЎВАГА:

Час адпраўлення — мясцовы.

1. Папярэдні продаж білетаў ажыццяўляецца касамі па вул. Варанянскага, 6, акрамя нядзелі; па пр-це Незалежнасці, 18 штодня.

2. Па тэл. 225 70 51 можна забраніраваць месцы на ўсе цягнікі з наступным афармленнем праязных дакументаў ва ўсіх касах: па вул. Варанянскага, 6, пр-т Незалежнасці, 18.

3. Браніраванне і дастаўка білетаў праз інтэрнэт: http: //www.rw.by.

4. За зменамі ў раскладзе руху цягнікоў і іх адменай неабходна сачыць па раскладзе на вакзале, а таксама звяртацца ў бюро даведак па тэл.: 225 54 10, 225 70 00.

Кірмаш штотыднёвы рэкламны выпуск № 11 (636)
аддзел рэкламы 287 17 79

ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

ПРАДАЕЦЦА

❐ Дача.
Тэл.: (8 017) 217 71 66, vel 377 72 71, МТС 507 72 71.
Прычэп, запчасткі, гума да МТЗ.
Тэл. 754 52 55.
❐ Інвалідная каляска.
Тэл. (8 0177) 74 59 23.

ЗВЯЗДА
КУПОН ДЛЯ БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБ'ЯВЫ
Запоўніце разборліва, выражце і вышліце на адрас рэдакцыі:
220013 Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 А. Тэлефон для даведак 287 17 79.

АБАВЯЗКОВЫЯ звесткі не для друку: ВАША ПРОЗВІШЧА, АДРАС, ХАТНІ ТЭЛЕФОН.

Пашпарт, серыя_____ №_____ Выдадзены _____

Подпіс _____ Дата _____

АБ'ЯДНАННЕ ААТ «ТЭХНАБАНК» І ААТ «БЕЛАРУСКІ ІНДУСТРЫЯЛЬНЫ БАНК»

24 мая 2010 года на сумеснай нарадзе акцыянераў ААТ «Беларускі Індустрыяльны Банк» і ААТ «Тэхнабанк» прынята рашэнне аб рэарганізацыі абедзвюх фінансавых устаноў.

25 мая ў Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусь пададзены дакументы, неабходныя для рэгістрацыі аб'яднанага банка, які будзе насіць назву ААТ «Тэхнабанк». Гэта назва прызнана на сёння акцыянерамі найбольш трапнай па прычынах пазнавальнасці брэнда, які характарызуецца пастаянным удасканальваннем банкаўскіх тэхналогій, што выкарыстоўваюцца ў яго рабоце, добрым гучаннем і лаканічнасцю, што зручна для правядзення рэкламных кампаній.

У структуры акцыянернага капіталу пераважаюць фізічныя асобы — грамадзяне Беларусі. Па дамоўленасці паміж акцыянерамі кантрольны пакет будзе належаць акцыянерам ААТ «Беларускі Індустрыяльны Банк».

Такім чынам, на рынку з'явіцца банк з прыватным беларускім капіталам больш за 25 млн еўра, які валодае поўным спектрам ліцэнзійных паўнамоцтваў двух банкаў, якія аб'ядноўваюцца. Банк будзе прадстаўлены ў сталіцы, а таксама абласных цэнтрах за кошт філіяльнай сеткі, што ёсць сёння ў ААТ «Беларускі Індустрыяльны Банк».

Акцыянеры банка, самі з'яўляючыся прадстаўнікамі беларускага бізнэсу і добра разумеючы патрэбы кліентаў на рынку, будуць садзейнічаць правядзенню палітыкі банка, максімальна накіраванай на падтрымку і развіццё бізнэсу сваіх кліентаў. Аб'яднанне банкаў дазволіць пашырыць спектр паслуг, павысіць якасць абслугоўвання, а таксама даць кліентам шырокія магчымасці па крэдытаванні. Пры гэтым банк працягне праводзіць гнуткую і выгадную для кліентаў тарыфную палітыку.

Аб'яднаны банк прапануе насельніцтву шырокі спектр паслуг, у тым ліку і эксклюзіўных. Банк (адзіны ў краіне) ажыццяўляе аперацыі з электроннымі грашыма ў сістэме WebMoney Transfer, ажыццяўляе пакрыццё часткі ПДВ па чэках TAX FREE. Фізічныя асобы могуць ажыццяўляць грашовыя пераводы праз міжнародныя плацежныя сістэмы Western Union, Anelik, Migom, MoneyGram, Contact і Юністрым, выбіраючы найбольш прывабныя ўмовы па кошце і хуткасці правядзення пераводу. Пры гэтым банк працягвае актыўную работу на рынку пластыкавых картак і дэпазітаў, прапануючы кліентам выгадныя і гнуткія ўмовы правядзення разлікаў і збяражэння сродкаў.

Рэарганізаваны ААТ «Тэхнабанк» першачарговую ўвагу будзе надаваць выкананню нарматываў ліквіднасці, дастатковасці капіталу і іншых нарматываў бяспечнага функцыянавання, вызначаных для банкаў Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь. Палітыка ААТ «Тэхнабанк» будзе накіравана на стабільнае і ўстойлівае развіццё з улікам інтарэсаў кліентаў і акцыянераў. Пры гэтым першыя два гады сваёй дзейнасці банк плануе капіталізаваць прыбытак, што будзе садзейнічаць нарошчванню нарматыўнага капіталу банка і дасць новыя магчымасці для пашырэння дзейнасці.

ПАЙШОЎ ПА ВЕНІКІ І ЗАБЛУДЗІЎСЯ

Жыхара Дубровенскага раёна, які пайшоў з двума таварышамі ў лес па венікі і заблудзіўся, на працягу прыкладна 11 гадзін давялося шукаць выратавальнікам, міліцыянерам, леснікам...

Як паведаміла «Звяздзе» прэс-сакратар Віцебскага абласнога ўпраўлення па надзвычайных сітуацыях Марына Фандо, усяго ў склад пошукавых груп увайшлі 14 чалавек. Пошукі ўскладняліся тым, што ў 45-гадовага жыхара Асінторфскага сельсавета не было пры сабе мабільнага тэлефона. Толькі на наступны дзень пасля знікнення грамадзяніна знайшоў ляснік ля вёскі Петрыкі. Медыцынская дапамога яму не патрэбна.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ДУМАЎ, ШТО СХАВАЎ

Гаспадар дома, які жыве ў Пінску па вул. Канарэева, вырашыў схаваць грошы ў адрыне на падворку.

Але нехта даведаўся, што грошы там, ноччу сарваў навясны замок з дзвярэй, а да ўразнога падабраў ключ і выкраў прыхаванае. Чалавек застаўся без 13 млн рублёў і 2 тыс. долараў.

Міліцыя выйшла на злодзея, але 24-гадовы беспрацоўны збег і цяпер яго шукаюць.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении открытого аукциона по продаже земельных участков в частную собственность для индивидуального жилищного строительства

ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА – ЧАПАЕВСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

Номер лота	1
Адрес земельного участка (кадастровый номер)	Верхнедвинский район, д. Залучье (221089204601000015)
Площадь участка, га	0,25
Целевое назначение	Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома
Условие проведения аукциона	Наличие не менее двух участников
Ограничения в использовании участка	На площадь 0,2500 га — водоохранная зона водного объекта (озеро Лисно) вне прибрежных полос, на площадь 0,0158 га — охранная зона линии электропередач выше 1000 Вольт
Инженерная инфраструктура	Участок расположен в зоне жилой усадебной застройки, существует возможность подключения к сетям энергоснабжения
Начальная цена, рублей	80 990
Сумма задатка, рублей	8100
Расходы, связанные с организацией, проведением аукциона, рублей	84 000 (кроме того, расходы по размещению настоящего извещения в СМИ)

1. Аукцион состоится **9 июля 2010 г.** в 15 часов в здании Верхнедвинского райисполкома по адресу: г. Верхнедвинск, ул. Кооперативная, 1 (малый зал заседаний).

2. Для участия в аукционе гражданин (лично либо через своего представителя) подает заявление об участии в аукционе с указанием кадастрового номера и адреса земельного участка, который желает приобрести в частную собственность, а также заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка на р/с 3600313101016 в ф. 206 АСБ «Беларусбанк» г. Верхнедвинска, МФО 150801638, УНП 300062759, получатель — Чапаевский сельисполком, назначение платежа 04002, также необходимо подписать установленной формы соглашение с организатором аукциона. Кроме того, представляются: гражданином — копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина — нотариально удостоверенная доверенность, а также паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

3. Заявления на участие в аукционе принимаются по рабочим дням с 9.00 до 17.00 (обеденный перерыв с 13.00 до 14.00) по **5 июля 2010 г.** (включительно) в Чапаевском сельисполкоме по адресу: Верхнедвинский район, п. Чапаевский. Заключительная регистрация участников аукциона с 14.00 до 14.45 в день аукциона по адресу: г. Верхнедвинск, ул. Кооперативная, 1, каб. 22.

К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

4. Победитель аукциона — участник, предложивший наибольшую цену. Предмет аукциона не может быть продан по начальной цене.

5. Участник, ставший победителем аукциона, после окончания аукциона обязан: подписать протокол аукциона в день проведения аукциона; не позднее 10 дней после вступления в силу решения о предоставлении земельного участка в частную собственность внести плату за выкуп земельного участка, возместить расходы по формированию и регистрации земельного участка, а также затраты на подготовку и проведение аукциона; в двухмесячный срок после принятия решения исполкома о передаче земельного участка в частную собственность осуществить государственную регистрацию права на земельный участок; получить в установленном порядке техническую документацию и разрешение на строительство жилого дома; в течение одного года со дня государственной регистрации возникновения права на земельный участок приступить к занятию земельного участка в соответствии с целью его предоставления.

6. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектом продажи.

7. Контактный телефон: **8 (02151) 28975.**

Селядзец з варанай бульбачкай, алеем і кружкамі цыбулі — страва, якая заўсёды знаходзіць водгук у сэрцы і страўніку нашага чалавека. І хоць гонар вынаходства спосабу прыгатавання салёнага селядца належыць галандскаму мараку Якабу Бейкельсу, гэты прадукт можна па праве назваць нашай традыцыйнай стравай. Селядзец — рыба танная, і таму далікатэсам не лічыцца. Мы прывыклі купляць яго імпульсіўна, і гэта добра, бо звычайны селядзец валодае мноствам несумнеўных вартасцяў. Пра вялікую карысць рыбінага тлушчу, а таксама і пра яго дрэнны смак, наўрад ці змогуць забыць гадаванцы дзіцячых садкоў часоў развітога сацыялізму. Селядзец — гэта менавіта тое, што трэба чалавеку, каб сумясціць карысныя ўласцівасці рыбінага тлушчу з задавальненнем ад трапезы. У гэтай рыбе ўтрымліваецца вялікая колькасць жыццёва неабходнай чалавеку тлустай кіслаты Амега 3. Акрамя таго, тлушч, які ўтрымліваецца ў селядцы, можа лічыцца натуральнай прафілактыкай дыябету другога тыпу. Селядзец — рэкардсмен па ўтрыманні вітаміну Д. У ім прысутнічае таксама і ёд, і селен, і фосфар. Уключаючы гэтую рыбу ў посны рацыён, вы ніколі не будзе пакутаваць ад недахопу вітамінаў і мінеральных рэчываў. Здольнасць селядца павялічваць колькасць «добрага халестэрыну» ў нашым арганізме робіць стравы з яго незаменнымі ў меню тых, хто пакутуе ад сардэчна-сасудзістых захворванняў. Наяўнасць антыаксідантаў ператварае звычайны селядзец у сродак захавання маладосці і прыгажосці. Лепш за ўсё купляць свежамарожаны селядзец і засольваць яго самім, кіруючыся ўласнымі смакавымі перавагамі. Сёння мы з вамі паспрабуем прыгатаваць з гэтага прывычнага прадукту што-небудзь незвычайнае.

Салата з селядца, радыскі і яблыка

Вазьміце: *філе 2-х слабасалёных селядцоў, 2 зялёныя яблыкі, 1 цыбуліну, 100 г маянэзу, 1 ч. лыжку парашку кары, лісце салаты, зяленіва.*

Парашок кары перамяшаць з маянэзам і даць настояцца. Філе селядца нарэзаць на кавалачкі. Яблыкі, не абіраючы, нарэзаць буйнымі кубікамі, цыбулю — дробнымі, радыску — тонкімі скрылікамі, нашаткаваць зяленіва. Усё змяшаць, пакласці на салатнае лісце, заправіць маянэзам з кары і пасыпаць зяленівам.

Яйкі, фаршыраваныя мусам з селядца

Нам спатрэбіцца: *200 г філе слабасалёнага селядца, 4 яйкі, 50 г сметанковага масла, 15 г гарчыцы, 1 ч. лыжка чырвонай ікры, зялёная цыбуля.*

Зварыць яйкі ўкрутую і разрэзаць уздоўж на палавінкі, жаўткі выняць. Філе селядца і тры жаўткі пракруціць у мясарубцы, затым працерці праз сіта. Дадаць размякчанае сметанковае масла, гарчыцу і ўзбіць. Атрыманай масай нафаршыраваць яйкі. Упрыгожыць чырвонай ікрой, пасыпаць цёртым жаўтком і дробна нарэзанай зялёнай цыбуляй.

Салата з селядца і буракоў з заправай з апельсінаў

Вазьміце: *1 слабасалёны селядзец, 2 буракі сярэдняга памеру, 1 апельсін, 1 цыбуліну, лісце салаты, 1 пучок кінзы, 1 ст. лыжку алею, 1 ч. лыжку цукру, 1/2 ч. лыжкі чорнага молатага перцу.*

Селядзец разабраць на філе і нарэзаць на кавалачкі. Буракі адварыць, не абіраючы, затым астудзіць і абабраць. Нарэзаць іх скрылікамі і акуратна перамяшаць з палавінай алею. З апельсіна выціснуць сок і выпарыць яго з цукрам, пакуль загусцее, астудзіць і змяшаць з астатнім алеем. На лісце салаты выкласці буракі, пасыпаць дробна нарэзанай кінзой, зверху выкласці кавалкі селядца. Паліць страву апельсінавай заправай і ўпрыгожыць кольцамі цыбулі.

Селядзец, запечаны з бульбай

Вазьміце: *600 г філе слабасалёнага селядца, 1 кг бульбы, 2 цыбуліны, 50 мл алею, 1 шклянку смятаны, 2 яйкі, 3 ст. лыжкі дробна нарэзанага кропу. Для соусу: 2 яйкі, 150 г сметанковага масла, 1 цыбуліна, 1/2 лімона, пучок кропу.*

Філе селядца вымачыць у сумесі малака і вады на працягу 10—12 гадзін і нарэзаць буйнымі кавалачкамі. Бульбу абабраць і нарэзаць тонкімі кружкамі. Цыбулю дробна нарэзаць і абсмажыць на алеі. Форму для запякання змазаць алеем, выкласці пластамі бульбу і селядзец, змазваючы кожны пласт узбітым яйкам, а зверху пасыпаць дробна нарэзанай цыбуляй і кропам. Апошні бульбяны пласт густа змазаць яйкам, заліць смятанай і запякаць у духоўцы на працягу 25—30 хвілін. Тым часам прыгатаваць соус: адварыць яйкі ўкрутую, буйна іх нарэзаць. Ачысціць і нарэзаць кубікамі цыбулю, крыху падагрэць яе ў растопленым сметанковым масле з дабаўленнем лімоннага соку, затым змяшаць з нарэзанымі яйкамі і кропам. Перад падачай на стол паліць запечаны селядзец соусам.

Эскабеш з нарвежскага селядца

Нам спатрэбіцца: *8 кавалачкаў філе свежамарожанага селядца, 4 ст. лыжкі пшанічнай мукі, 4 невялікія цыбуліны-шалот, 2 морквіны сярэдняга памеру, 1 зубок часнаку, 8 ст. лыжак аліўкавага алею (праўда, можна выкарыстаць і сланечнікавы), 2 ст. лыжкі віннага воцату, 4 ст. лыжкі вады, 1 ст. лыжка кінзы (па жаданні), 0,5 ч. лыжкі цэлых зярнят каляндры, 1/4 ч. лыжкі шафрану, 2 лаўровыя лісты, соль і молатыя чорны перац.*

Цыбулю-шалот, моркву і часнок ачысціць і нарэзаць тонкімі скрылікамі. Філе селядца пасаліць і паперчыць, абкачаць у муцэ з боку скуры і абсмажваць скуркай уніз на аліўкавым алеі на разагрэтай патэльні (прыкладна 1 хвіліну). Рыбу дастаць з патэльні, дадаць яшчэ алею і выкласці ў патэльню агародніну і спецыі. Патушыць да залацістага колеру (прыкладна 2 хвіліны). Дадаць астатні алей, воцат і ваду. Гарачай агароднінай сумессю заліць рыбу і даць астыць. Упрыгожыць кінзой.

Бліны з салатай з селядца

Блінчыкі гатуем звычайным спосабам.

Нам спатрэбіцца: *150 г філе слабасалёнага селядца, 30 г марынаваных агуркоў, 2 яйкі, 50 г маянэзу, палова маленькай цыбулінкі, 3 лустачкі белага хлеба, цыбуля-парэй (або цыбуля-рэпка), соль на смак.*

Філе селядца вымачыць у малацэ, нарэзаць дробнымі кубікамі. Марынаваныя агуркі, вараныя яйкі, цыбулю-рэпку дробна парэзаць. У атрыманую сумесь дадаць белы хлеб без скарынкі і заправіць маянэзам. Выкласці салату на край бліна і загарнуць у трубачку. Перад падачай на стол блін разрэзаць папалам і зверху пасыпаць кольцамі цыбулі-парэю.

Селядзец у піве

Закіпяціць цёмнае піва з лаўровым лістом і перцам гарошкам. Заліць ачышчаны селядзец астуджаным растворам, а зверху — алей.

АНЕКДОТ У ТЭМУ:

Прыходзіць мужык у краму, пытаецца: — Якая рыба ў вас ёсць? Прадавец: — Селядзец. — А яшчэ ёсць якая-небудзь? — Не. Разумееце, у сувязі з крызісам транспарту няма, бензіну няма... — А гэта скаціна што, на таксі дабралася, ці што?

«Еўрабачанне-2010»

Еўропа абрала «Спадарожніка»

У сёлетнім песенным конкурсе пастаўлена прадказальная кропка

Не здзіўляйцеся, калі немудрагелістая песенька «Satellite» будзе гучаць бліжэйшы год, што называецца, з усіх прасаў. Бо як бы ні круцілі носам крытыкі і эксперты, маўляў, чутны стыль «два прытопы—тры прыхлопы», аднак яшчэ да перамогі на «Еўрабачанні-2010» спявачка Лена Маер-Ландрут узарвала з дэбютным альбомам гэтага стылю ўсе музычныя чарты ў роднай Германіі. Пасля чаго, як мы і прадракалі, спрацаваў «сцэнарый Рыбака» — 19-гадовая артыстка, якая ніколі афіцыйна не навучалася акцёрскаму і вакальнаму майстэрству, ужо за некалькі месяцаў да конкурсу лічылася адной з галоўных фаварытак у букмекераў, яе кліп на YouTube праглядзелі мільёны інтэрнэт-карыстальнікаў (на сёння — больш як 13 млн праглядаў), яе рэпетыцыі ў Осла спраўна наведвалі практычна ўсе прысутныя журналісты і заўзятары, а непасрэдна пасля выступлення ў фінале менавіта яна сабрала больш за ўсіх найвышэйшых адзнак — 9. Леташні рэкорд Рыбака ў 387 балаў дзяўчыне паўтарыць не ўдалося, але і з выніковымі 246 яна ўпэўнена заняла першае месца, апярэдзіўшы бліжэйшых супернікаў — гурт з Турцыі «MaNga» — на 76 балаў.

Таксама ў дзясятку лепшых, паводле галасавання тэлегледачоў і журы ва ўсіх 39 краінах — удзельніцах конкурсу, трапілі Румынія (162 балы), Данія (149), Азербайджан (145), Бельгія (143), Арменія (141), Грэцыя (140), Грузія (136) і Украіна (108). Прадстаўніку Расіі Пятру Налічу не хапіла адносна нямнога, каб увайсці ў топ-10 — з 90 баламі ён на 11-м месцы (пры тым, што букмекеры абяцалі ў лепшым выпадку 22-е).

«ЛАВ» З НЯМЕЦКІМ АКЦЭНТАМ

«Я дагэтуль не веру, што гэта адбываецца са мной, — ледзьве ўтрымліваючы ў руках прызавы хрустальны мікрафон, шчыра прызналася журналістам Лена пасля паўторнага выканання сваёй пераможнай песні. — Дзякую усім, хто тэлефанаваў і галасаваў за Германію. Калі вакол мяне закрычалі: «Лена, ты пераможца!» — я ўсё яшчэ не разумела, што адбываецца, бо вельмі многа краін яшчэ не прагаласавалі... Але не буду хаваць, перамагчы на «Еўрабачанні» — гэта вельмі, вельмі прыемна. Не скажу, што гэта галоўная падзея ўсяго жыцця, але я буду атрымліваць асалоду ад яе столькі, колькі змагу». Для Германіі ж гэта перамога вельмі значная і надзвычай прыемная яшчэ і таму, што яна — усяго толькі другая па ліку за ўсю гісторыю ўдзелу краіны ў конкурсе. (Першы раз трыумф немцы святкавалі ажно ў 1982 годзе, калі перамагла спявачка Nicole з песняй «Ein bisschen Frieden»).

Дарэчы, пакуль невядома, дзе адбудзецца «Еўрабачанне-2011» — акрамя нямецкай сталіцы, сярод прэтэндэнтаў на званне гаспадара наступнага конкурсу Мюнхен, Гамбург, Кёльн і родны для Лены Маер-Ландрут Гановер... Зрэшты, ужо на гэтым тыдні мяркуецца агучыць папярэдняе рашэнне на гэты конт, а пакуль нямецкую дэлегацыю сустрэлі на радзіме фанаты харавым прыпевам з песні «Satellite»: «Love, Oh, Love, I gotta tell you how I feel about you» — «Каханне, о, каханне, я скажу табе, што адчуваю да цябе».

МУЗЫЧНАЯ МАТЭМАТЫКА: 3+2=24

Для беларусаў жа сёлетняе «Еўрабачанне» сенсацыйным не атрымалася — калі толькі не меркаваць, што хтосьці ўсур'ёз разлічваў на перамогу. У паўфінале гурт «3+2», нягледзячы на маладосць і не самы вялікі сцэнічны вопыт, справіўся з хваляваннем і ўпэўнена прайшоў у фінал — як і прагназавалася. Зводная шыльда галасавання сведчыць, што Беларусь у сваім паўфінале апынулася на 9-м месцы, набраўшы 59 балаў (такую ж колькасць балаў набрала Боснія і Герцагавіна, але больш высокіх ацэнак вывелі яе на 8-е месца). Каму падзякаваць за гэты вынік? Гледачам і журы з Расіі, якія далі беларусам 12 балаў, а таксама з Малдовы (8), Партугаліі (7), Грэцыі (6), Македоніі, Латвіі і Мальты (па 5), Эстоніі (4), Польшчы (3) і нават Францыі (1).

У фінале ж Арцём Міхаленка, Егіязар Фарашан, Алена і Нінель Карповічы і Юлія Шышко выканалі сваю песню «Butterflies» практычна бездакорна, аднак на высокае месца відавочна разлічваць не маглі — занадта многа было моцных канкурэнтаў. Вынік — 24-е месца. Букмекерскія канторы прагназавалі ўвогуле апошняе, 25-е. Можа, яно так бы і атрымалася. Але для іх, як, зрэшты, і для нас самі сталі поўнай нечаканасцю 12 балаў ад Грузіі. Усяго ж

Фота з афіцыйнага сайта www.eurovision.tv.

Беларусь «зарабіла» ў фінале 18 балаў — 1 ад Балгарыі, 2 ад Расіі, 3 ад Малдовы, 12 ад Грузіі. У сваю чаргу, наша краіна выказала сімпатыі Румыніі (1 бал), Ісландыі (2), Турцыі (3), Малдове (4), Арменіі (5), Азербайджану (6), Грузіі (7), Ізраілю (8), Украіне (10) і Расіі (12).

КРЫЛЦАМІ БЯК-БЯК-БЯК-БЯК

З аднаго боку, прыемна ўжо тое, што за сем гадоў удзелу ў конкурсе наша краіна двойчы ўваходзіла ў фінал. З іншага — як ні рабі добрую міну, але выніковае перадапошняе месца — гэта крыўдна. І на хвалі ўсеагульнай крыўды давялося ўбачыць на прасторах інтэрнэту не адзін дзясятак абураных меркаванняў кшталту «вось вам і славянскае братэрства, мы ім усё, а яны нам нічога!». Прабачце, шаноўныя, але галасаванне па геапалітычным прынцыпе даволі-такі надакучыла. Добрасуседскія абмены «ты — мне, я — табе» нагадваюць школьныя ацэнкі, пастаўленыя з жалю, калі ўвесь клас ведае, што «добра» ў тваім дзённіку з'явілася не таму, што адказ быў сапраўды добры, а таму, што мама ўламала настаўніка не псаваць выніковы табель... Таму радуе, што сёлета акрамя традыцыйнага суседскага абмену ласкамі, было і галасаванне за таго, хто найбольш сімпатычны. Па прыкладзе далёка хадзіць не трэба: краіна-пераможца конкурсу Германія не атрымала балаў толькі ад 4 краін з 38 (з улікам таго, што за сябе самога галасаваць нельга)! Усе астатнія так ці інакш выказалі сваю ўхвалу: хто — крыху нязграбнаму абаянню Лены, хто — лёгкай запамінальнай песеньцы, хто — па суме ўражанняў увогуле.

Так, беларусаў не ўзнялі на больш высокае месца ні касцюмы-трансформеры з крыльцамі, ні змена іміджу салістак, ні выверэваная алгебрай гармонія хіта ад расійскага прадзюсара Макса Фадзеева, які паспяшаўся ўжо адхрысціцца ад выніку «3+2», ні запрошаны са Швецыі музыкант і кампазітар Роберт Уэлс. З іншага боку, гэтаксама не дапамог Арменіі славуты музыкант Джыван Гаспаран і не ўратавала Азербайджан «зорная каманда»: харэограф Бейонсе, стыліст конкурсу «Топ-мадэль Амерыкі» ды рэжысёр Майкла Джэксана. Затое беларускія арганізатары ўгадалі сёлета той самы загадкавы фармат конкурсу — стаўка на песню, а не на шоу, проста выйсці і праспяваць... Можа, уся сутнасць у тым, што зноў атрымалася не зусім проста, і акцэнты зноў змясціліся ў вонкавую частку не на карысць унутранай — сэнсу, або, як модна казаць, «месэджу» песні? Можа, дарэмна пакрыўдзілі беларускіх аўтараў і даверыліся Фадзееву, які цяпер сцвярджае, што яго падманулі? Ці, як заўжды, настроіўшыся на «Еўрабачанне» як на Алімпіяду, мы чакалі занадта многага ад артыстаў і пакрыўдзіліся, хутчэй, не за іх, а за ўласныя няспраўджаныя чаканні? Значыць, трэба вучыцца на памылках — сваіх і чужых, і настройвацца аптымістычна — як на наступнае «Еўрабачанне-2011», так і на дзіцячае «Еўрабачанне-2010», што адбудзецца ўжо ў лістападзе гэтага года ў Мінску.

ШТО ЗА ШОУ БЕЗ СКАНДАЛУ

Безумоўным дасягненнем беларускіх удзельнікаў сёлета, мяркую, трэба лічыць захаванне спакойнай, добразычлівай атмасферы і стасункаў з прэсай цягам усяго конкурсу. Не было ні дэманстратыўнага выплеску крыўды, як у 2005-м, ні скандальных прызнанняў і высвятлення адносінаў, як летась... Праўда, пастфактум разгараецца скандал з Максам Фадзеевым, які абвінавачвае беларускі бок у падмане і «падробцы» песні — але тут трэба яшчэ разабрацца больш падрабязна.

Яшчэ адзін са скандалаў гэтага «Еўрабачання» — недарэчны жарт наконт сэксуальнай арыентацыі леташняга пераможцы Аляксандра Рыбака. Міф аб тым, што такое прызнанне як быццам зрабіў сам спявак у сваім афіцыйным блогу, з лёгкай рукі рускамоўных журналістаў за пару дзён распаўсюдзіўся ў прэсе і стаў, бадай, самай гучнай «вуткай» сёлетняга конкурсу. Стомлены нездаровай увагай як прэсы, так і фанатаў, перад якімі менеджмент спевака вымушаны быў апраўдвацца, Аляксандр з відавочнай палёгкай перадаваў галоўны прыз — а разам з тым і немінучую хвалю самых неверагодных чутак — сёлетняй пераможцы «Еўрабачання» Лене Маер-Ландрут.

Другі скандал адбыўся непасрэдна ў фінале конкурсу і зачапіў канкурсанта з Іспаніі Даніэля Дзігеса. Падчас выступлення іспанскага артыста, нягледзячы на ўзмоцненую ахову комплексу «Тэленор Арэна», на сцэну здолеў прабрацца і «паўдзельнічаць у нумары» адзін з фанатаў. У сувязі з гэтым выканаўчы прадзюсар «Еўрабачання» Свантэ Стакселіус даў Іспаніі права выступіць паўторна. У выніку канкурсант заняў 15-е месца. Што ж да парушальніка, то пазней высветлілася, што гэта Джымі Джамп, каталонскі стрыкер (стрыкеры — прафесійныя правакатары, якія звычайна выбягаюць галяком на спартыўных спаборніцтвах і прыцягваюць да сябе ўвагу). На рахунку Джампа — пранікненне на поле падчас фіналу чэмпіянату Еўропы па футболе ў 2004 годзе і паўфіналу ў 2008-м, а таксама падчас шэрагу матчаў Лігі Чэмпіёнаў, фіналу Фрэнч Опен па тэнісе 2009 года і г.д. За цяперашнюю выхадку каталонца чакае, у лепшым выпадку, грашовы штраф, а арганізатараў «Еўрабачання-2011» — галаўны боль у сэнсе максімальна прадуманай сістэмы бяспекі.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	4.45	21.30	16.45
Віцебск —	4.27	21.28	17.01
Магілёў —	4.35	21.20	16.45
Гомель —	4.40	21.08	16.28
Гродна —	5.02	21.44	16.42
Брэст —	5.11	21.36	16.25

Месяц

Поўня 28 мая.
Месяц у сузор'і Вадалея.

Імяніны

Пр. *Дзмітрыя, Івана, Ігната, Карнілы, Мітрафана, Сяргея.*

К. *Магдалены, Кандрата, Якуба.*

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

Дзве даты

1 чэрвеня

1840 год — 170 гадоў з часу стварэння Тэатра Дуніна-Марцінкевіча. Гэта быў першы беларускі нацыянальны тэатр сучаснага тыпу, які аб'яднаў усе віды сцэнічнага мастацтва — драматычны, музычны, вакальны і танцавальны. Быў цэнтрам дэмакратычнай культуры, перайманай традыцыі народнага сцэнічнага мастацтва. У трупу тэатра ўваходзілі сам пісьменнік Вікенцій Іванавіч, члены яго сям'і, суседзі, знаёмыя, удзельнічалі таксама вучні яго школы і сяляне. Пастаноўкі прымяркоўвалі да свят і ўрачыстых дзён. Адмыслова для гэтага драматург пісаў новыя камедыі. У тэатры былі пастаўлены спектаклі «Рэкруцкі набор» і «Ідылія». Дзень пастаноўкі оперы «Ідылія» ўпісаны залатымі літарамі ў гісторыю беларускага тэатра, усёй беларускай нацыянальнай культуры. Тэатр Дуніна-Марцінкевіча садзейнічаў станаўленню і развіццю прафесійнага тэатральнага мастацтва ў Беларусі.

1845 год — зафіксаваны пералёт паштовага голуба на 11 000 кіламетраў (з Намібіі ў Англію) за 55 дзён.

Цытата дня:

«Любіць чытанне — гэта значыць абменьваць гадзіны суму і адзіноты, якія непазбежна бываюць у жыцці, на гадзіны найвялікшай асалоды».
Шарль Луі Мантэск'ё (1689—1755), французскі мысліцель.

Віншуем **БОГАН Ірыну Міхайлаўну** з в. Семенчыцы Стаўбцоўскага раёна **з 65-годдзем**. Жадаем здароўя, шчасця.

Пусть морщинки Вас
не старят и не трогает беда,
Пусть природа Вам подарит
жизни долгие года.

Сям'я МІШУКОЎ, *з в. Літва.*

«ЗАКАСІЎ» ПАД БРАТА

Беспрацоўны з в. Беражное (Столінскі раён) на прапускным пункце «Верхні Церабежаў» вырашыў незаконна перайсці мяжу Беларусі. Малады чалавек не хаваўся ад памежнікаў, а прад'явіў ім пашпарт брата, які на тры гады старэйшы за яго. Парушальніка затрымалі і завялі крымінальную справу.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

СКАНВОРД + СУДОКУ

Склаў Яўген ЛЯХАЎ.



3		8		9		7		
	7				4			
9	5				2			
8			7		5		3	2
4								7
7	3		2		8			6
			4				6	9
			9				5	
		9		5		8		4

СУДОКУ. У квадраце 9×9 клетак размясціце лічбы ад 1 да 9 уключна такім чынам, каб у кожным радку, кожным слупку, у блоках 3×3 клетак, абмежаваных тлустай лініяй, кожная лічба сустракалася толькі адзін раз, без паўтораў.

КАША

Каша як галоўная святочная страва ў абрадавай практыцы беларусаў выкарыстоўвалася неаднаразова. З-за таго, што для яе прыгатавання патрабавалася ўзяць вялікую колькасць зярнят, яна стала сімвалізаваць урадлівасць, сямейны дабрабыт, гаспадарчы дастатак. Да здольнасці кашы павялічвацца ў сваіх памерах — «расці» — была дапасавана сімволіка росту (прыросту) і багацця. Тым самым было абгрунтавана выкарыстанне кашы ў вясельных абрадах, падчас нараджэння і хрышчэння дзіцяці, а таксама ў кантэксце калядных святкаванняў (у момант пераходу з аднаго года ў наступны), у жывёлагадоўчых абрадах, звязаных перш за ўсё з ацёлам, а таксама ў рытуалах, якія выконваліся пры пабудове хаты. Пры ўсім тым каша стала яшчэ і сакральнай стравай для душаў памерлых продкаў, дамавіка, вадзяніка і інш.

- Кашу варылі і для таго, каб у вялікія святы адарыць ёю юродзівых і жабракоў. Такую кашу называлі «абетнай». Гатавалася яна звычайна ў складчыну ўсёй вёскай. Кожны з вяскоўцаў, збіраючыся «ў застолле», нёс крупу і іншыя прадукты, неабходныя для святочнага стала.
- У абрадавай практыцы сялянскай абшчыны каша займала адно з важных месцаў, яна надзялялася статусам галоўнага атрыбута, вызначала змест абраду ці свята.
- З улікам таго, што некалі каша гатавалася з цэлага зерня злакавых культур (пшаніцы, ячменю, проса і грачыхі, але практычна ніколі не выкарыстоўвалася зерне жыта), даволі рэдка — з мукі, можна выказаць меркаванне, што ў гэтым выпадку працаваў «раслінны код» традыцыйнай культуры беларусаў. Прыродна-раслінная метамарфоза **зерне — мука — каша (хлеб)**, гэтаксама як і **яйка — курыца — яйка**, аб'ядноўвала паміж сабой два полюсы радаводнага дрэва: карані і крону.
- Разам з тым, **выпяканне каравая** (для прыгатавання якога выбіралася мука толькі вышэйшага гатунку) **было сімвалам перанараджэння, пераўвасаблення, пераходу ў новы сацыяльны статус**. Каравай — сімвал захавання традыцыі, сувязі паміж трыма пакаленнямі роду, якая зарыентавана ў будучыню. Пераціранне зерня паміж камянямі жорнаў — гэта не што іншае, як ініцыяцыя (перанараджэнне), праходжанне выпрабаванняў жыцця.
- Такім чынам, **прыгатаванне і выкарыстанне рытуальнай кашы сімвалізавала аднаўленне зваротнай духоўнай сувязі — ад жывых да сваіх продкаў**, а ў некаторых выпадках і да першапродкаў. **Захаванне зерня непарушным**, цэлым — не што іншае, як **пераемнасць традыцыі**, згуртаванасць паміж пакаленнямі, **далучанасць да жыватворнай крыніцы родавай памяці**.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Усміхнемся!

Самая блюзнерская праграма на ТБ — гэта «Што? Дзе? Калі?»: сядзяць шасцёра разумных, інтэлектуальна развітых, адукаваных мужыкоў у дарагіх касцюмах і спрабуюць адціснуць шэсць тысяч рублёў у пенсіянера з Уфы.

☺

— Люблю сваю бабулю! Для яе я заўсёды худая!

☺

Першае правіла сацыёлага — ніколі не рабіць апытанне грамадскай думкі ў панядзелак раніцай.

☺

На ўроку хіміі:
— Што адбудзецца з золатам, калі яго пакінуць на адкрытым паветры?
— Сапруць, напэўна сапруць!

Самы пушысты хвост і лепшы апетыт

Шыншылы і трусы, дэкаратыўныя крысы і мышы, хамякі і марскія свінкі... У Мінску прайшла ўнікальная выстава маленькіх хатніх любімцаў «Вясеннія слядочкі». Наведвальнікі выставы з задавальненнем знаёміліся і фатаграфаваліся з маленькімі жывёламі, выбіралі самы незвычайна афармлены дамок і, безумоўна, атрымлівалі зарад добрага настрою. А гаспадары грызуноў змаглі не толькі атрымаць парады і ацэнку сваіх гадаванцаў, але і паўдзельнічаць у цікавых конкурсах, пазнаёміцца з прапановамі заатавараў на беларускім рынку.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значкам, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год. Тыраж 33.310. Індэкс 63850. Зак. № 2616. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12